Сьцяпан Некрашэвіч | Мікола Байкоў

Расійска-беларускі слоўнік

Сьцяпан Некрашэвіч | Мікола Байкоў

Расійска-беларускі слоўнік

Сьцяпан Некрашэвіч | Мікола Байкоў

Расійска-беларускі слоўнік

Смаленск
Інбелкульт
2014

УДК 81'374,822(038)=161.1=161.3
ББК 81.2 (4Беи)
Н 48

Друкуецца паводле:
Расійска-беларускі слоўнік / Укладальнікі: М. Байкоў, С. Некрашэвіч. — Менск: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1928.

Некрашэвіч, С.

Н 48 Расійска-беларускі слоўнік / Сцяпан Некрашэвіч, Мікола Байкоў; рэд. В. Булгакаў; прадм. С. Запрудскага. — 3-е выданне, папраўленае. — Смаленск: Інбелкульт, 2014. — 704 с.

ISBN 978-5-00076-013-0

Дадзеная кніга ўяўляе зь сябе перавыданьне найлепшага і найпаўнейшага расійска-беларускага слоўніка міжваеннага часу, першае выданьне якога зьявілася ў 1928 годзе. Слоўнік уключае больш за 60 тысяч слоў і быў створаны паводле выбаркі лексікі са «Словаря белорусского наречия» І. Насовіча, «Смоленского областного словаря» У. Дабравольскага, «Беларуска-польска-рускага слоўніка» Я. Ціхінскага, «Віцебскага краёвага слоўніка», «Практычнага вайскавага слоўніка», рукапісных слоўнікаў П. Шпілеўскага і С. Мядзьведзкага, а таксама з выбраных літаратурных твораў і народнай мовы. Аўтары імкнуліся ўхіляцца ад штучных наватвораў: перавагу аддавалі словам, якія існуюць у народнай і літаратурнай мове.

УДК 81'374,822(038)=161.1=161.3
ББК 81.2 (4Беи)

У афармленьні першай старонкі вокладкі выкарыстаны малюнак-ілюстрацыя Язэпа Драздовіча, зроблены для аздабленьня беларускага школьнага лемантара Макара Краўцова. Аловак. 1920 год. Выява атрыманая дзякуючы спрыяньню гісторыка Уладзімера Ляхоўскага.

ISBN 978-5-00076-013-0

© ТАА «Інбелкульт», 2014
© Запрудскі С., прадм., 2014

Зьмест

Прадмова Сяргея Запрудзкага 6
Ад карэктара 7
Ад аўтараў 7
Сьпіс скарачэньняў у расійскім тэксьце 10
Сьпіс скарачэньняў у беларускім тэксьце 11

А 12
Б 21
В 43
Г 88
Д 102
Е 126
Ж 129
З 135
И 170
Й 189
К 190
Л 223
М 236
Н 257
О 307
П 365
Р 507
С 544
Т 613
У 633
Ф 659
Х 665
Ц 673
Ч 677
Ш 686
Щ 694
Э 696
Ю 700
Я 701

Прадмова

У XX стагоддзі беларуская лексікаграфія развівалася складаным, пакручастым чынам. Несумненна, усе перакладныя, з удзелам беларускай мовы, слоўнікі былі накіраваны на тое, каб як мага лепш паказаць лексічныя рэсурсы беларускай мовы (выключэнне складае хіба руска-беларускі слоўнік 1937 года пад рэдакцыяй Андрэя Александровіча). Напэўна, усе беларускія перакладныя слоўнікі тым ці іншым спосабам падобныя міжсобку, бо апісваюць адзін і той жа аб'ект — беларускую мову. Відавочна, і метады прадстаўлення лексікі ў слоўніках у значнай ступені аднолькавыя, што дазваляе канстатаваць пэўную бесперапыннасць лексікаграфічнага працэсу на працягу XX стагоддзя — ад сямімоўнага ляйпцыгскага слоўніка 1918 года да апошніх акадэмічных выданняў руска-беларускіх і беларуска-рускіх слоўнікаў.

І тым не менш усе слоўнікі мінулага стагоддзя маюць выразныя прыкметы часу, у якім яны былі створаны, а таксама нясуць на сабе адбітак людзей, асобаў, якія займаліся лексікаграфічнай практыкай. Не складае тут выключэння і «Расійска-беларускі слоўнік» Сцяпана Некрашэвіча і Міколы Байкова, надрукаваны ў Мінску ў 1928 годзе (а падрыхтаваны ў значнай меры яшчэ ў першай палове 1920-х гадоў). Капрызная дама, муза Кліо, распарадзілася так, што падрыхтаваны з пэўнай доляй паспешлівасці слоўнік не толькі знайшоў сваё пачэснае месца ў гісторыі беларускай лінгвістыкі, але і выклікае жывую цікавасць праз 80 гадоў пасля яго выдання — настолькі, што ўзнікла патрэба ў яго перавыданні сёння. Што ж спрыяла такому лёсу гэтай лексікаграфічнай працы?

Слоўнік быў створаны двума кваліфікаванымі чалавекамі — «спрадвечным» носьбітам беларускай мовы, выпускніком Віленскага настаўніцкага інстытута Сцяпанам Некрашэвічам і выпускніком Маскоўскай духоўнай акадэміі, «новым беларускамоўным» Міколам Байковым (народжаны ў Цвярской губерні, Байкоў трапіў у Беларусь на 24-м годзе жыцця) — у час, калі попыт на лексікаграфічную прадукцыю быў вельмі вялікі. Ключавое слова другой паловы 1920-х гадоў — «беларусізацыя» — неадменна патрабавала руска- (расійска-) беларускіх слоўнікаў, якімі магла б карыстацца шырокая публіка пры складанні справаводчых папер, у працэсе выкладання, пры напісанні навуковых прац, журналісцкіх і мастацкіх твораў, у вытворчым працэсе. Увогуле, акурат на працягу 1920-х гадоў кола спажыўцоў беларускай літаратурнай мовы выйшла па-за рамкі даволі вузкага слою культурніцкіх дзеячоў і чытачоў газеты «Наша ніва». Літаратурная мова ў гэты час стала здабыткам шырокіх народных масаў, стала актыўна «ўбіраць» у сябе людзей, якія раней да яе мелі хутчэй вельмі ўскоснае дачыненне (або і не мелі ніякага), адначасова літаратурная мова радыкальна пашырыла свой лексічны склад. Увогуле, толькі к канцу 1920-х гадоў стала ўзнікаць разуменне, што можна не проста гаварыць на беларускай мове, але і гаварыць «правільна», «нарматыўна», з выкарыстаннем яе багацця і з захаваннем пэўных нормаў, якія паступова пачыналі рабіцца агульнапрынятымі. І ў гэтым сэнсе слоўнік, падрыхтаваны з апорай на створаную з пачатку 1920-х гадоў у Інбелкульце картатэку, аказаўся своечасовым і запатрабаваным — у ім непазбежна былі ўлічаны ўсе вымогі свайго часу адносна патрэбаў як тагачасных карыстальнікаў беларускай мовай, так і самой беларускай мовы. Асаблівую каштоўнасць слоўніку надае тая акалічнасць, што ў падборы эквівалентаў да расійскіх слоў аўтары не імкнуліся даваць толькі «адназначныя», строгія, «кананічныя» адпаведнікі, але і шырока прадстаўлялі сінанімічны і стылістычны спектр. З аднаго боку, такі падыход стварaў пэўныя праблемы (асабліва для людзей, якія кепска ведалі беларускую мову), калі ўзнікала патрэба выбіраць з шэрагу адпаведнікаў адзін; з другога, такая практыка была абумоўлена станам тагачаснай лексікаграфіі, фіксаванне «нарматыўнасці» таго або іншага слова для якой было важным, але не адзіным момантам. У гэты час яшчэ пільнай заставалася праблема агляду наяўных лексічных рэсурсаў беларускай мовы, выяўленне іх багацця — і слоўнік С. Некрашэвіча і М. Байкова ў поўнай меры задавальняў гэту вымогу.

Перавыданне дадзенага слоўніка ў XXI стагоддзі мае сэнс таму, што пытанне лексічнай размаітасці (і магчымасці выбару новых «старых» сродкаў) беларускай мовы пакуль яшчэ недастаткова асэнсавана — калі не ў беларускай лінгвістыцы, то ў асяроддзі найбольш актыўных карыстальнікаў беларускай мовы напэўна. Дыскусіі пра тое, якое слова найлепш ужыць для абазначэння той або іншай рэаліі, таго або іншага панятку, не спыняюцца — і слоўнік, у якім акумуляваны вельмі значныя і ў ладнай меры малавядомыя лексічныя рэсурсы беларускай мовы, можа стаць добрай дапамогай у высвятленні многіх спрэчных пытанняў.

Сяргей Запрудскі

Ад карэктара

Пры падрыхтоўцы слоўніка былі вытрыманыя наступныя прынцыпы.

Правапіс словаў уваходнай (расійскай) часткі прыведзены ў адпаведнасьць з сучаснымі нормамі расійскай мовы. У асноўны корпус слоўніка ў гэтым выданьні ўлучаныя слоўнікавыя артыкулы з «Дадаткаў» арыгіналу.

У беларускай частцы захаваны правапіс арыгінальнага выданьня. Да сучасных правапісных нормаў беларускай мовы прыведзена напісаньне часьціцаў, прыметнікаў і прыслоўяў разам, асобна ці праз злучок (напрыклад: *да спадобы, дзе-б, папанску, што-год, за паніброта, ваеннапалявы* — у арыгінале і *даспадобы, дзе б, па-панску, штогод, запаніброта, ваенна-палявы* ў гэтым выданьні); апроч таго, былі выпраўленыя яўныя памылкі друку. Канструкцыі *падобны на / падобны да* былі ўніфікаваныя да *падобны да*. Варыянты словаў, у адрозьненьне ад першага выданьня, падаваліся ў дужках цалкам (напрыклад: *стара́(э)ннасьць — стара́ннасьць* (*старэннасьць*)). Пры адрозным напісаньні аднолькавых словаў у арыгінале гэтае выданьне падае такія выпадкі як варыятыўныя (напрыклад: *дмухаць* (*дзьмухаць*)). Некаторыя граматычныя формы выпраўленыя ў адпаведнасьці з нормамі беларускае мовы (напрыклад: *божжа — божая, каменьні — каменьне*). Захаваны спосаб падачы дзеясловаў трывальнымі парамі, дзе першым стаіць дзеяслоў незакончанага трываньня (напрыклад: *замещать / заместить — замяшча́ць / замясці́ць*; *заступа́ць / заступі́ць*). У арыгінальным выданьні націскны *і* пазначаўся з дапамогаю курсіўнага шрыфту, у цяперашнім ужыты знак націску. Расстаўленыя націскі ў выпадку іх адсутнасьці ў першым выданьні, калі яны зьяўляюцца няспрэчнымі ці ўзнаўляльнымі з матар'ялу слоўніка, пры гэтым адлюстроўвалася акцэнталягічная дублетнасьць арыгіналу. Заўсёды націскным зьяўляецца *ё*. Націскнымі ёсьць *о, э*, графічна націск адлюстроўваецца толькі ў выпадках іх спалучэньня ў лексэме (напрыклад: *ко́дэкс*). У складаных словах як правіла падаецца толькі асноўны націск (напрыклад: *доўгатэрмі́новы*).

У часе падрыхтоўкі ўлічваўся складзены аўтарамі сьпіс «Папраўак і памылак».

Марына Салавей

Ад аўтараў

Хуткі поступ беларускага культурнага жыцьця яшчэ ў пачатку 1922 г. высунуў пытаньне аб складаньні больш-менш поўнага расійска-беларускага слоўніка, які зьяўляўся патрэбным, асабліва ў сувязі з беларусізацыяй, для самых шырокіх колаў беларускага грамадзтва. Заснаваны ў тым жа годзе Інстытут Беларускай Культуры абмеркаваў гэтае пытаньне і даручыў складаньне расійска-беларускага слоўніка С. М. Некрашэвічу і М. Я. Байкову, вызначыўшы разьмер слоўніка прыблізна каля 30 000 расійскіх слоў. Аднак у працэсе працы выявілася, што паказаным разьмерам слоўніка абмежавацца ня можна, — і пры заканчэньні працы вызначаны раней лік слоў павялічыўся больш, чымся ў два разы (звыш 60 000 расійскіх слоў).

Закончаны апрацаваньнем у 1925 г. слоўнік у кастрычніку таго ж году быў пераданы для друку Дзяржаўнаму Выдавецтву, але з прычын тэхнічнага характару, галоўным чынам з-за адсутнасьці патрэбнай колькасьці шрыфтоў, друк слоўніка расьцягнуўся больш, чым на 2 гады, і быў скончаны, незалежна ад волі аўтараў, толькі ў пачатку 1928 г.

У аснову слоўніка быў паложаны слоўны матар'ял, запісаны на карткі паводле выбаркі слоў аўтарамі з слоўнікаў беларускай мовы Ів. Насовіча («Словарь белорусского наречия»), Ул. Дабравольскага («Смоленский областной словарь») і Яз. Ціхінскага («Беларуска-польска-рускі слоўнік»), а таксама запісы слоў беспасярэдна з народнай мовы, зробленыя пераважна ў Бабруйшчыне. На падставе гэтых матар'ялаў з дадаткам слоў, выбраных з літаратурных твораў (Я. Купала, Я. Колас, Ц. Гартны) і з народнай мовы (А. Сержпутоўскі, П. Шэйн, М. Federowski і інш.), а таксама выпускаў Беларускай навуковай тэрміналёгіі (выданьне Інстытуту Беларускай Культуры), слоўнік быў укладзены ў аб'ёме, прыстасаваным да падрабязных слоўнікаў расійскай мовы, — Паўлоўскага «Русско-немецкий словарь»[1]

[1] Поўнае бібліяграфічнае апісаньне крыніцы: Павловский И. Я. Полный русско-немецкий словарь. Ч. 1— 2. Рига, 1859. — *Рэд.*

і Макарава «Русско-французский словарь»[2] у іх апошніх выданьнях. Пры рэдагаваньні рабіліся прыраўнаньні да слоўнікаў: В. Ластоўскі «Руска-крыўскі слоўнік» (Коўна, 1924 г.)[3], часткова — Ул. Даля «Словарь живого великорусского языка», М. Уманца і А. Спілкі «Словарь росийсько-український» (Львоў, 1893 г.)[4], Дуброўскага «Полный словарь русского и польского языка»[5] і Ф. Міклошыча «Краткий словарь шести славянских языков»[6].

Аднак ня ўсе беларускія словы, што знаходзіліся ў пэўных крыніцах, былі выкарыстаны пры перакладзе адпаведных расійскіх слоў. Так, напрыклад, з літаратурнай тэрміналёгіі (II вып. Беларускай навуковай тэрміналёгіі) не ўвайшлі ў слоўнік пераклады, якія там маюцца: «коллективизм — супольнасьць», «комплектование — упоўналічваньне», «плагиат — творакрадзтва» і інш. Наагул аўтары імкнуліся ўхіляцца штучных новатвораў (нэалягізмаў) і давалі перавагу словам, што ўжо існуюць у народнай і літаратурнай мове.

Аўтары таксама лічылі лішнім даваць і вузкаспэцыяльныя навуковыя тэрміны, якія маюцца ў выпусках Беларускай навуковай тэрміналёгіі.

Што датыча перакладу расійскіх слоў на беларускую мову, то аўтары па магчымасьці імкнуліся даваць пераклады расійскіх слоў у розных іх значэньнях, аддзяляючы адно значэньне ад другога (у беларускай калёнцы) або цыфрамі (1, 2, 3...), або кропкай з коскай (за выключэньнем дзеясловаў).

Адпаведныя да расійскіх слоў беларускія пераклады звычайна даюцца не адным беларускім словам, а некалькімі, з якіх першыя словы беларускай калёнкі, бліжэйшыя да расійскага слова, зьяўляюцца больш асноўнымі і больш пашыранымі ў літаратурнай мове, а далейшыя ад яго — сынонімамі і правінцыялізмамі — словамі, менш пашыранымі ў літаратурнай мове.

Дзеля практычнага значэньня слоўніка зьвернута ўвага і на пераклад расійскай фразэалёгіі, хаця і ў абмежаваным ліку з прычыны нераспрацаванасьці беларускай фразэалёгіі. Само сабой зразумела, што дадзеныя прыклады беларускай фразэалёгіі для перакладу пэўных расійскіх зваротаў не зьяўляюцца выключнымі: тут, бязумоўна, магчымы і іншыя беларускія звароты.

Абмежаваны памер слоўніка вымусіў аўтараў адмовіцца ад ілюстрацыі беларускіх слоў прыкладамі, што зьяўлялася б вельмі пажаданым, але што разам з тым значна павялічыла б слоўнік, які і без таго перавысіў вызначаны для яго памер (30 друк. аркушаў — запатрабаваньне Дзяржаўнага Выдавецтва).

Беларускія словы ў слоўніку надрукаваны з націскам, за выняткам толькі літар «о» і «э», якія ў беларускай мове зьяўляюцца толькі пад націскам (за выключэньнем складаных і чужаземных слоў). З тае прычыны, што ў друкарні не знайшлося «і» з націскам, для адзначэньня націску на гэтай літары ўжыты курсыўны шрыфт (*і*).

Правапіс слоўніка звычайны, прыняты ў беларускай літаратурнай мове, паводле прынцыпаў правапісу Тарашкевіча. Адхіленьнем ад правапісу Тарашкевіча зьяўляецца толькі правапіс ненаціскнога «о» ў чужаземных словах, якое ўсюды перадаецца праз «а». Аўтары ўвялі гэтае правіла, па-першае, дзеля яго прастаты, а значыць, каб і ўхіліцца ад лішніх памылак, якія б, калі прытрымліваца правапісу Тарашкевіча, няўхільна зьявіліся б у такой працы, як слоўнік, дзе даецца правапіс цэлых тысяч чужаземных слоў; а па-другое, грунтуючыся на практыцы гэтага правапісу ў замежных беларускіх выданьнях і некаторых нашых (газ. «Савецкая Беларусь» і інш.).

Гэтаму ж правілу падпарадкавана і злучэньне «лё» (lo) у чужаземных словах (*філязофія, аналягічны*) і злучэньне «іо» (*бібліятэка, фізыяномія*).

Чужаземнае «е» ўсюды перадаецца праз «э». Толькі ў злучэньнях «ge», «ke», «che» ў адпаведнасьці да такіх абеларушаных слоў, як *кепска, цукер, гестка, цынгель, шахер-махер*, чужаземнае «е» перадаецца праз беларускае «е»; злучэньне «he» перадаецца праз «гэ» (*гэрб*).

Адносна чужаземнага «е» яшчэ зроблена адхіленьне ў канчатках пасьля «н», дзе чужаземнае «е», адпаведна да такіх абеларушаных слоў, як *каўнер, жаўнер, інжынер, блюзьнер*, перадаецца праз «е»: *піянер*.

---

[2] Поўнае бібліяграфічнае апісаньне крыніцы: Макаров Н. П. Полный Русско-французский словарь. Петербург: Типография Тренке и Фюсне, 1889 г. — 508 с. — *Рэд.*

[3] Поўнае бібліяграфічнае апісаньне крыніцы: Ластоўскі В. Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік. Коўна: Друкарня А. Бака, 1924. — *Рэд.*

[4] Поўнае бібліяграфічнае апісаньне крыніцы: Уманець М., Спілка А. Словарь росийсько-український. 4 томи. Львів: НТШ, 1893-1898. — *Рэд.*

[5] Поўнае бібліяграфічнае апісаньне крыніцы: Дубровский П. П. Полный словарь польского и русского языка. В 2 частях. Польско-русская часть. Варшава, 1876 — 1878. — *Рэд.*

[6] Поўнае бібліяграфічнае апісаньне крыніцы: Краткий словарь шести славянских языков (русского с церковнославянским, болгарского, сербского, чешского и польского), а также французский и немецкий. Под редакцией проф. Ф. Миклошича. СПб.,М., Вена, 1885. — *Рэд.*

Французкі суфікс «eur», што ў расійскім правапісе пішацца праз «ёр», у нашым слоўніку, падобна да прынятага ў літаратурным вымаўленьні такіх слоў, як *рэжысэр*, *нэсэсэр*, перадаецца праз «эр».

Ад правапісу Тарашкевіча таксама зроблена адхіленьне ў беларускіх словах: *запэўня́ць*, *упэўня́ць*, *запэўне́ньне*, якія пішуцца бяз аканьня, бо ў праціўным выпадку зьмяніўся б сэнс слова.

Гаворачы аб правапісе слоўніка, трэба яшчэ сказаць аб падвойных формах слоў, якія ўжываюцца ў літаратурнай мове. Аўтары такія формы лічылі патрэбным азначаць; напрыклад, *пані* і *паня*. У мэтах эканоміі месца звычайна другая з падвойных форм паказваецца ў дужках; напрыклад, *стара́(э)нны*, *упро(а́)шваць* і г. д. Азначэньне гэтых паралельных форм, аўтары лічаць, будзе вельмі карысным і для правапіснай камісіі, якая будзе ўкладаць правапісны слоўнік беларускай мовы. Самі ж аўтары ня браліся ўзаконьваць адну з дзьвюх паралельных форм у беларускай мове, бо апошняя мэта, як і пытаньне беларускага правапісу, не ўваходзіла ў іх заданьні.

Прыходзіцца яшчэ сказаць аб памылках, якіх ці мала трапіла ў слоўнік, асабліва ў першую яго частку. Тлумачацца яны прычынамі як тэхнічнага характару (друкарня давала аўтарам толькі дзьве карэктуры; навіна справы для друкарні і неспрактыкаванасьць наборнікаў), а таксама і тым, што падчас друку першай часткі слоўніка адзін з аўтараў знаходзіўся ў доўгатэрміновай адлучцы.

Зразумела, што ў слоўніку знойдуцца і няўхільныя недакладнасьці ў перакладзе паасобных расійскіх слоў і зваротаў, знойдуцца і спрэчныя пераклады, і простыя памылкі, і пропускі патрэбных расійскіх слоў і трапных беларускіх слоў з жывой мовы, якія часткова тлумачацца пахібай аўтараў, а часткова і тым станам беларускай літаратурнай мовы, у якім яна знаходзілася пяць год назад, калі складаўся слоўнік. Падобныя словы, як *вылучэнец*, *абежнік*, *адносьнік*, тады не існавалі. А колькі трапных слоў стварыла за гэты час жыцьцё! Аднак галоўнай перашкодай для аўтараў слоўніка была адсутнасьць папярэдняй працы выбаркі слоў з літаратурнай мовы. Бязумоўна, што цяпер, калі Слоўнікавай камісіяй Інбелкульту арганізаваны шырокі збор слоў з народнай мовы і зроблена выбарка слоў бадай з усіх крыніц літаратурнай мовы (да 1 студзеня 1928 году сабрана звыш 360 000 картак), можна было б скласьці больш дасканалы слоўнік. Але тады, калі аўтары апрацоўвалі свой слоўнік, яны толькі мелі з надрукаванага слоўнага матар'яла слоўнік Насовіча, Дабравольскага ды невялічкі слоўнік Гарэцкага.

Заўважаныя хібы слоўніка часткова выпраўлены ў «Дадатках» і «Папраўках», але больш даклад на могуць быць выпраўлены толькі ў наступным выданьні слоўніка.

Усіх асоб, якія могуць зрабіць выпраўленьні слоўніка, аўтары, зараней выказваючы ім сваю шчырую падзяку, просяць дасылаць свае заўвагі на адрас Камісіі для ўкладаньня слоўніка жывой беларускай мовы Інстытуту Беларускай Культуры.

Усім асобам, якія дапамагалі пры ўкладаньні слоўніка, а асабліва Ўл. В. Чаржынскаму, які прачытаў слоўнік у рукапісе на літары А—О, і Бр. І. Эпімаху-Шыпілу, якім чыталіся некаторыя сшыткі рукапісу слоўніка і карэктурныя адбіткі, аўтары прыносяць сваю шчырую падзяку[7].

Дадаткі да слоўніка зроблены на падставе «Віцебскага краёвага слоўніка», выданага ў 1927 г., «Практычнага вайсковага слоўніка», выданьне (1927 г.) Вайсковай камісіі пры Інстытуце Беларускай Культуры, рукапісных слоўнікаў Шпілеўскага і Мядзьведзкага, якія маюцца ў аўтэнтыку ў Ленінградзкай Усесаюзнай Акадэміі Навук, «Слоўніка граматычна-лінгвістычнай тэрміналёгіі» (XV выпуск Беларускай навуковай тэрміналёгіі, Менск, 1927 г.), а таксама выпускаў навуковай тэрміналёгіі, скончаных апрацаваньнем ужо пасьля друку адпаведных аркушаў слоўніка. Дададзены таксама словы, пропуск якіх наагул заўважаны аўтарамі.

Аўтары
5 студзеня 1928 году

Сьпіс скарачэньняў у расійскім тэксьце

агрон. — агрономия
анат. — анатомия
арт. — артиллерийское дело
архит. — архитектура
астр. — астрономия
безл. — безличная форма
биол. — биология
бот. — ботаника
буд. — будущее время
вет. — ветеринария
вин. — винительный падеж
воен. — военное дело
вульг. — вульгарное слово (выражение)
г. — город
геогр. — география
геол. — геология
глаг. — глагол
грам. — грамматика
дат. — дательный падеж
детск. — детская речь
дипл. — дипломатия
драм. — драматургия
ед. — единственное число
ж. — женский род
зоол. — зоология
и. соб. — имя собственное
ирон. — в ироническом смысле
ист. — история
канцел. — канцеляризм
-л. — -либо
л. — лицо
ласк. — ласкательная форма
лес. — лесоводство
лит. — литературоведение
лог. — логика
м. — мужской род
мат. — математика
мед. — медицина
межд. — междометие
мест. — местоимение
мех. — механика
мин. — минералогия
миф. — мифология
мн. — множественное число
мор. — морской термин
муз. — музыка
-н. — нибудь
напр. — например
нар. — народное
нареч. — наречие
насмеш. — насмешливо
наст. — настоящее время
опт. — оптика
палеонт. — палеонтология
перен. — переносное значение
полит. — политика
полит. эк. — политическая экономия
почт. — почтовое дело
предл. — предложный падеж
пренебр. — пренебрежительное слово (выражение)
прил. — имя прилагательное
прост. — просторечное слово (выражение)
прош. — прошедшее время
прям. — прямое значение
психол. — психология
р. — река
род. — родительный падеж
см. — смотрите
собир. — собирательное
сов. — совершенный вид
спорт. — спортивный термин
ср. — 1) средний род; 2) сравните
сравн. ст. — сравнительная степень
сущ. — имя существительное
твор. — творительный падеж
театр. — театральный термин
техн. — техника
тип. — типографский термин
торг. — торговый термин
уменьш. — уменьшительная форма
уст. — устарелое слово (выражение)
фарм. — фармакология, фармацевтика
физ. — физика
физиол. — физиология
филос. — философия
хим. — химия
хир. — хирургия
церк. — церковное слово (выражение)
част. — частица
юрид. — юридический термин

Сьпіс скарачэньняў у беларускім тэксьце

ан. т. — анатамічны тэрмін (Беларуская навуковая тэрміналёгія. Вып. IX, вып. XIII. Nomina anatomica. Менск, 1926 — 1927 г.)

б. т. — батанічны тэрмін (Беларуская навуковая тэрміналёгія. Вып. VI. Батаніка агульная і спэцыяльная. Менск, 1924 г.)

Бабр. — слова ўжываецца ў Бабруйшчыне

В. кр. сл. — Віцебскі краёвы слоўнік, 1927 г.

В. Ласт. — Вацлаў Ластоўскі. Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік. Коўна, 1924 г.

в. т. — вайсковы тэрмін (вайсковая тэрміналёгія, апрацаваная Вайсковай Камісіяй пры Інстытуце Беларускай Культуры, рукапіс)

г.-к. т. — геаграфічна-касмаграфічны тэрмін (Беларуская навуковая тэрміналёгія. Вып. III. Геаграфічныя і касмаграфічныя тэрміны. Менск, 1923 г.)

г.-м. т. — геалягічна-мінэралягічны тэрмін (Беларуская навуковая тэрміналёгія. Вып. V. Геалёгія, мінэралёгія, крышталяграфія. Менск, 1924 г.)

гр. т. — тэрмін грамадазнаўчы (Беларуская навуковая тэрміналёгія. Вып. XI. Тэрміналёгія грамадазнаўства. Менск, 1926 г.)

гр.-л. т. — граматычна-лінгвістычны тэрмін (Беларуская навуковая тэрміналёгія. Вып. XV. Граматычна-лінгвістычная тэрміналёгія. Менск, 1927 г.)

Дабр. — Слоўнік Дабравольскага (Смоленский областной словарь)

з. т. — заалягічны тэрмін (Беларуская навуковая тэрміналёгія. Вып. XII. Назовы жывёл. Менск, 1927 г.)

К. Буйло — ужывае Канстанцыя Буйло

Калін. р. — слова ўжываецца ў Калінкавіцкім раёне

л. т. — літаратурны тэрмін (Беларуская навуковая тэрміналёгія. Вып. II. Практыка і тэорыя літаратурнага мастацтва. Менск, 1923 г.)

лс. т. — лесазнаўчы тэрмін (Беларуская навуковая тэрміналёгія. Вып. VIII. Слоўнік лясных тэрмінаў. Менск, 1926 г.)

М. Багд. — ужывае Максім Багдановіч

м. т. — матэматычны тэрмін (Беларуская навуковая тэрміналёгія. Вып. I. Элемэнтарная матэматыка. Менск, 1922 г.)

мз. т. — музычны тэрмін (Беларуская навуковая тэрміналёгія. Вып. VII. Музычныя тэрміны. Менск, 1926 г.)

Мядз. — рукапісны слоўнік Мядзьведзкага

Нс. — Слоўнік Насовіча (Словарь белорусского наречия)

Пр. в. сл. — Практычны вайсковы слоўнік, 1927 г.

пс.-л. т. — псыхоляга-лягічны тэрмін (Беларуская навуковая тэрміналёгія. Вып. IV. Тэрміналёгія псыхалёгіі і лёгікі. Менск, 1924 г.)

Слон. пав. — ужываецца ў Слонімскім павеце

старабел — старабеларускае слова

ф. т. — фізычны тэрмін (фізычная тэрміналёгія, апрацаваная Камісіяй Інстытуту Беларускай Культуры, рукапіс)

х. т. — хімічны тэрмін (хімічная тэрміналёгія, апрацаваная Камісіяй Інстытуту Беларускай Культуры, рукапіс)

Ц. Гарт. — ужывае Цішка Гартны

Шп. — рукапісны слоўнік Шпілеўскага

ю. т., пр. т. — юрыдычны (праўны) тэрмін (Беларуская навуковая тэрміналёгія. Вып. X. Тэрміналёгія права. Менск, 1926 г.)

Я. Кол. — ужывае Якуб Колас

Я. Куп. — ужывае Янка Купала

Fed. — M. Federowski. Lud Białoruski na Rusi Litewskiej

J. Cich. — Беларуска-польска-рускі слоўнік Язэпа Ціхінскага

А

а — *межд.* а, га, агá; ат
а — *союз* а, алé
а не то — калí ж не, то (дык)
Аарон — *и. соб.* Арон
абажур — абажýр, каптýр
аббат — абáт
аббатиса — абаты́са
аббатство — абáцтва
аббревиатура — скарачэ́ньне мз. т.
аберрация — абэра́цыя
абзац — новы радок
абонемент — перадпла́та
абонементный — перадпла́тны
абонент — перадпла́тнік
абонироваться — абанава́цца, перадпла́чваць
абордаж — абарда́ж, зачапле́ньне
абориген — тубы́лец
аборт — аборт, вы́кідак, вы́кід
абортировать — выкі́дваць
абрикос — абрыкос, марэ́ля
абрикосовый — абрыкосавы, марэ́левы
абрис — на́рыс, абры́с, абводак
абсолют — *филос.* абсалю́т
абсолютизм — самаўла́дзтва
абсолютно — абсалю́тна, самаўла́дна; бязумоўна, цалком
абсолютный — абсалю́тны, самаўла́дны, бязумоўны
абстрактный — адця́гнены, адлу́чаны
абстракция — адцягне́ньне пс.-л. т.
абсурд — недарэ́чнасьць, бязглу́зьдзіца, бяссэнсіца
абсурдный — недарэ́чны
авангард — авангáрд, пярэдняе войска
аванзал — аванза́ля
аванпост — перадава́я ва́рта
аванс — ава́нс
авансировать — авансава́ць
авансовый — ава́нсавы
авансовая квитанция — квіток на ава́нс
авансцена — перадсцэна
авантажный — карысны, зыскоўны
авантюра — авантýра
авантюрист — авантýрнік, прайдзісьве́т
авантюристический — авантýрны
авантюристка — авантýрніца, авантýрка
авария — ава́рыя
Аввакум — *и. соб.* Абакýм
август — жні́вень
августейший — найясьне́йшы
августовский — жні́веньскі
авдотка — *зоол.* (*Oedicnemus*) паля́нік з. т.
Авдотья — *и. соб.* Аўдоцьця
авиатор — лётнік
авиационный — лётніцкі
авиация — лётніцтва
авиачасть — лётная часьць в. т.
Авксентий — *и. соб.* Аксён
авось — а можа
на авось — на шча́сьце
Авраам — *и. соб.* Абра́м
Аврора — Аўрора; *нар.* досьвітак, золак
австралиец — аўстралíец
австралийский — аўстралíйскі
Австралия — Аўстра́лія
австриец — аўстрыя́к
австрийский — аўстрыя́цкі
Австрия — Áўстрыя

австриячка — аўстры́ячка
автобиограф — аўтабіёграф
автобиографический — аўтабіяграфі́чны
автобиография — аўтабіяграфі́я, уласнажыццяпіс
автограф — уласнапіс л. т.
автографический — уласнапісны л. т.
автокефалия — аўтакефа́лія, царкоўная незале́жнасьць
автократ — самаўла́дца
автократический — самаўла́дны
автократия — самаўла́дзьдзе гр. т.
автомат — аўтама́т, самару́х
автоматический, автоматичный — аўтаматы́чны, самару́шны
автоматчик — аўтама́тнік в. т.
автомобилист — аўтамабілі́сты
автомобиль — самаход
автомобильный — самаходны
автономия — самаўра́д
автономный — самаўра́дны
автопортрет — аўтапартрэ́т
автор — а́ўтар; а́ўтарка *ж.*
авторизированный — аўтарызава́ны
авторизировать — аўтарызава́ць
авторитет — аўтарытэ́т, пава́га, пава́жнасьць
авторитетный — аўтарытэ́тны, пава́жны
авторский — а́ўтарскі
авторское право — а́ўтарскае пра́ва ю. т.
авторство — а́ўтарства
автотип — адбі́тка л. т.
ага — эге́, ага́
Агапит — *и. соб.* Ага́п
Агафон — *и. соб.* Гапон
Агафья — *и. соб.* Ага́та
Аггей — *и. соб.* Аге́й
агглютинирующий — (*строй языка*) аглютына́цы́йны
агент — а́гэнт
агентский — а́гэнцкі
агентство — а́гэнцтва
агентура — агэнту́ра
агитатор — агіта́тар
агитационный — агіта́цы́йны
агитация — агіта́цыя
агитировать — агітава́ць
агония — кана́ньне, агонія
аграрий — земляўла́сьнік, абша́рнік
аграрный — зямне́льны
аграрный вопрос — зямне́льнае пыта́ньне
Аграфена — *и. соб.* Грыпі́на
агрессивный — захопны, зачэпны
агрикультура — рольніцтва
агроном — аграном
агрономический — агранамі́чны
агрономия — аграномія
ад — пе́кла
Адам — *и. соб.* Ада́м
адамант — дыямэнт
адамантовый — дыямэнтавы
адамов: адамово яблоко — *анат.* кады́к, гарля́к
адаптация — прызвыча́енасьць пс.-л. т.; прыстасава́ньне, дапасава́ньне
адвокат — адвака́т
адвокатский — адвака́цкі
адвокатское сословие — адвака́цкі стан
адвокатура — адвака́цтва
Аделаида — *и. соб.* Адэля
административный — адміністрацы́йны, урадовы
администратор — адміністра́тар, кіраўні́к
администрация — адміністра́цыя, ура́д, кіраўні́цтва
адмирал — адмірал
адмиральский — адміральскі
адовый — пяке́льны
Адонис — *миф.* Адоніс
адонис — *бот.* (*Adonis aestivalis L.*) адонісавы цьвет
адрес — а́дрэс (а́драс)
адресант — адрэса́нт (адраса́нт)
адресат — адрэса́т (адраса́т)
адресный — а́дрэсны (а́драсны)
адресный стол — а́дрэсны (а́драсны) стол
адресовать — адрэсава́ць (адрасава́ць), накіроўваць (*да каго*)
адресоваться — адрэсава́цца (адрасава́цца), зварочвацца, накіроўвацца (*да каго*)
адский — пяке́льны
адское жилище — пяке́льня
адский камень — пяке́льны ка́мень
адъюнкт — ад'ю́нкт, памочнік
адъютант — ад'ютант, падру́чны
ажио — надда́так, ла́жа
ажиотаж — спэкуля́цыя на грошах
ажурный — дзірча́сты, празорысты, мярэжысты
ажурный узор — мярэжа
азалия — *бот.* (*Azalea L.*) азале́я

азарт — рызыка, запа́л, аза́рд
азартничать — рызыкава́ць, азардава́ць
азартно — рызыкоўна, азардоўна
азартный — рызыкоўны, азардоўны, азардовы
азбука — а́збука, абэцэ́да; (*гражданская*) кірыліца; (*латинская*) абэцэ́да, лаці́нка
азбучный — а́збучны, абэцэ́длавы
азиат — азія́т
азиатский — азія́цкі
Азия — А́зія
Азовское море — Азоўскае мора
азот — азот
азотистый — азатнава́ты
азотный — азотавы
аир — *бот.* (*Acorus calamus L.*) ае́р
аирный — ае́рны
аист — бу́сел, баця́н
аист чёрный — га́йстар
аистник — *бот.* (*Erodium L.*) бу́сельнік б. т., буслоўнік; (*Erodium cicutarium L.*) даждж оўнік В. кр. сл.
аистовый — бусловы, баця новы
аистово гнездо — бусьля́нка; буслоўка
ай — *межд.* ай, ат
ай да — вось дык
ай-ай — *зоол.* (*Chiromys*) рукамы́шка з. т.
айда — *межд.* га́йда; гэй, напе́рад
айсберг — лёдавая гара́, лёдагор г.-м. т.
академик — акадэмік
академический — акадэмі́чны
академия — акадэмія
аканье — а́каньне
акать — а́каць
акация — ака́цыя
акающий — а́каючы
аквамарин — аквамары́н
аквамариновый — аквамары́навы, зеленава́ты, блакі́тны
акварель — акварэля
акварельный — акварэльны
акварий, аквариум — аква́рыум
акколада — ду́жка мз. т.
аккомодация — прыстасава́ньне, дапасава́ньне, акамада́цыя
аккомпанемент — акампані мэнт, утурава́ньне
аккомпанировать — акампанава́ць, утурава́ць
аккорд — акорд, сугалосье
аккордный — акордны, акордавы
аккредитив — акрэдыты́ў, поўнамо́цтва ю. т., даве́ранасьць
аккумулятор — акумуля́тар, зграмаджа́льнік
аккумуляция — акумуля́цыя, зграмаджэньне
аккуратно — акура́тна, акура́т, дакла́дна
аккуратность — акура́тнасьць
аккуратный — акура́тны, дакла́дны, спра́ўны
акробат — акраба́т, камэдыя́ншчык
акрополь — вы́шгарад
акростих — акрасты́х
аксиома — пэ ўнік м. т., аксыёма
акт — акт, дзе́яньне, спра́ва; *лит.* дзе́я; *юрид.* акт
актёр — актор
актив — акты́ў
активность — дзе́йнасьць, чы́ннасьць
активный — дзе́йны; чы́нны
актиния — *зоол.* (*Actinia*) акты́нія
актриса — акторка
актуальность — здольнадзе́йнасьць
актуальный — дзе́йны, здольнадзе́йны
акула — аку́ла
Акулина — *и. соб.* Куліна
акулинка — *бот.* (*Verbascum L.*) дзіва́на
акустика — аку́стыка
акустический — акусты́чны
акушер — акушэр
акушерка — акушэрка, ба́ба
акушерский — акушэрскі
акушерство — акушэрства, ба́бінье
акушерствовать — акушэрыць, ба́біць
акцент — **1.** на́ціск (*на слове*); **2.** вымова, акцэнт
акцентировать — **1.** кла́сьці на́ціск (*на слове*); **2.** вымаўля́ць (*з на́ціскам*)
акциденция — **1.** выпадковасьць; **2.** мы́тны штраф
акциз — акцы́з
акцизный — акцы́зны
акцизный чиновник — акцы́зьнік
акцизное управление — акцы́зная ўпра́ва
акционер — акцыяне́р, супольнік
акционерный — акцы́йны
акционерное товарищество (общество) — акцы́йнае таварыства, акцы́йная суполка
акция — а́кцыя, пай ю. т.
албанец — альба́нец
Албания — Альба́нія
алгебра — а́льгебра
алгебраический — альгебры́чны
алебарда — галяба́рда
алебастр — аляба́стар

Александр — *и. соб.* Аляксáндар, Алéсь
Александра — *и. соб.* Аляксáндра, Алéся
александрийский — александрыйскі
александрийская бумага — дакумантовая папéра
Александрия — Александрыя
Алексей — *и. соб.* Аляксéй
алеть — чырванéць
али — ці, хібá, або
алименты — алімэнты, утрымáньне
алкание — прáга
алкать — прáгнуць, прагчы́ся, гáліцца
алкоголизм — алькагалізм
алкоголик — алькаголік, п'я́ніца
алкоголь — алькаголь
Аллах — Алáх
аллегорический — іншасказáльны
аллегория — іншасказ
аллея — прысáды
аллитерация — сугýчнасьць л. т.
аллограф — чужапíс
аллювий — наплы́ў
аллюзия — намянéньне л. т.
аллюр — гон в. т.; хадá
аллюром — наўзáвады
алмаз — дыямэнт
алмазный — дыямэнтавы
алость — чы́рвань
алтарный — аўтáрны
алтарь — аўтáр, афя́рнік (ахвя́рнік)
алтей — *бот.* (*Althaea L.*) шляз
алтын — шастáк, тры капéйкі
алфавит — альфабэт
алфавитный — альфабэтны
алхимик — альхэмік (альхíмік)
алхимия — альхэмія (альхíмія)
алчно — прагавíта, хціва, сквáпна
алчность — прагавíтасьць, хцівасьць
алчный — прагавíты, хцівы
алый — чырвоны́, румя́ны
альбатрос — *зоол.* (*Diomedea*) альбатрос
альбинос — альбінос, бяля́сы
альбит — (*полевой шпат*) альбíт, палявíк х. т.
альбом — альбом
альбомный — альбомны
альбумин — белкавíна
альвеола — *анат.* мíсачка (зубна́я), пухíрок (лёгачны) ан. т.
альков — алькоў, бакоўка, алькéрык
альманах — альманáх
альмикви — *зоол.* (*Solenodon*) шчыліназýб з. т.
альпиец — альпéец
альпийский — альпéйскі
Альпы — Áльпы
альт — альт
альтернатива — альтэрнаты́ва
альтернативный — альтэрнаты́ўны
альтовый — альтовы
альтруизм — альтруíзм
альтруистический — альтруісты́чны
алюминий — гліня́к г.-м. т.; алюмíнь
аляповатость — нязграбнасьць, лапéзнасьць
аляповатый — нязгрáбны, лапéзны, нехлямя́жы
Аляска — Аля́ска
амарант — *бот.* (*Amaranthus L.*) аксамíтнік
амбар — сьвíран, клець
амбарный — сьвíранавы, сьвíрнавы, сьвіронны, клецяны́
амбарчик — сьвіронак
амбарщик — гаспадáр сьвíрна (клéці)
амбиция — амбíцыя, гонар, пы́ха
амбра — áмбра, пах
амбразура — бойніца (байніца)
амбулатория — амбуляторыя
амбулаторный — амбуляторны
амвон — амбона, казáльніца
Амвросий — *и. соб.* Амброз, Амброжы
амёба — амэба з. т.
Америка — Амэрыка
американец — амэрыкáнец
американка — амэрыкáнка
американский — амэрыкáнскі
аметист — амэты́сты
аметистовый — амэты́ставы
аминь — амíн, áман; канéц, капýт, капéц
аммиак — аманя́к
аммиачный — аманяковы
аммоний — *хим.* амон
амнистировать — амніставаць, памíлаваць
амнистия — амністыя
аморальный — неабычáйны, немаральны
амортизация — амартызáцыя, пагашэньне
амортизировать — амартызаваць, пагашáць
аморфный — некрышталёвы г.-м. т
Амос — *и. соб.* Амос
ампир — ампíр (*від сты́ля*)
амплитуда — размáх г.-к. т., амплітýда
ампула — *анат.* гарлáчык ан. т.
ампутация — ампутáцыя, адцíн, урэз

ампутировать — ампутава́ць, адціна́ць / адця́ць, урэзваць / урэзаць
амулет — амуле́т, за́чур
амуниция — аснá да в. т.
амуничник — аснáднік в. т.
амуничный — аснáдны
Амур — Аму́р (*бажок каха́ньня*)
амуры — залёты
амурничать — жаніха́цца, каха́цца, любі́цца, заляца́цца
амфиболия — двузна́чнасьць л. т.
амфилогия — двуслоўе л. т.
амфитеатр — паўкру́г
ан — аж
анабаптизм — анабаптызм, другахрышчэнства
анабаптист — анабаптысты, другахрышчэнец
анаграмма — анагра́ма, пераста́ўка лі́тар
анаграф — на́дпіс л. т.
анализ — ана́ліз, раскла́д, разбор
анализатор — аналіза́тар, раскладáльнік
анализировать — аналізава́ць, раскладáць, разьбіра́ць
аналитический — аналітычны, раскладовы
аналитическая химия — аналітычная хэмія (хі́мія)
аналогический, аналогичный — падобны, аналягі́чны
аналогия — падобнасьць, падабе́нства, аналёгія
ананас — ананáс
ананасный — ананáсавы
анапест — ана́пэст
анархизм — анархізм
анархист — анархісты
анархический — анархічны, бязура́дны, бязула́дны
анархия — ана́рхія, бязура́дзьдзе, бязула́дзьдзе
Анастасий — *и. соб.* Анастáс
Анастасия — *и. соб.* На́ста, Насту́ля
анастрофа — перастáўка л. т.
Анатолий — *и. соб.* Анатоль
анатом — анатом
анатомирование — анатамава́ньне
анатомировать — анатамава́ць
анатомический — анатамічны
анатомия — анатомія
анафема — праклён
анафемствовать — выкліна́ць
анафора — паўтарэньне л. т.
анахорет — пустэльнік, вы́людак
анахронизм — нясуча́снасьць л. т., анахранізм
ангажемент — запрашэньне ў скокі
ангажировать — запраша́ць у скокі (та́нец)
ангел — анёл, а́нел
ангелочек, ангельчик — анёлак
ангел-хранитель — анёл-абаронца
ангельский — ане́льскі
ангидрит — бязводнік
ангина — анги́на, жа́бка
английский — анге́льскі
англичанин — анге́лец
англичанка — анге́лька
Англия — А́нглія, Анге́льшчына
анданте — *муз.* паволі
Андрей — *и. соб.* Андрэй
Андроник — *и. соб.* Андрон
анекдот — анэкдо́т, жарт
анекдотический — анэкдоты́чны, жартлі́вы
анемический — малакроўны
анемия — малакроўе
анемон — *бот.* (*Anemone L.*) сон-трава́
анилин — аніліна
анилиновый — аніліна́вы
анимизм — анімізм, удухаўле́ньне гр. т.
анис — аніс
анисовый — аніса́вы
анкета — анке́та, апыта́льны ліст
анкетный — анке́тны, апыта́льны
Анна — *и. соб.* Га́нна, Гану́ля
анналы — ле́тапіс
аннексировать — анэксава́ць
аннексия — анэксія
аннулирование — касава́ньне
аннулировать — касава́ць
Аннушка — *и. соб.* Гану́ля, Гану́лька
аномалия — адхіле́ньне
аноним — бязыме́ньнік л. т.
анонимный — бязыме́нны л. т.
анонс — паведамле́ньне л. т.
антабка — *воен.* стрэмечка Пр. в. сл.
антагонизм — супраці́ўнасьць
антагонист — супраці́ўнік
антагонистический — супраці́ўны
Антарктида, Антарктика — Паўдзе́ньне г.-к. т
антарктический — паўдзе́нны
Антверпен — *г.* Антвэ́рпэн
антенна — антэна
антеридий — антэры́д, заплодня б. т.
антидот — проціатру́тнік

антик — старажы́тнік
антикварий, антиквариум — антыква́р
антикварный — антыква́рны, старажы́тны, старада́ўні
антиклиналь — вы́гін м. т.
антилопа — са́рна з. т., антылёпа
антипатический, антипатичный — нялю́бы, антыпаты́чны
антипатия — нялю́басць, не́хаць, гідлі́васць, антыпа́тыя
антиподы — проціно́жнікі
антисемит — антысэмі́т
антисемитизм — антысэмі́тызм
антитеза, антитезис — проціпалажэ́нне пс.-л. т., антытэза
антихрист — анты́хрыст
антициклон — антыцыклён
античность — старажы́тнасць
античный — старажы́тны
Антон, Антоний — *и. соб.* Антон, Антось
Антонин — *и. соб.* Антані́н
Антонина — *и. соб.* Антані́на, Антося
антонов: антонов огонь — агнёвіца (агнявіца)
антоновка — (*яблоня*) антонаўка
антракт — перапы́нак
антрацит — антрацы́т
антраша — падскок
антрепренёр — прадпрыёмец (тэатра́льны)
антреприза — тэатра́льнае прадпрыёмства
антропофаг — людае́д
анчоус — анчоўс (*від селядца́*)
анютин: анютины глазки — *бот.* (*Viola tricolor*) бра́ткі, залату́ха
аорист — *грам.* аорыст
аорта — аорта, ту́тніца
апартаменты — пакоі
апатично — бязуваўжна, бяз уваўгі, апяша́ла, мля́ва
апатичный — бязуваўжны, абыя́кі, апяша́лы, мля́вы
апатыя — нячу́ласць, абыя́касць, апяша́ласць, мля́васць
апаш — апа́ш, бадзёла
апеллирование — апэляваўне
апеллировать — апэлява́ць
апелляционный — апэляцы́йны
апелляция — апэля́цыя
апельсин — *бот.* (*Citrum amramthium L.*) памяра́нец, ара́нжык
апельсинный, апельсиновый — памяра́нцавы
апельсинная настойка — памеранцоўка
Апеннины — Апэні́ны
аплодировать — пля́ска́ць (плёскаць) у далоні
аплодисменты — воплескі
апокриф — апокрыф
апокрифический — апакрыфі́чны
апология — абарона
апоплексия — пара́люш
апостат — адсту́пнік, адшчапе́нец
апостол — апостал
апостолический — апасталі́чны
апостольский — апостальскі
апостроф — пропуск лі́тары
апострофа — зварот л. т., зваротка
апофеоз — апатэо́з, убагаўле́ньне (абагаўле́ньне) л. т.
аппарат — прыла́да, апара́т
апперцептивный — апэрцэпцы́йны
апперцепция — апэрцэ́пцыя
аппетит — апэты́т
аппетита нет — яды́ ня прыма́е
с большим аппетитом — з вялі́кім сма́кам
аппетитно — апэты́тна, са сма́кам
аппетитный — апэты́тны, сма́чны
апрель — красаві́к
апрельский — красаві́коўы
аптека — аптэка
аптекарский — аптэкарскі
аптекарский помощник — аптэкарскі памо́чнік
аптекарша — аптэкарыха
аптекарь — аптэкар
аптечка — аптэчка
аптечный — аптэчны
араб — ара́б
арабский — ара́бскі
Аравия — Ара́бія
арап — му́ры́н
арапка — му́ры́нка
арапник — гара́пнік, бізу́н
арбитр — арбі́тар, пасярэ́днік
арбитраж — арбітра́ж, пасярэдніцтва
арбуз — кавуно́н
арбузный — кавуновы
аргумент — довад, аргумэнт
аргументация — довады, давядзе́ньне, даводжваньне
аргументировать — даводзіць, аргумэнтава́ць
Аргус — А́ргус
арена — арэна, бегавішча

аренда — арэнда, пасэсія
арендатор — арандáр, арандáтар, пасэсар
арендаторка — арандáрка, арандáтарка, пасэсарка
арендаторский — арандáрскі, арандáтарскі
арендный — арэндны
арендная торговля молочной продукцией — пакт Мядз.
арендовать — арандавáць, браць у пасэсію
арест — áрышт
арестант — арыштáнт
арестантский — арыштáнцкі
арестованный — арыштавáны, арыштáнт
арестовать — арыштавáць
аржанец — *бот.* (*Phleum*) мяжоўка
аржаной — жытні
ариетта — *муз.* арыéта, малéнькая áрыя мз. т.
Аристарх — *и. соб.* Арыстáрх
аристократ — арыстакрáт, магнáт, пан гр. т.
аристократический — арыстакратычны, магнáтны
аристократия — арыстакрáтыя, магнáцтва, можнаўлáдзтва, пáнства гр. т.
аристократка — арыстакрáтка
арифметика — арытмэтыка
арифметический — арытмэтычны
ария — сьпеў л. т.
арка — áрка, скляпéньне
Аркадий — *и. соб.* Аркáдзь
аркан — аркáн; зáхлыстка В. Ласт.
Арктика — Паўночча
арктический — паўночны
арлекин — сьмéшнік
арматура — арматýра, зброя, рыштýнак
армеец — армéец, вайсковец
армейский — армéйскі, вайсковы
армия — áрмія
армия действующая — áрмія дзéйная
армяк — сьвíтка
армянин — армянíн
армянка — армянка
армянский — армянскі
арнаутка — арнаýтка (*гатýнак пшаніцы*)
аромат — арамáт, пахýчасьць
ароматный — арамáтны; пахýчы
арсенал — збраёўня в. т.
Арсений — *и. соб.* Арсён
артачиться — упірáцца, наравíцца
артель — сябрына (сябрыня), суполка, арцéль
артельный — супольны, арцéльны
артельщик — арцéльшчык; паганяты
Артемий — *и. соб.* Арцём
артериальный — артэрыяльны, чырвонажыльны ан. т.
артерия — артэрыя
артизм — мастáцкасьць л. т.
артиллерийский — артылерыйскі, гармáтны
артиллерист — артылерысты, гармáтнік
артиллерия — артылéрыя
артист — артысты, мастáк
артистический — мастáцкі
артистка — артыстка, мастáчка
артишок — *бот.* (*Cynara L.*) карчок
арфа — гáрфа
арфист — гарфісты
арфистка — гарфістка
архаизм — старасьвéтчына л. т.
архаистический — старасьвéцкі л. т.
архангел — архáнел
Архангельск — *г.* Архáнгельск
архангельский — архáнельскі
архаровец — шыбельнік, вісус
архегозавр — старажшчар г.-м. т.
архегоний — родніца б. т.
археолог — археалёг
археологический — археалагічны
археология — археалёгія
архив — архíў
архивариус — архíўнік
архивный — архíўны
архидиакон — архідзякан
архиепископ — архіепіскап, арцыбіскуп
архиерей — архірэй
архиерейский — архірэйскі
архимандрит — архімандрыт
Архип — *и. соб.* Архíп
архипелаг — архіпэлáг, згрупавáньне астравоў г.-к. т
архитектор — будаўнíчы, дойлід, архітэктар
архитектура — будаўнíцтва
архитектурный — будаўнíцкі
аршин — аршын
аршинник — (*сортимент*) аршыновік лс. т.
аршинный — аршыновы
арьергард — ар'ергáрд
асбест — азбэст (асбэст)
аскарида — *зоол.* (*Ascaris*) аскарыда
аскет — аскéт, пустэльнік
аскетизм — аскетызм
аскетический — аскетычны

аспарагин — шпараґі́на б. т.
аспарагус — *бот.* (*Asparagus*) шпара́ґ
аспид — **1.** шы́фер; **2.** га́сьпід (а́сьпід), злосьні́к
аспидный: аспидная доска — **1.** лупня́к га́сьпідны (а́сьпідны) г.-м. т.; **2.** гры́фельная дошка
аспирин — асьпіры́на
ассенизатор — асэніза́тар, брудавозьні́к
ассенизационный — асэнізацы́йны
ассенизационный обоз — асэнізацы́йны абоз
ассенизация — асэніза́цыя, вы́ваз бру́ду
ассигнация — асыгна́цыя
ассигнование — асыгнава́ньне, вызначэ́ньне грошай
ассигновать — асыгнава́ць, вызнача́ць / вы́значыць грошы
ассигновка — асыгноўка, папе́ра на грошы
ассимилировать — прыпадабля́ць, прысваяць, прызвыча́йваць
ассимиляция — прыпадабле́ньне, упадабле́ньне л. т., прысвае́ньне б. т.
Ассирия — Асы́рыя
ассистент — асыстэнт
ассонанс — сугалосьсе л. т.
ассортимент — асартымэнт, розназбо́р
ассоциативный, ассоциационный — злуча́льны
ассоциация — злучэ́ньне, злу́чнасьць
астма — ды́хавіца, уду́шша
астмический — дыхаві́чны
астра — *бот.* (*Aster L.*) а́стра
астрагал — *бот.* (*Astragalus L.*) кураваґ б. т.
астрагал сладколистный — *бот.* (*Astragalus glycyphyllos L.*) аве́чы гарох В. кр. сл., журавоў гарох Мядз.
астральный — зоркавы
астролог — астралёг
астрология — астралёгія
астролябия — астраля́бія
астроном — астраном
астрономический — астранамі́чны
астрономия — астраномія
асфальт — асфа́льт, зе́мная смала́
асфальтовый — асфа́льтавы
ась — га, што
атавизм — атаві́зм, зваротная спа́дчыннасьць
атавистический — атаві́сты́чны, зваротнаспа́дчынны
атака — ата́ка, напа́д, нападзе́ньне
атаковать — атакава́ць, напада́ць
атаман — атама́н
атеизм — атэі́зм, бязбожжа, бязбожнасьць
атеист — атэі́сты, бязбожні́к
атеистический — атэі́сты́чны, бязбожны
атлант — (*первый шейный позвонок*) атля́нт
Атлантический океан — Атлянты́чны акія́н
а́тлас — а́тляс
атла́с — атла́с
атла́сный — атла́сны
атлет — атле́т, барацьбі́т, асі́лак
атлетика — атле́тыка
атлетический — атлеты́чны
атмосфера — атмасфэра
атмосферный — атмасфэрны
атмосферное давление — атмасфэрны ці́ск
атмосферные осадки — атмасфэрныя вападзі
атолл — атоль г.-к. т
атом — а́там
атомистика — атамі́стыка
атомистический — атамісты́чны
атрибут — уласьці́васьць, прынале́жнасьць
атрибуты власти — кля́йноды
атропин — атрапі́на
атрофированный — адме́рлы
атрофироваться — адміра́ць
атрофия — атрафі́я, адміра́ньне
аттестат — атэста́т, пасьве́дчаньне
аттестация — атэста́цыя, апраба́та
аттестовать — атэстава́ць
ату — *межд.* ацю́
атукаць — цкава́ць
ау — *межд.* аў
аудиенция — прыймо
аудитор — аўды́тар, выслуха́льнік
аудитория — слуха́льня
ауканье — гука́ньне, гойканьне, галёканьне
аукать — гука́ць, гойкаць, галёкаць
аукцион — аўкцыён, ліцыта́цыя, публі́чны продаж
аукционный — ліцытацы́йны
аул — аўл (*вёска на Каўка́зе*)
аутентик — аўтэнтык
аутентический — аўтэнты́чны
Афанасий — *и. соб.* Апана́с, Пана́с
афера — афэра
афереза — скарачэньне, урэз
аферист — афэры́сты

аферистка — афэры́стка
афинский — атэнскі
Афины — *г.* Атэны
афиша — абве́стка
афишировать — абвяшча́ць, прагалаша́ць
афоризм — афары́зм, выслоўе *л. т.*
афористический — афарысты́чны, выслоўны
Африка — А́фрыка
африканец — афрыка́нец
африканка — афрыка́нка
африканский — афрыка́нскі
афронт — зьнява́га
аффект — афэкт
аффективный — афэкты́ўны
ах — *межд.* ах, вох, авохці, авой
аханье — вохі, а́ханьне
ахать — вохаць, а́хаць
ахинея — плёткі
ахинею нести — плясьці́ ла́пці, чаўпсьці́
ахроматизм — ахраматы́зм
ахроматин — ахраматы́н
ахроматический — ахраматы́чны
ахти — ах
не ахти — ня ду́жа, ня ве́льмі, ня на́дта
аэродром — аэрадро́м, лётны пляц
аэролит — пове́траны ка́мень
аэронавт — лётнік
аэронавтика — лётніцтва
аэроплан — самалёт
аэростат — пове́траны балён

Б

ба — *межд.* ба
баба — ба́ба, жанчы́на
Баба-Яга — Ба́ба-Яга, Ягі́ньня, Каргота-ба́ба Мядз.
бабёнка — маладзі́ца, маладу́ха
бабий — ба́бін, ба́бскі, жаночы
бабье лето — ба́біна ле́та
бабка — **1.** ба́бка, бабу́ля, бабу́ся, бабу́ня; **2.** (*повивальная*) ба́бка, павіту́ха, пупарэ́зіца; **3.** (*в игре*) цы́рка
бабник — бабзды́р, ба́бнік
бабочка — (*Papilio*) маты́ль, матылёк
бабушка — ба́ба, бабу́ля, бабу́ня
бабушкин — бабу́лін, бабу́нін
бабьё — *собир.* ба́бы, ба́бства
баварец — бава́рац
Бавария — Бава́рыя
багаж — паку́нкі
багажный — пакунковы
багажная квитанция — квіток на паку́нкі
багет — баге́т
багетный — баге́тны
багор — багор; восьці; бусо́к
багрец — чы́рвань
багрить — лавіць ры́бу восьцямі
багроветь — чырване́ць
багровость, багряность — чы́рвань, барві́стасць
багровый, багряный — цёмна-чырвоны, барві́сты, барвя́ны
багульник — *бот.* (*Ledum palustre L.*) багу́н
бадейщик — бондар
бадья — бале́я, цэбар
бадьян — *бот.* (*Illicium L.*) бадзя́н
бадяга — *зоол.* (*Spongilla*) бадзя́га
база, базис — падста́ва; (*военная*) ба́за в. т.
базальт — слупаві́к г.-м. т.
базар — ры́нак, кірма́ш, база́р
базарный — ры́начны, кірмашовы, база́рны
базилиск — базыліск, базыліша́к
баить — ба́іць, каза́ць ба́йкі
байка — ба́йка
Байкал — Байка́л
байковый — ба́йкавы
Байрам — (*магометанский праздник*) Байра́м
бак — чоп, чопік
бакалавр — бакаля́р
бакалейный — бакале́йны
бакалейщик — бакале́йнік
бакалея — бакале́я
бакенбарды — ба́кі
баклага — бікла́га, пля́шка
баклажан: баклажаны — кабачкі́
баклуши: баклуши бить — бры́нды біць, бі́бікі біць
бактериология — бактэрыялёгія (наву́ка аб бактэрыях)
бактерия — бактэрыя
бал — баль
балабан — ду́рань, целяпе́нь, балабон
балаган — бу́да, я́тка, балага́н
балагур — бала́ка, гаварок
балагурить — гаманіць, зюзю́каць, бала́каць
балагурство — гамонка, бала́каньне
балалайка — балабайка, балала́йка
баламут — баламу́т, чмут, чмуры́ла
баламутить — баламу́ціць, чму́ціць
баланс — бала́нс, роўнава́га, роўнасьць

Б

балансёр — роўнава́жнік
балахон — балахон, насоў
балбес — ба́йбус, ві́сус, лагі́за
балда — доўбня, ду́рань
балдахин — полаг
балерина — балярына́, танцорка
балет — бале́т
балетный — бале́тны
балка — **1.** *геогр.* яр, роў; **2.** *архит.* ба́лька, бервяно, ма́ціца; (*поперечная под потолком*) трам, царына́
балкон — балькон, га́начак
балкончик — бальончык, га́нак
балл — бал, адзна́ка
балласт — цяжа́р
баллистика — балі́стыка в. т.
баллистический — балісты́чны в. т.
баллон — балён
баллотирование, баллотировка — лесава́ньне (лёсава́ньне), галасава́ньне; лёсы гр. т.
баллотировать — лесава́ць (лёсава́ць), галасава́ць
балмошный — неразва́жны, кру́чаны
баловать — **1.** патворыць, пе́сьціць; **2.** балава́цца, гарэзаваць
баловень — пасту́н, патворшчык
баловник — балаўні́к, свавольнік, гарэза
баловница — балаўні́ца, свавольніца, гарэза
баловство — **1.** патвора, патворства; **2.** свавольства
балочка — *анат.* (*trabecula*) кла́дачка ан. т.
Балтийское море — Балты́цкае мора
балык — балы́к
бальзам — бальза́м
бальзамин — *бот.* (*Impatiens balsamina L.*) бальзаміна
бальзамирование — бальзамава́ньне
бальзамировать — бальзамава́ць
бальный — ба́льны
балюстрада — баля́сы
балясина — баля́сіна
бамбук — бамбу́с
бамбуковый — бамбусовы
банальность — будзённасьць л. т.
банальный — будзённы л. т.
банан — *бот.* (*Musa paradisiaca L.*) бана́н, ра́йская хві́га
банда — ба́нда, згра́я
бандаж — банда́ж
бандажный — банда́жны
бандероль — бандэро́ля, перава́язка
бандерольное отправление — пасы́лка пад бандэро́ляй
бандит — банды́т, банды́та
бандитизм — бандыты́зм
бандура — банду́ра
банк — банк
банк государственный — дзяржа́ўны банк
банк заёмный — пазычковы банк
банк коммерческий (торговый) — гандлёвы банк
банк частный — прыва́тны банк
метать банк — банкава́ць
банка — слоік, бляша́нка; *мед.* ба́нька
банкет — банке́т
банкир — банкі́р
банкирский — банкі́рскі
банкирская контора — банкі́рская кантора
банкнот — банкнот
банковский — ба́нкаўскі
банкомёт — банкі́р
банкрот — банкру́т
банкротиться — банкру́ціцца
банкротство — банкру́цтва
банный — ла́зенны, ба́нны;
пристал как банный лист — прычапіўся як смала́ (як скула́, як ма́ра́)
бант — кука́рда; бант
банщик — ба́ншчык, ла́зеньнік
баня — ла́зьня, ба́ня
барабан — бу́бен, бараба́н
барабанить — бубні́ць, бараба́ніць, тараба́ніць
барабанный — бубённы, бараба́нны
барабанщик — бара́ба́ньнік Пр. в. сл., бараба́ншчык
барак — бара́к, курэнь
баран — бара́н; (*самец*) марка́ч
баранец — *бот.* (*Lycopodium L.*) дзераза́
бараний — барановы
баранье сало — лой
бараний тулуп — кажу́х
баранина — бара́ніна
баранка — абара́нак
Барановичи — *г.* Бара́навічы
барахло — бэбахі, барахло
барахтанье — капашэньне, ваўту́жаньне
барахтаться — капашы́цца, ваўту́зіцца
барашек — бара́нчык; сму́шак
барашковый — бара́нчыкавы, смушковы
барбаризм — барбары́зм (*ср.* **варваризм**)
барбарис — *бот.* (*Berberis L.*) барбары́с

барвинок — *бот.* (*Vinca L.*) барві́нак
бард — сыпява́ка л. т.
барда — бра́га, салад зі́ны
баржа — ба́ржа, барлі́на; віці́на лс. т.
барин — пан
жить барином — па-па́нску жыць
барит — (*камень*) барыт, цяжкі́ шпат
баритон — барытон
барка — барлі́на; ла́йба, дуб лс. т.
баркас — шала́нда, барка́с
барометр — баро́мэтр (баро́мэтар), ціскаме́р ф. т.
барометрический — барамэтры́чны
барон — барон
баронесса — баранова
баронский — баронскі
баронство — баронства
бароскоп — бараскоп
баррикада — барыка́да
барс — па́рдус, пантэра
барский — па́нскі
барствовать — панава́ць
барсук — барсу́к
бартенок — *бот.* (*Farsenia L.*) грымотнік
бархан — вы́дма
бархат — аксамі́т, мошаст
бархатка — *бот.* (*Tagetes patula L.*) аксамі́тка б. т.
бархатник — *бот.* (*Amaranthus L.*) аксамі́тнік б. т.
бархатный — аксамі́тны, машастовы
барчонок, барчук — панíч
барщина — па́ншчына, прыгон
барщинный — прыгонны
барыня, барынька — па́ня, па́нечка
барыш — зыск, прыбы́так, магары́ч, барышы́ *мн.*
запить барыши — пастáвіць магарычá
барышник — гандля́р, фа́ктар
барышнин — пане́нскі
барышничать — гандлява́ць, барышава́ць
барышня — пане́нка, па́нна
барьер — бар'е́р, рага́тка
бас — бас
басенный — ба́ечны
басистый — басі́сты
баситъ — пець ба́са, басава́ць
баснописец — байкапі́сец л. т.
баснописный — байкапі́сны л. т.
баснослов — ба́ечнік
баснословить — ба́яць
баснословный — ба́ечны, ка́зачны
басня — ба́йка
бассейн — басэ́йн, вадазбор, копанка
баста — *межд.* годзі, даволі, досыць
бастовать — баставáць
басурман — басурма́н, пага́ны
басурманить — пага́ніць
басурманский — пага́нскі
баталия — бітва́, бойка
батальон — батальён
батальонный — батальённы
батарея — батарэя
батенька — ба́цечка, та́тка, та́тачка
батист — баты́ст
батистовый — баты́ставы
батлачик, батлачок — *бот.* (*Alopecurus L.*) лісахвост б. т.
батог — бізу́н, гара́пнік
батожить — бізу́ніць, дзя́жыць, лупцава́ць
батрак — па́рабак, на́йміт
батрацкий — па́рабкаўскі, на́йміцкі, парабочы
батрачить — за па́рабка працава́ць, парабкава́ць
батрачка — парабча́нка, на́ймітка; маладча́нка В. кр. сл.
батька — ба́цька
батюшка — ба́цюхна, та́тухна
батя — та́та
баул — ку́фар, скры́нка
бахвал — хвалько, хвасту́н, зухва́л, самахва́л
бахвалиться — выхваля́цца, хва́стаць
бахвальский — зухва́льскі, самахва́льскі
бахрома — махра́
бац — *межд.* бац, бах, баба́х, лясь
бацилла — бацы́ла
башка — мазгаўня́
башковатый — мазгава́ты, мазгаві́ты
башлык — башлы́к, каптýр
башмак — чарав ік, кама́ш
башмачник — шаве́ц
башмачный — шаве́цкі
башмачок: башмачки — *бот.* (*Cypripedium L.*) чаравічкі
башня — ве́жа, ба́кшта
баю, баюшки — *межд.* лю́лі-лю́лі, ба́ю-ба́ю
баюкать — баю́каць, калыха́ць, люля́ць
бдение — дба́ньне; чу́йнасьць
бдение всенощное — не́шпар, вячэрня
бдеть — дбаць, быць на ва́рце, зорыць, пільнава́ць

Б

Б

бдительно — дба́йна, чу́йна, пі́льна
бдительность — дба́йнасьць, чу́йнасьць, пі́льнасьць
бдительный — дба́йны, чу́йны; пі́льны
бег — бяга́, бег, гон
бега — (*конские*) бегавішча
беганье — бе́ганьне, беганіна
бегать — бе́гаць
бегать взапуски — бе́гаць навы́перадкі
бегать от укуса оводов — (*о скоте*) гізава́ць
беглец — зьбег, бягля́к, уцяка́ч
бегло — шпа́рка, мяльком
беглость — шпа́ркасьць, спры́тнасьць
беглый — **1.** шпа́ркі, спры́тны; **2.** зьбе́глы, уце́клы
беглый звук — выпадны́ гук гр.-л. т.
бросить беглый взгляд — скі́нуць вокам
беглянка — уцяка́чка
бегом — бягом, бе́гма, наўце́кі
бегом удирать — хадала́ дава́ць В. кр. сл.
беготня — беганіна
бегство — уце́кі
обратиться в бегство — пусьці́цца наўце́кі
беда — бяда́; бядота, лі́ха, злы́дні
на беду — на лі́ху гадзіну
как на беду — як на лі́ха
беды не избежишь — ад лі́ха не ўцячэш
беду навлечь — накліка́ць бяду́
наделать бед — натвары́ць шкоды
помочь в беде — вы́ратаваць з бяды́
беднеть — бяднне́ць, гале́ць, мізарне́ць
бедниться — скнарыцца
бедность — бе́днасьць, убоства, бабы́льства
беднота — галота, бяднота
бедный — бе́дны, мізэрны, убогі, маламожны, незаможны
бедный год — ліхале́цьце
бедняга — небара́ка
бедняк — бе́дны, бядна́к, галы́ш, худа́к, злы́дзень, бядну́ля
бедовать — бедава́ць, бедкава́ць
бедовый — адва́жны
бедокур — шкоднік, зброднік
бедокурить — шкодзіць, збродзіць
бедренец — *бот.* (*Pimpinella L.*) бядрынец б. т., ядранец, дзя́гель
бедренный — бядровы ан. т.
бедро — *анат.* (*femur*) бядры́ца ан. т., кульша́ В. кр. сл.
бедро — сьцягно, ля́жка
бедственный — нешчасьлі́вы, нэндзны
бедственное положение — нэндза
бедствие — лі́ха, ліха́я гадзі́на
бедствие испытать — перажы́ць (прыня́ць) бяду́
бедствовать — бедкава́ць, гарава́ць
бежать — бе́гчы, уцяка́ць
беженец — уцяка́ч
беженка — уцяка́чка
без — без; (*перед ударением*) бяз; (*при ассимиляции*) бес-, бяс-
без памяти — у няпрытомнасьці
без толку — бяз сэнсу, бяз ла́ду
безалаберно — бяз ла́ду, без пара́дку
безалаберность — бязла́дзьдзе, непара́дак
безалаберный — бяз ла́ду, неразва́жны, нядба́лы, бесклапотны
безбедно — з даста́ткам, заможна
безбедность — заможнасьць
безбедный — заможны; бязны́дны Шп.
безбелковый: безбелковые семена — бязьбе́левае насе́ньне б. т.
безбожие — бязбожжа, бязбожнасьць
безбожник — бязбожнік
безбожница — бязбожніца
безбожный — бязбожны
безболезненно — бяз болю, безбале́сна
безболезненность — безбале́снасьць
безболезненный — безбале́сны, бязбольны
безбородый — безбародзька
безбоязненно — бязбоязна, бяз стра́ху
безбоязненность — бязбоязнасьць, адва́га
безбоязненный — бязбоязны, бязбоязкі, адва́жны
безбрачно — бяз шлю́бу
безбрачный — нежана́ты, не́жань; кавале́р Я. Кол.
безбрежно — бяз кра́ю, бязьме́жна
безбрежность — бяскра́йнасьць, бязьме́жнасьць
безбрежный — бяскра́йны, бязьме́жны
безбровый — галабровы
безверие — няве́ра, бязьве́рыца
безвершинник — (*лес*) безьверхавіньнік лс. т.
безвестно — бяз ве́сьці, невядома
безветренный — ці́хі, за́ці́шны
безветрие — ці́ша, заці́шша, ціхме́нь
безвинно — непавінна, задарма́
безвинность — непавіннасьць
безвинный — непавінны

безвкусие — не́смак, нясма́чнасьць; бязгустоўнасьць
безвкусный — бяз сма́ку, нясма́чны; бязгустоўны
безвлажный — вольны ад ві́льгаці, сухі́
безвластие — бязула́дзьдзе, бязура́дзьдзе
безвластный — бязула́дны
безводность — бязводзьдзе
безводный — бязводны
безводный — бязводны
безводный овраг — сухадол
безвозбранно — без забароны, без перашкоды
безвозбранность — бесьперашкоднасьць
безвозбранный — бесьперашкодны
безвозвратно — без звароту, беспаваротна
безвозвратный — беззваротны, беспаваротны, неўзваротны
безвоздушный — беспаве́траны
безвозмездно — дарма́, дарэмна
безвозмездный — дармовы, дармавы́, дарэмны
безволосый — безвалосы, лы́сы, галамоўза
безвредно — ня шкодзіць, ня ва́дзіць
безвредность — няшкоднасьць, бязва́днасьць
безвредный — няшкодны, бязва́дны
безвременно — без пары́, бяз ча́су, ня ў час
безвременный — бясча́сны, няўча́сны
безвременье — ліхале́цьце, ліха́я гадзі́на, няшча́сьце
безвыгодно — некары́сна, нявыгодна
безвыездно — бяз вы́езду
безвыходно — нявыходна, бяз вы́лазу
безвыходный — нявыходны, беспара́дны
безглавый — безгаловы
безгласно — безгалосна, бяз голасу, моўчкі
безгласный — безгалосы, маўкліві
безгодье — ліхале́цьце
безграмотно — няпісьме́нна, нягра́матна
безграмотность — няпісьме́ннасьць, нягра́матнасьць, цямнота
безгранично — бязьме́жна, бяскра́йна, бяз кра́ю
безграничность — бязьме́жнасьць, бяскра́йнасьць
безграничный — бязьме́жны, бяскра́йны
безгрешно — бязгрэшна, чы́ста
безгрешность — бязгрэшнасьць
безгрешный — бязгрэшны
безгривый — бязгры́вы
бездарно — бяз та́ленту, нязда́тна, няздольна
бездарность — бестале́нтнасьць, нязда́тнасьць, няздольнасьць
бездарный — бестале́нтны, нязда́тны, няздольны
бездейственно — бязьдзе́йна
бездейственный — бязьдзе́йны, нячы́нны
бездействие — бязьдзе́йнасьць, нячы́ннасьць
бездействовать — бязьдзе́яць, ня дзе́яць, не працава́ць
безделица — драбні́ца, дробязь
безделушка — за́баўка, ца́цка
безделье — нячы́ннасьць, гу́лі, гульта́йства
бездельник — гульта́й, абібок, лайда́к, бры́нда, лабатрос, латру́га
бездельница — гульта́йка, бры́нда, латру́га
бездельничать — гуля́ць, латрава́ць, бры́нды біць, лайдакава́ць, гультая́ва́ць; дындрава́ць Шп., бі́бікі біць
безденежно — бяз грошай
безденежность, безденежье — безграшоўе
безденежный — безграшовы, дармовы (дармавы́), дарэмны
бездетность — бязьдзе́тнасьць
бездетный — бязьдзе́тны; бязьдзе́тнік
бездетная — *суц.* бязьдзе́туха
бездна — бяздоньне, прорва
бездождие — су́ша, сухме́нь, бяздожджыца
бездоказательно — бяз довадаў
бездоказательность — бяздоваднасьць
бездоказательный — бяздовадны
бездолье — нядоля, бяздольле
бездольный — бесталáнны, бясшча́сны, бяздольны
бездомник — бяздомак, бесхаці́нец Я. Куп., туля́га
бездомный — бяздомны, бясха́тні
бездорожье — бе́здараж *ж.*, бездарожжа
бездоходность — беспрыбытковасьць
бездоходный — беспрыбытковы, нязыскоўны
бездушие — бязду́шнасьць, нячу́ласьць
бездушно — бязду́шна, нячу́ла
бездушный — бязду́шны, нячу́лы
безжалостно — бязьлі́тасна, бязжа́ласьліва
безжалостный — бязьлі́тасны, бязжа́ласьлівы
безжизненность — амярцьве́ласьць, струпяне́ласьць, няжыцьцёвасьць
безжизненный — амярцьве́лы, струпяне́лы, нячу́лы, няжыцьцёвы

Б

Б

беззаботно — бяз клопату, бяз турбот, нядба́ла, бязрупотна
беззаботность — бесклапотнасьць, бязрупотнасьць, нядба́ласьць
беззаботный — бесклапотны, бязрупотны, нядба́лы
беззаветно — шчы́ра, з цэлаю душою
беззавистно — бяз за́йздрасьці
беззавистный — незайздросны
беззаконие — беззаконнасьць
беззаконник — беззаконьнік
беззаконница — беззаконьніца
беззаконничать — пераступа́ць закон
беззаконный — беззаконны, няпра́ўны
беззапретный — незабаронены
беззастенчиво — бяз сораму, наха́бна
беззастенчивость — бессаромнасьць (бяссорамнасьць)
беззастенчивый — бессаромны (бяссорамны), наха́бны
беззащитно — безбаронна, без абароны
беззащитность — безбароннасьць
беззащитный — безбаронны
беззвёздный — бяззорны, хма́рны
беззвучно — бяз голасу
безземелье, безземельность — безьзяме́льле, безьзяме́льнасьць
безземельный — безьзяме́льны
беззубки — *зоол.* (*Anodonta*) начовачкі з. т., бяззу́бкі
безладица — бязла́дзьдзе, нелады́
безлесица — бязьле́сіца, галале́сіца
безлесный — бязьле́сы
безличный — безасабовы
безличное предложение — безасабовы сказ
безлошадный — бясконны
безльготно — бязьльготна
безлюдить — бязьлю́дзіць, вылюдня́ць
безлюдно — бязьлю́дна
безлюдный — бязьлю́дны
безмен — бязьме́н, ка́нтар
безмерно — непаме́рна, бязьме́рна, бяз ме́ры
безмерность — непаме́рнасьць, бязьме́рнасьць
безмерный — непаме́рны, бязьме́рны
безмозглый — без мазгоў, бязглу́зды, дурны́
безмолвие — ці́ша, ці́шыня́
безмолвно — моўчкі, ці́ха
безмолвный — бязмоўны, нямы́, ці́хі, маўкліві
безмятежно — супакойна, ціхамі́рна
безмятежность — супакойнасьць, ціхамі́рнасьць
безмятежный — супакойны, ціхамі́рны
безнадёжно — безнадзе́йна
безнадёжность — безнадзе́йнасьць
безнадёжный — безнадзе́йны
безнадобный — непатрэбны
безнаказанно — бяска́рна, бескара́на
безнаказанность — бяска́рнасьць
безнаказанный — бяска́рны
безнамеренно — без наме́ру, ненаўмы́сьля, бязумы́сна
безначалие — бязура́дзьдзе, бязура́днасьць, безгалоўе
безначальный — без пача́тку, адве́чны, спрадве́чны
безногий — бязногі
безносый — бязносы
безнравственно — нясумле́нна, неабыча́йна л. т., няпры́кла́дна, распу́сна
безнравственность — нясумле́ннасьць, распу́ста
безнравственный — нясумле́нны, неабыча́йны, немара́льны, распу́сны
безобидно — бяз кры́ўды, бяскры́ўдна, бязура́зна
безобидность — бяскры́ўднасьць, бязура́знасьць
безобидный — бяскры́ўдны, бязура́зны
безоблачно — бяз хмар, бясхма́рна, я́сна, пагодліва
безоблачный — бясхма́рны, я́сны, пагодлівы
безобразие — брыдота пс.-л. т., бры́дасьць; няпрыстойнасьць; гідота; непара́дак
безобразить, безобразничать — бры́дзіць, гі́дзіць, дурэць
безобразник / безобразница — брыда́, брыдота
безобра́зно — бры́дка, гі́дка; няпрыстойна
безобра́зный — бры́дкі, гі́дкі; няпрыстойны
безо́бразный — бязвы́глядны
безопасно — бясьпе́чна, у бясьпе́цы
безопасность — бясьпе́чнасьць, бясьпе́ка
безопасный — бясьпе́чны
безоружный — бяззбройны
безосновательно — без падста́вы, бяз дай прычы́ны
безосновательность — беспадста́ўнасьць, бязгрунтоўнасьць
безосновательный — беспадста́ўны, бязгрунтоўны

безостановочно — без перапы́нку, бязупы́нна
безостановочность — бязупы́ннасьць
безостановочный — бязупы́нны
безотбойно — без адбою, неадчэпна
безотбойный — неадчэпны
безответно — без адка́зу
безответность — безадка́знасьць
безответный — безадка́зны
безответственно — безадпаве́дна; без адка́знасьці
безответственный — безадпаве́дны, безадпавяда́льны; неадка́зны
безотвязно — неадчэпна
безотвязный — неадчэпны
безотговорочно — безадмоўна
безотговорочный — безадмоўны
безотлагательно — без адкла́ду, безадкла́дна, неадкла́дна, неадвалочна; пі́льна
безотлагательность — безадкла́днасьць, неадкла́днасьць, пі́льнасьць
безотлагательный — безадкла́дны, неадкла́дны, неадвалочны, кане́чна патрэбны, пі́льны
безотлучно — без адлу́чкі, без адходу
безотлучный — безадлу́чны, безадходны, неадсту́пны
безотменно / безотменный — бяз зьме́ны
безотносительность — безадноснасьць
безотносительный — безадносны
безотплатный — без адпла́ты, нявы́платны
безотрадно — бязра́дасна, беспаце́шна, беспатольна, безадхла́нна, сму́тна
безотрадный — бязра́дасны, беспаце́шны, беспатольны, безадхла́нны, сму́тны, пры́кры
безотрадное чувство — не́марасьць
безотступно — неадсту́пна, неадчэпна
безотступный — неадсту́пны, неадчэпны
безотчётно — несьвядома; безрахýбна, на ве́ру
безотчётность — **1.** несьвядомасьць; **2.** безрахýбнасьць
безотчётный — **1.** несьвядомы; **2.** безрахýбны
безошибочно — без абмы́лак, неабмы́льна, без памы́лак, непамы́льна, бясхі́бна, безаблу́дна
безошибочность — непамы́льнасьць, непахі́бнасьць
безошибочный — непамы́льны, непахі́бны
безработица — беспрацоўе; безрабоцьце
безработный — бяз пра́цы, беспрацоўны; безработны, бяспра́цны
безразборчивость — неперабо́рлівасьць
безразборчивый — неперабо́рлівы
безраздельно — без падзе́лу, непадзе́льна
безраздельность — непадзе́льнасьць
безраздельный — непадзе́льны
безразличие — адна́кавасьць, абыя́касьць
безразлично — адна́кава, абыя́ка
безразличный — адна́кавы, абыя́кі
безрассудно — без разва́гі, неразва́жна, бязглу́зда
безрассудность, безрассудство — неразва́жнасьць, бязглу́здасьць
безрассудный — неразва́жны, бязглу́зды
безрасчётливо — безрахýбна
безрогий — бязрогі
безродный — бязродны
безропотно — пакорліва, не нарака́ючы
безропотный — пакорлівы, ненароклівы
безрукавка — каба́т
безрукавный — без рукавоў, бязрука́вы
безрукий — бязру́кі
безрыбный — бязры́бны
безрыбье — бязры́бʼе
безубыточно — бясстра́тна, бяз шко́ды
безубыточность — бясстра́тнасьць
безубыточный — бясстра́тны
безударный — (*звук*) гук бяз на́ціску, ненаціскны́ гук
безудержный — нястрыма́ны
без удержу — бязупы́ну, нястрыма́на
безукоризненно — беззага́нна, безгане́бна, бездакорна
безукоризненность — беззага́ннасьць, безгане́бнасьць, бездакорнасьць
безукоризненный — беззага́нны, безгане́бны, бездакорны
безумец — вар'я́т, шалёны, дурны́
безумие — шал, шале́нства, ду́расьць, вар'я́цтва
безумно — шалёна, бяз розуму
безумный — шалёны, кру́чаны, вар'я́т
безумолчно — бязусьці́шна, нясьціха́на
безумолчный — нясьціха́ны
безупречно — бяз га́ньбы, безгане́бна, беззава́дна, беззага́нна
безупречность — безгане́бнасьць, беззага́насьць, беззава́днасьць
безупречный — безгане́бны, беззага́нны, беззава́дны
безурядица — бязла́дзіца, няла́д, не́лад
безусловно — бязумо́ўна
безусловность — бязумо́ўнасьць

Б

безусловный — бязумоўны
безуспешно — без пасьпе́ху, бяз вы́ніку, дарэмна
безустанный — бязуста́нны
безусый — бязву́сы, галаву́сы
безутешно — беспаце́шна
безутешный — беспаце́шны
безухий — бязву́хі
безучастие — бязува́жнасьць, бязува́жлівасьць, неспага́длівасьць
безучастный — бязува́жны, неспага́длівы
безъязычный — безьязы́кі
безымянный — бязыме́нны
безымянный палец — персьцяне́ц ан. т. па́лец бязыме́нны
безыскусственный — няшту́чны, просты, натура́льны
безысходность — бязвыходнасьць
безысходный — бязвыходны
бекас — бака́с, бара́нчык, пе́кур
бекеша — казачы́на; бяке́ша
белемнит — бэлемні́т, пяруновы стрэлы г.-м. т., чортаў па́лец
белена — *бот.* (*Hyoscyamus niger L.*) блёкат, дурнап'я́н
беление — бяле́ньне
белесоватый — бяля́сы, бяля́сты
белеть, белеться — бяле́ць
белиберда — лу́хта́
белиберду говорить — гавары́ць на вей ве́цер, плявузгаць, ла́пці пле́сьці
белизна — белата́
белила — пабе́л, бель, пабе́ла
белильщик — бяля́р
белить — бяліць, пабяля́ць
беличий — вавёрачы
белка — вавёрка; скаку́шка В. кр. сл.
белковина — белкавіна
белковый — бялковы, бе́левы
белковое вещество — бялковая матэрыя
белковые семена — бе́левае насе́ньне б. т.
беллетрист — бэлетры́сты
беллетристика — бэлетры́стыка, кра́снае пісьме́нства
беллетристический — бэлетрысты́чны
белобокий — белабокі; (*о воле*) падла́сы
белобородый — сівабароды
белобровый — сівабровы
белобрюхий — белапу́зы, падла́сы
Беловеж — *г.* Белаве́ж
беловолосый — белавалосы, сівы́
белоглазка — *зоол.* (*Abramis sapa. Pallas*) лешч белавокі з. т., белавочка
белоглазый — белавокі, белазоры
белогривый — белагры́вы
белогрудый — белагру́ды
Белое море — Бе́лае мора
белозор — *бот.* (*Parnassia Tourn.*) відомец б. т.
белок — бялок
белок семени — насе́нная бель б. т.
белокаменный — белакаме́нны, беламу́ры
белокрыльник — *бот.* (*Calla L.*) белакапы́тнік б. т.; (*Calla palustris L.*) какошнік, гу́ска В.кр. сл.
белокурый — бяля́вы
белокурая — бяля́нка
белолицый — белатва́ры
беломошник — беламшэньнік лс. т.
белоножка — беланожка
белорус — белару́с, крывіч, крывіча́нін
белоруска — белару́ска, крывіча́нка
Белоруссия — Белару́сь, Бе́лая Русь, Кры́вія
белорусский — белару́скі, крывіцкі, кры́ўскі
белоручка — белару́чка, пяшчотка, гуля́шчыя ру́кі
белорыбица — белары́біца
белоснежный — беласьне́жны
Белосток — *г.* Беласток
белотелый — з бе́лым це́лам
белоус — *бот.* (*Nardus L.*) сіве́ц
белоусый — сівавусы
белошвейка — шва́чка, белашва́чка
белошвейная мастерская — майстэрня бялі́зны
белый — бе́лы
белая раса — бе́лая ра́са
бел как лунь — сівы́ як голуб
белуха — *зоол.* (*Delphinapterus*) бялу́ха
Белый — *г.* Бе́лы
бельгиец — бэльгі́ец
бельгийский — бэльгі́йскі
Бельгия — Бэльгія
бельё — бялі́зна, пла́цьце, ху́сьце
бельевой: бельевой магазин — кра́ма бялі́зны
бельмо — бяльмо
бельэтаж — пе́ршы паве́рх
беляк — бяля́к (бе́лы за́яц)
бенефис — бэнэфі́с
бенефисный — бэнэфі́сны
бензол — *хим.* бэнзо́л
бензоловый — бэнзо́лавы

бентос — паўздоньне г.-к. т.
берег — бе́раг, край, бок
берег отлогий — бе́раг адхонны
берег обрывистый — бе́раг зры́вісты г.-к. т.; узва́льле В. кр. сл.
идти вдоль по берегу — бе́рагам ісьці́
береговой — берагавы́, узьбярэжны, надбярэжны
береговая охрана — берагава́я старожа (ва́рта)
бередить — ураżáць, я́трыць
бережение — хава́ньне, ашча́да
бережком — крайком, бераżком
бережливо — ашча́дна
бережливость — ашча́днасьць, запа́сьлівасьць
бережливый — ашча́дны, эканомны
бережно — асьцярожна, паволі
бережок — бераżок
берёза — бяроза
берёза карельская — чачотка
Березина — *р.* Бяроза
березник, березняк — бераза́к, беразьня́к, бярэзьнік
берёзовик — (*гриб*) аба́бак, падасі́навік
березовина, березовица — бярозавік, бярозавы сок
берёзовый — бярозавы
берёзовый сок — *см.* **березовина**
берейтор — *воен.* аб'яжджа́чы Пр. в. сл.
беременеть — чарава́цець, цяжэць
беременная — (*о женщине*) чарава́тая, пуза́тая, цяжа́рная; (*о кобыле*) жарэбная; (*о корове*) це́льная; (*о свинье*) парасная
беременность — чарава́тасьць, цяжа́рнасьць
ходить в последние дни беременности — хадзі́ць на часа́х
быть беременной — быць уцяжку́
бересклет — *бот.* (*Euonymus L.*) брызьлі́на, бражджэ́ліна
берест — *бот.* (*Ulmus suberosa L.*) бе́раст
береста — бяроста
берестень, берестник — берасьце́нь
берёстовый — бяроставы, берасьця́ны
берёстовая сумка — вярэнька
беречь — сьцерагчы́, пільнава́ць
беречься — сьцерагчы́ся, высьцерага́цца, пільнава́цца
берилл — смара́гд, бэры́л
Берлин — *г.* Бэрлі́н
берлинец — бэрлі́нец
берлога — бярлог *м.*; мярлога, лагво
берцо — галёнка
бес — чорт, ша́тан, бес, нячы́сты, нячы́сьцік
рассыпается мелким бесом — аж сьце́лецца
беседа — размова, гу́тарка, гамонка
беседка — альта́нка
беседовать — гу́тарыць, гаманіць, размаўля́ць, зюзю́каць
бесёнок — чарцяня́
беситься — шале́ць
бесконечно — бясконца, без канца́, бяз кра́ю, век вяком
бесконечность — бясконцасьць
бесконечный — бясконцы, несканчоны
бескорыстно — без інтарэсу, некары́сьліва
бескорыстный — бескарыстоўны, некары́сьлівы
бескостный — бяскосты
бескровный — бяскроўны
бесноватый — шалёны
беснова́ться — шале́ць, вар'ява́цца
бесовский — чартоўскі, шата́нскі, д'я́бальскі (дзья́бальскі, дзья́вальскі)
беспалый — бяспа́льцы, куцапа́л, ку́кса
беспамятливый, беспамятный — бяспа́мятны, запамята́лы, няпрытомны
беспамятство, беспамятье — бяспа́мяцьце, запа́мятаньне, няпрытомнасьць
беспардонный — наха́бны, бесцырамонны
беспарный — няпа́рны, няцотны
беспартийный — беспарты́йны
беспаспортный — бяз па́шпарту, бязьбіле́тны
беспечально — бяз сму́тку
беспечальный — нясму́тны, няжурбліві
беспечно — бяз клопату, нерупатліва, нядба́йна
беспечность — бесклапотнасьць, нерупатлівасьць, нядба́йнасьць, нядба́льства
беспечный — бесклапотны, нерупатлівы, нядба́йны, нядба́лы
бесплатно — бяспла́тна, дарма́
бесплатность — бяспла́тнасьць, дармовасьць, дарэмшчына
бесплатный — бяспла́тны, дармавы́, дармовы, дарэмны
бесплодие, бесплодность — бясплоднасьць, няплоднасьць, неўрадлівасьць, я́лавасьць, не́пладзь
бесплодно — бясплодна, неўрадліва, дарма́, на дурні́цу
бесплодный — бясплодны, няплодны, неўрадлівы; дарэмны

Б

Б

бесповоротно — *см.* **безвозвратно**
бесповоротный — *см.* **безвозвратный**
бесподобно — непараўна́на, бяз пры́кла́ду
бесподобный — непараўна́ны, бяспры́кла́дны
беспозвоночные — бясхрыбтовыя
беспокоить — непакоіць, трывожыць, клапаціць, фатыгава́ць
беспокойно — непакойна, трывожна, клапатлі́ва
беспокойный — непакойны, трывожны, клапатлі́вы
беспокойство — непакой, турбота, клопат, фаты́га, калатня́
бесполезно — без кары́сьці, некары́сна, непажы́тачна
бесполезность — некары́снасьць
бесполезный — некары́сны, непажы́тачны
беспомощно — бяспомачна, без пара́ды
беспомощность — бяспомачнасьць, беспара́днасьць
беспомощный — бяспомачны, беспара́дны
беспорочно — бязва́дна, беззага́нна
беспорочность — бязва́днасьць, беззага́насьць
беспорочный — бязва́дны, беззага́нны
беспорядок — непара́дак, бязла́дзьдзе; гармі́дар, не́лад (ня́ла́д), разгардзія́ш
беспорядочный — бязла́дны
беспосредственно — беспасярэдна, проста
беспосредственность — беспасярэднасьць
беспосредственный — беспасярэдны, просты
беспотомственный — беспатомны, бязьдзе́тны
беспочвенно — бязгрунтоўна, без падста́вы
беспочвенность — бязгрунтоўнасьць, беспадста́ўнасьць
беспочвенный — бязгрунтоўны, беспадста́ўны
беспошлинный — бязмы́тны
беспощадно — бяз лі́тасьці, бязьлі́тасна, бязжа́ласьліва
беспощадность — бязьлі́таснасьць, бязжа́ласьлі́васьць
беспощадный — бязьлі́тасны, бязжа́ласьлі́вы
бесправие, бесправность — бяспра́ўе, бяспра́ўнасьць
бесправный — бяспра́ўны
беспредельно — бязьме́жна, бяскра́йна, бясконца, бяз кра́ю
беспредельность — бязьме́жнасьць, бяскра́йнасьць, бясконцасьць
беспредельный — бязьме́жны, бяскра́йны, бясконцы
беспрекословно — без пярэчаньня, бесьпярэчна, бяз спрэчкі
беспрекословный — бесьпярэчны
беспрепятственно — без перашкоды, бесьперашкодна
беспрепятственный — бесьперашкодны
беспрерывно — бязупы́нна, неперары́ўна, без пярэрвы
беспрерывность — бязупы́ннасьць, неперары́ўнасьць
беспрерывный — бязупы́нны, неперары́ўны
беспрестанно — без перастáнку, не пераставáючы
бесприбыльно — бяз прыбы́тку, бяз зы́ску, бескары́сна
бесприбыльный — беспрыбытковы, нязыскоўны, бескары́сны, непажы́тачны
беспризорно — без назору, без дагля́ду, бяспры́тульна
беспризорность — безназорнасьць, бяспры́тульнасьць
беспризорный — безназорны, бяспры́тульны
беспримерно — бяз пры́кла́ду, бяспры́кла́дна
беспримерность — бяспры́кла́днасьць, нячува́насьць
беспримерный — бяспры́кла́дны, нячува́ны
беспристрастно — бесстаронна
беспристрастность — бесстароннасьць
беспристрастный — бесстаронны
беспритворно — шчы́ра
беспричинно — бяз прычы́ны, бяспрычы́нна, бяз дай прычы́ны, няслу́шна, нізашто
беспричинность — бяспрычы́ннасьць
беспричинный — бяспрычы́нны
бесприютно — бяз прыту́лку, бяспрыту́льна
бесприютность — бяспрыту́льнасьць
бесприютный — бяспрыту́льны
беспробудно — бяз проспы
беспроцентный — бяспроцантавы
беспутица — бе́здараж *ж.*, бездарожжа
беспутник — распу́сьнік, аблу́днік, лайда́к, гульта́й
беспутный — распу́сны, аблу́дны, гульта́йскі
беспутство — распу́ста, аблу́да, гульта́йства
Бессарабия — Басара́бія
бессарабский — басара́бскі
бессарабский табак — басара́б
бессвязно — бяз су́вязі, няскла́дна, бяз ла́ду

бессвязность — няскла́днасьць
бессвязный — няскла́дны
бессердечие — неміласэрдзе, лю́тасьць, бязьлі́таснасьць, жорсткасьць
бессердечно — бяз лі́тасьці, неміласэрна, лю́та, жорстка
бессердечный — бязьлі́тасны, неміласэрны, лю́ты, жорсткі
бессилие — нязмога, нядо́ўжасьць, бясьсі́льле, нясі́ла
бессильный — слабы́, няможны, нядо́ўжы, бясьсі́льны
бессистемно — бяз сыстэмы
бессистемный — бяссыстэмны
бессквáжный — шчы́льны
бесславие — нясла́ва, га́ньба
бесславить — нясла́віць, га́ньбіць, аслаўля́ць, зьнеслаўля́ць
бесславно — нясла́ўна, гане́бна
бесславный — нясла́ўны, гане́бны
бесследно — бяз сьле́ду
бессловесно — бяз слоў, бязмоўна
бессловесный — бязмоўны
бессменно — нязьме́нна, бяз зьме́ны
бессменность — нязьме́ннасьць
бессменный — нязьме́нны
бессмертие — няўміру́шчасьць, несьмяротнасьць
бессмертник — *бот.* (*Centauria*) сухацьве́т
бессмертный — няўміру́шчы, несьмяротны
бессметный — нязьлі́чоны; бескаштары́сны
бессмысленно — бяз сэнсу
бессмысленность — бяссэнсо́ўнасьць, недарэчнасьць
бессмысленный — бяссэнсо́ўны, бязглу́зды, безгаловы, недарэчны
бессмыслица — бяссэнсіца, бязглу́зьдзіца
бесснежный — бясьсьне́жны
бессовестно — бяз сумле́ньня, нясумле́нна, бяссовесна, несправядлі́ва
бессовестность — нясумле́ннасьць, бяссовеснасьць, несправядлі́васьць
бессовестный — нясумле́нны, бяссовесны, несправядлі́вы
бессодержательно / бессодержательный — бяз зьме́сту
бессознательно — несьвядома, няпрытомна
бессознательность — несьвядомасьць, няпрытомнасьць
бессознательный — несьвядомы, няпрытомны
бессолнечный — бяссонечны
бессомненно — бяссумне́нна, пэ́ўна
бессомненность — бяссумне́ннасьць, пэ́ўнасьць
бессомненный — бяссумне́нны, пэ́ўны
бессонница — бяссоньне, бяссоннасьць
напала бессонница — сон не бярэ
бессонный — бяссонны
бессословный — бясста́навы
бесспорно — бясспрэчна, пэ́ўна
бесспорность — бясспрэчнасьць, пэ́ўнасьць
бесспорный — бясспрэчны, пэ́ўны
бессребренник — бяссрэбнік
бессребренница — бяссрэбніца
бессрочно — бяз тэрміну, на неазна́чаны час
бессрочный — бестэрмі́новы
бесстрастно — бяз па́лу, нячу́ла, абыя́ка
бесстрастный — няпа́лкі, нячу́лы, абыя́кі
бесстрашие — бязбоязнасьць, бязбоязкасьць, адва́га
бесстрашно — бяз стра́ху, бяз боязьні, бязбоязна, адва́жна
бесстрашный — бязбоязны, адва́жны
бесструнный — бясстру́нны
бесстыдник — сарамні́к, сарамотнік, бясстыднік
бесстыдница — сарамні́ца, бясстыдніца
бесстыдно — бяз сораму
бесстыдный — бяссорамны (бессаромны), нясумле́нны
бесстыдство — бяссорамнасьць (бессаромнасьць)
бессчётно — бяз лі́ку
бессчётный — нязьлі́чоны
бессчётное количество — бе́зьлі́ч
бестактно — бяз та́кту, нетактоўна
бестактность — нетактоўнасьць
бестактный — нетактоўны
бесталанность — бяздольнасьць
бесталанный — бяздольны; бяздольнік, недарэка
бестелесный — бясьце́лы
бестия — бэстыя
бестолково — бяз сэнсу, без мазгоў, тлу́мна, на дурні́цу
бестолковщина — бяссэнсіца, бязглу́зьдзіца, бязла́дзьдзе
бестолковый — бязглу́зды, бязмозглы, доўбня, шалапу́т, дурнагаловы, ду́рань, тлу́мны
бестрепетно — бяз стра́ху, бязбоязна, непалахліва
бестрепетный — сьме́лы, бязбоязны, непалахлівы

Б

Б

бесформенный — бязвы́глядны, нязгра́бны
бесхарактерность — бязвольнасьць, брак хара́ктару
бесхарактерный — бязвольны, нясто́лы, няцьвёрды
бесхвостый — бясхвосты, ку́цы, курду́пы
бесхитростно — бяз хі́трыкаў, простаду́шна (прастаду́шна), шчы́ра
бесхитростный — няхі́тры, простаду́шны (прастаду́шны), просты
бесхлебный — бясхле́бны, неўрадлі́вы
бесхлопотно — бяз клопату
бесхозяйственность — безгаспада́рнасьць
бесхозяйственный — безгаспада́рны, негаспада́рны
бесцветность — бескаляровасьць
бесцветный — бескаляровы
бесцельно — бяз мэты, не да мэты
бесцельный — бязмэтны
бесценность — нява́ртасьць; неацэненасьць
бесценный — **1.** нічога ня вартый; **2.** неацэнены, дарагі́; **3.** каха́ны, лю́бы
бесценная посылка — пасы́лка без цаны́
бесцеремонно — наха́бна, бесцырамонна
бесцеремонность — наха́бнасьць, бесцырамо́ннасьць
бесцеремонный — наха́бны, бесцырамонны
бесчеловечно — не па-лю́дзку, лю́та
бесчеловечность — нялю́дзкасьць, лю́тасьць
бесчеловечный — нялю́дзкі, лю́ты
бесчерепной — *зоол.* бесчарэпны (бесчарапны́)
бесчестие — зьнява́га, га́ньба, бясчэсьце, нясла́ва
бесчестить — зьневажа́ць, га́ньбіць, бясчэсьціць, нясла́віць
бесчестно — гане́бна, непачэсна
бесчестный — гане́бны, непачэсны
бесчинный — свавольны
бесчинство — сваволя, непара́дак, не́лад (нялад), буя́нства
бесчинствовать — буя́ніць, сваволіць
бесчисленно — бяз лі́ку, нязьлічона
бесчисленность — бе́зьліч
бесчисленный — нязьлічоны, нязьме́рны
бесчисленное количество — бе́зьліч
бесчувственно — нячу́ла
бесчувственность — нячу́ласьць, няпрытомнасьць
бесчувственный — нячу́лы, няпрытомны; жорсткі
бесчувственное состояние — няпрытомнасьць
бетон — бэто́н
бетонный — бэто́нны
бечева — лі́на, гру́ба́я вяроўка
бечевание — тралява́ньне
бечевать — тралява́ць
бечёвка — лі́нка, вяроўка, матузок, шнур
бечёвщик — траляўні́к, бурла́к
бешено — шалёна
бешенство — шал, шале́нства
бешеный — шалёны, кру́чаны, ашале́лы
библейский — библі́йны, библе́йны
библиограф — кнігапісец л. т.
библиографический — кнігапісны
библиография — кнігапіс
библиотека — бібліятэка, кні́жніца, кні́жня
библиотекарь — бібліятэкар, кніга́р
библиотечный — бібліятэчны
библия — бі́бліі
бивень — клык
бивуак — біва́к
бивуачный — біва́чны
биение — біцьцё, сту́каньне; ты́хканьне (*сэрца*)
бизон — бізон
билет — біле́т, ка́ртка, квіток
билетик — біле́цік
билионный — більённы
биллион — більён
бильярд — білья́рд (біліярд)
бильярдный — білья́рдны (біліярдны)
бинокль — бінокаль (бінокль)
бином — біном, двохчле́н м. т.
бинт — бінт, павіва́ч
бинтовать — бінтава́ць, павіва́ць
биограф — жыцьцяпісец л. т.
биографический — жыцьцяпісны л. т.
биография — жыцьцяпіс л. т.
биолог — біялёг
биологический — біялягі́чны
биология — біялёгія
биржа — бі́ржа
биржевик — біржавік
биржевой — біржавы́
бирка — бі́рка
бирковать — біркава́ць, карбава́ць
бирюза — біруза́
бирюк — бірук, воўк
бисер — бісэр, па́церкі
биссектриса — роўнасе́чная м. т.

битва — бітва́, бой, бойка
битком — бітма́, піхом
биток — бі́тка
битый — бі́ты
бить — біць; (*хлыстом*) лупцава́ць, хля́ста́ць; (*кистью руки*) тропаць
бить баклуши — бры́нды біць, бі́бікі біць
бить челом — чаломкаць
биться — бі́цца, змага́цца, бораца
биться лбом — бу́кацца
биться об заклад — закла́да́цца
сердце бьётся — сэрца ты́хкае
бифуркация — разьвіле́ньне г.-к. т.
бич — бізу́н, пу́га
бичевать — бізу́ніць, ка́тава́ць
благо — дабро
благовест — звон
Благовещение — (*праздник*) Зьвеставаньне
благовидный — прыстойны, пазорны
под благовидным предлогом — ма́ючы добры заме́р
благоволение — ла́ска, спрыя́ньне, зычлівасьць, прыхі́льнасьць
благоволение приобрести — увайсьці́ ў ла́ску
благоволить — спрыя́ць, быць ла́ска́вым, ра́чыць, зы́чыць
благовоние, благовонность — добры пах, паху́часьць
благовонный — паху́чы
благовоспитанный — добра вы́хаваны
благовременно — у свой час, у пару́, заўча́с
благоговейно — з пава́гай, з пашанай, пакорліва, пабожна
благоговейный — пабожны (набожны), пакорлівы
благоговение — пашана; пабожнасьць (набожнасьць), пакорлівасьць
благодарение — падзя́ка, дзя́каваньне, падзя́каваньне, удзя́чаньне
благодарить — дзя́каваць, падзя́каваць
благодарно — удзя́чна, з падзя́кай
благодарность — падзя́ка
благодарность приносить — аддава́ць падзя́ку; дзя́каваць
благодарственный — падзя́чны
благодатный — поўны ла́скі
благодать — ла́ска, мі́ласьць; раскоша
благоденствие — дабрабы́т, шча́сьце
благодетель — дабрадзе́й (дабродзей)
благодетельница — дабрадзе́йка
благодетельно — дабрадзе́йна
благодетельный — дабрадзе́йны
благодетельствовать — дзе́яць дабро
благодеяние — дабрадзе́йства, добры ўчы́нак
благодушие — дабраду́шнасьць, дабрасэрдасьць
благодушный — дабраду́шны, дабрасэрды
благожелание — спрыя́ньне, зычлі́васьць
благожелатель — зычлі́вец
благожелательница — зычлі́віца
благожелательный — зычлі́вы
благозвучие — мілагу́чнасьць л. т.
благозвучный — мілагу́чны л. т.
благой — добры, ла́ска́вы
благолепие — харство, украса́, аздоба
благомыслие — дабрамы́снасьць, разва́жнасьць
благомыслящий — дабрамы́сны, разва́жны
благонадёжность — надзе́йнасьць, пэ́ўнасьць
благонадёжный — надзе́йны, пэ́ўны
благонравие — абыча́йлівасьць
благонравный — абыча́йлівы
благообразный — добрай уроды, прыгожы, прыстойны
благополучие — дабрабы́т, шча́сьце, шча́снасьць
благополучно — шча́сна, шчасьліва
благополучный — шча́сны, шчасьлі́вы
благоприобретённый — нажы́ты, набы́ты (дазволеным спосабам)
благоприобретённое имущество — набы́так, нажы́так
благопристойно — прыстойна, нале́жна, пачэсна
благоприятный — спрыя́ючы, спага́дны, памы́сны
благоприятствовать — спрыя́ць, дапамага́ць
благоприятствует — *безл.* шанцу́е, годзіць
благоразумие — разва́жнасьць
благоразумно — разва́жна
благоразумный — разва́жны
благорасположение — прыхі́льнасьць, ла́ска, спага́длівасьць
благорасположенный — прыхі́льны, ла́ска́вы, зычлі́вы, спага́дны, спага́длівы
благородно — шляхе́тна, ганарова, па-шляхе́тнаму
благородный — шляхе́тны; дабрародны
благородные камни — дарагое каме́ньне

Б

Б

благородство — шляхе́тнасьць
благосклонно — з прыхі́льнасьцю, прыхі́льна, ла́ска́ва
благосклонность — прыхі́льнасьць, ла́ска́васьць, ла́ска
благосклонный — прыхі́льны, ла́ска́вы
благословение — бласла́ве́ньне, жагна́ньне, пажагна́ньне
благословенный — бласла́вёны, жагна́ны, пажагна́ны
благословлять / благословить — бласла́ўля́ць / бласла́ві́ць; жагна́ць / пажагна́ць
благосостояние — дабрабы́т, добры стан
благостыня — мі́ласьціна (мі́ласьціня), добры ўчы́нак, дабрачы́ннасьць
благотворитель — дабрачы́нец
благотворительница — дабрачы́нка
благотворительность — дабрачы́ннасьць
благотворительный — дабрачы́нны
благотворно — добра, спажы́тачна
благотворный — добры, спажы́тачны
благоугодно — лю́ба, даспадобы
благоусмотрение — воля, погляд, ла́ска́вы погляд, ла́ска
благоустроенность — дабрала́дна́сьць пр. т.
благоустроенный — добраўпара́дкаваны
благоустроить — упара́дкаваць, даць добры пара́дак
благоустройство — упара́дкаваньне, добры пара́дак
благоухание — пах, па́хашчы, добры пах
благоуханный — паху́чы
благоухать — па́хнуць
благочестиво — пабожна (набожна), цнотна, пачэсна, багабойна
благочестивый — пабожны (набожны), цнотны, багабойны
благочестие — пабожнасьць (набожнасьць); цнота, багабойнасьць
благочинно — у добрым пара́дку
блаженный — шча́сны, шчасьлі́вы
блаженство — шча́снасьць, шча́сьце, раява́ньне, рай, раскоша
блаженствовать — раскашава́ць
блажить — **1.** (*ублажать*) вялі́ча́ць, сла́віць; **2.** (*шалить*), блазнава́ць, сваволіць, дурава́ць
блажной — дурава́ты, аніякава́ты, недарэка, бла́зен
блажь — блазе́нства, блазноўства, дурота, сваволя
бланк — бля́нка
бланковый — бля́нкавы
блевание — ваніта́ва́ньне, блява́ньне
блевать, блеваться — ваніта́ва́ць, блява́ць
блевота — ваніты *мн.*
блевотина — блявоцьце, рва́кі
бледнеть — бляднёць, бялёць, мярцьвёць
бледно — блёдна, блёда
бледноватость — бледнава́тасьць
бледноватый — бледнава́ты
бледно-жёлтый — блёдна-жоўты (блёда-жоўты), палавы́
бледно-зелёный — блёдна-зялёны (блёда-зялёны)
бледнолицый — бледнатва́ры
бледно-розовый — блёдна-ружовы (блёда-ружовы)
бледность — блёднасьць, блёдасьць, зьбялёласьць
бледный — блёдны, блёды, бляды́
блёклость — бля́класьць
блёклый — бля́клы
блёкнуть — бля́кнуць, вя́нуць, марнёць
блеск — бліск, бляск, блеск, лоск, пышната́
блестение — блішчэньне, блішчані́на
блестеть — блішча́ць, бліскаць, мігцёць, зіхацёць
блёстка — бліскаўка
блестящий — бліскучы, наласка́ва́ны
блеяние — мэканьне, бэканьне, блеката́ньне, марката́ньне
блеять — мэкаць, бэкаць, блеката́ць, марката́ць
ближайший — найбліжэйшы
ближайшая дорога — цянькі́
ближний — бліскі; бліжэйшы, сусёдзкі
Ближний Восток — Бліскі Ўсход
близ — (*чего*) каля́, край, паблі́зу, вобач, вобак (*чаго*)
близёхонький — блі́зенькі
близёхонько — блі́зенька
близиться — набліжа́цца
близкий — блі́зкі, недале́кі (недалёкі), падру́чны
близлежащий — суме́жны, паме́жны
близнец — блізьню́к, блізьня́
близнецы — блізьня́ты, двайня́ты
близорукий — паніклівы, ні́зкі на вочы, недаба́члівы, бліндар, падсьлепава́ты
близорукость — паніклівасьць, нізкавокасьць, недаба́члівасьць, падсьлепава́тасьць
близость — блі́зкасьць
близь — блі́зкасьць, недале́касьць (недалёкасьць)
бликование — адсьве́чваньне х. т.

блин, блинец — блін, бліне́ц, налі́сьнік, сачэнь, але́дка, корж; (*пшеничный тонкий*) налі́сьнік; (*пресный толстый*) праснак (праснок)
блиндаж — бліндаж
блиндировать — бліндажава́ць
блинный — бліновы
блистание — бліскане́ньне, зіхаце́ньне, мігце́ньне
блистательно — бліскучча, пы́шна, сьве́тна
блистательный — бліскучы, пы́шны, сьве́тны
блистать — бліскаць, бліската́ць, зіхаце́ць, мігце́ць
блок — блёк, баранок; кружа́ла ан. т.
блокада — блякада; за́мык гр. т.
блокгауз — блякга́ўз
блокировать — блякава́ць, атача́ць / абкла́сьці
блокнот — блёкно́т
блоковый — кружа́льны ан. т.
блондин — бляві
блондинка — бляві́вая
блоха — блыха́, скочка
блошиный — блышы́ны
блошистый — блышлі́вы
блошница — *бот.* (*Pulicaria Gaert.*) уман б. т.
блуд — распу́ста, блуд
блудить — блу́дзіць, блу́каць, бахурава́ць
блудливость — блудлівасьць, сваволя, распу́ста
блудливый — блудлі́вы, свавольны, распу́сны, збродны
блудник — блу́днік, распу́сьнік, бахур, курве́ль
блудница — блу́дніца, распу́сьніца, бахурка, ку́рва
блудный — блу́дны, распу́сны
блудодей — блудадзе́йнік, распу́сьнік, курве́ль, бахур
блудодеяние, блудодейство — блудадзе́йства, курве́льства, блуд
блуждание — блуд, блука́ньне, плу́таньне
блуждать — блука́ць, блудзіць, плу́тацца
блюдечко — сподак, ісподак
блюдо — паўмісак; стра́ва, патра́ва
блюдолиз — нахле́бнік, лісьлівец, дармае́д, лізу́н
блюдолизничать — нахле́бнічаць
блюсти — хава́ць, глядзе́ць, даглада́ць, дазіра́ць
блюститель — дазорац (дазорца), даглада́ч
блюстительница — даглада́чка
бляха — бля́ха
бляхарь — бля́хар, бляша́нік
боб — *бот.* (*Vicia L.*) боб; (*плод*) стручок
боб турецкий — (*Phascolus L.*) квасоля (хвасоля)
бобр — бабёр
бобрик — бобрык
бобровый — бабровы
Бобруйск — *г.* Бабру́йск
бобруйский — бабру́йскі
Бобруйский округ — Бабру́йшчына
бобыль — баб́ыль, ку́тнік, бесхаці́нец
бобыльский — баб́ыльскі, ку́тніцкі
бог — бог
бог на помощь — памажы́ божа, памага́й бог; (*при посеве*) зарадзі́ божа; (*при веянии*) спор божа
бог вам судья — бог вас рассу́дзіць
чем бог послал — што бог даў
бога благодаря — дзя́каваць богу
боже сохрани — крый (хава́й) божа, барані́ божа, хай бог бароніць
слава богу — хваліць бога
богадельня — прыту́лак для старцоў (стары́х)
богатеть — багаце́ць, мажне́ць
богатство — бага́цьце
богатый — бага́ты, багаты́р, заможны
богатая свадьба — гу́чнае вясе́льле
богатырский: богатырский эпос — гэраі́чны эпас л. т.
богатырь — волат, асі́лак
богач — багаты́р, багаце́й, ту́мар
богачиха, богачка — багаты́рка, багаце́йка, ту́марка
Богдан — *и. соб.* Багда́н
богдыхан — багдыха́н
богиня — багі́ня; багаві́ца
богобоязненно — багабойна, багабоязна
богобоязненный — багабойны, багабоязны
боговдохновенный — натхнёны богам
богоматерь — божая ма́ці, багама́ці
богомол — *зоол.* (*Mantis religiosa L.*) багамол
богомолец — багамол
богомолка — багамоліца, багамолка
богомолье — багамольле; прошча
богомольный — багамале́нны
богородица — багародзіца
богородичный: богородичная трава — *бот.* (*Saturga L.*) чабор
богослов — багаслоў
богословие — багаслоўе
богословский — багаслоўскі
богослужение — набажэнства, царкоўная слу́жба

Б

Б

богоугодный — мілы богу
богохульник — блюзьнёр, баглáй
богохульница — блюзьнёрка
богохульный — блюзьнёрскі
богохульство — блюзьнёрства, богазьневажэ́ньне, баглáйства
Богоявление — (*праздник*) Вадохрышча, Кшчэ́ньне
Богуслав — *и. соб.* Богуш
бодать, бодаться — басьці́, басьці́ся; браць на рогі, калоць рага́мі
бодрить — асьмéльваць, дýху дадава́ць
бодро — бодра, сьмéла, адва́жна, зухлі́ва
бодрость — бодрасьць, адва́га, зухлі́васьць
бодрственно — дба́йна, дба́ла, чýйна
бодрственный — дба́йны, дба́лы, чýйны, пі́льны
бодрствование — дба́ньне, чýйнасьць
бодрствовать — дбаць, пільнава́ць, ня спаць
бодрый — бодры, сьмéлы, адва́жны, зухлі́вы
боевой — баявы́
боевой порядок — баявы́ пара́дак
боевая личинка — (*у ружья*) баявічок в. т.
боевая пружина — іглі́чная спружы́на в. т.
боёк — (*ударника*) галоўка іглі́цы в. т.
боеприпасы — баявы́я прыпа́сы в. т.
боеспособность — баява́я здольнасьць Пр. в. сл.
боец — баéц, бая́ка
божба — бажэ́ньне
боже — божа, божухна
божеский — боскі
божественность — боскасьць
божественный — боскі
божество — боства
божиться — бажы́цца, прысягáцца
божница — бажні́ца, багаўня́
бой — бой, бойка, бітва́
бой кровопролитный — крыва́вы бой
бой-баба — козыр-ба́ба
бой-девка — козыр-дзяўчы́на
бойкий — спры́тны, жва́вы, шпáркі
бойкое место — лю́днае мéсца
бойко — спры́тна, жва́ва, шпáрка
бойкость — спры́тнасьць, жва́васьць, шпáркасьць, сьмéласьць
бойница — байні́ца, бойніца
бойня — разьні́ца; крыва́вы бой
бок — бок
бок о бок — поплеч, побач, поруч
бокал — кéліх, кýхаль
боковой — бочны, прыбочны, убочны; бакавы́
боковая линия — (*родства*) стрэ́чная лі́нія
бокс — *спорт.* бокс
боксёр — баксэр
болван — балва́н, стаўбéнь, статýй, доўбня
играть с болваном в карты — гуля́ць з дзядко́м у ка́рты
болгарин — баўта́рын
Болгария — Баўта́рыя
болгарский — баўта́рскі
болдырь — баўды́р, бýрбалка
более — больш, болей, балéй, звыш, зьверх, над
более всего — больш за ўсё, больш усяго, над усё
более или менее — больш-менш
гораздо более — куды́ (далéка (далёка)) больш
всё более и более — шторáз больш
немного более — трохі больш
болезненно — балéсна
болезненность — хваравітасьць, хворасьць
болезненный — хваравіты, хворы
болезнь — хвароба; нéмач
болезнь эпидемическая — пошасьць
болезнь желёз — зáвалкі В. кр. сл.
болеть — хварэ́ць (*на што*), балéць, нядýжаць; (*периодами, слегка*) прыхва́рваць
что у кого болит, тот про то и говорит — што каму́ ру́піць, той аб тым і жу́піць
болиголов — *бот.* (*Conium L.*) амéжнік
болиголов крапчатый — амéжнік пля́місты б. т.
болотистый — балоцісты, багні́сты, імша́рысты, тванлі́вы
болотистое место — ба́гнішча
болотный — балотны, ба́гнавы
болото — балота, ба́гна; (*моховое, сфагновое*) імша́ра
болотце — (*с водой*) пéля, пéлька
болт — просва, шворань, ніт
болтание — баўта́ньне, целяпа́ньне
болтание языком — балбата́ньне, лапата́ньне
болтать — баўта́ць
болтать языком — балбата́ць, лапата́ць
болтаться — баўта́цца, целяпа́цца
болтливость — балбатлі́васьць, лапатлі́васьць, языка́тасьць
болтливый — балбатлі́вы, лапатлі́вы, языка́ты

болтовня — балбатня́, лапата́ньне, біліндра́сы
болтун, болван — **1.** (*яйцо*) баўту́н; **2.** (*человек*) болбат, балбату́н, лапату́н, тарату́н
болтунья, болтушка — балбату́ха, лапату́ха, балбату́ньня, лапату́ньня, тарату́ха
боль — боль *м.*, бале́сьць
боль под ложечкой — запа́рце
больница — бальніца
больничный — бальнічны
больно — балю́ча; ура́зьліва, прыкра, ця́жка
больной — хворы, слабы́, нядужы
больное место — хворае ме́сца
больной вопрос — востра е пыта́ньне; прыкрае пыта́ньне
быть больным — хварэць (*на што*)
большак — **1.** (*дорога*) гасьці́нец, шлях; **2.** (*старший сын*) пярва́к
большеберцовый — *анат.* вялікагалёнкавы ан. т.
большевик — бальшаві́к
большевистский — бальшаві́цкі
большевичка — бальшаві́чка
больший — большы, бале́йшы
большинство — большасьць
большой — вялі́кі, завялі́кі, здаровы
большой палец — адзіне́ц, пе́ршы па́лец ан. т. па́лец вялі́кі
большущий — бальшэнны, вялічэзны
бомба — бомба в. т., гу́ля
бомбардир — бамбардзі́р
бомбардировать — бамбардава́ць
бомбардировка — бамбардава́ньне
бомбомёт — бомбаме́т в. т.
бомбометальщик — бомбакіда́льнік в. т.
бомбометание — бомбакіда́ньне в. т.
бонбоньерка — пу́шачка
бонна — бонна
бор — бор (*мн.* бары́); *бот.* (*Milium L.*) праця́нік б. т.
бордо — цёмна-чырвоны колер
бордюр — кра́йка, шляк
борение — бораньне, барацьба́
борец — **1.** барацьбі́т, змага́ньнік, змага́р; **2.** *бот.* (*Aconitum L.*) мардоўнік б. т.
борзо — борзда, шпа́рка
борзописец — піса́ка
борзый — борзды, шпа́ркі, спры́тны, ху́ткі
борзая собака — хорт
Борис — *и. соб.* Барыс
Борисов — *г.* Барысаў
бормотание — мармыта́ньне, бубне́ньне, бурча́ньне
бормотать — мармыта́ць, бубні́ць, бурча́ць
бормоту́н — мармы́ль
голубь-бормотун — ту́рчык
борный: борная кислота — борны квас х. т.
боров — **1.** (*выхолощенный*) каба́н; **2.** (*невыхолощенный*) кныр, кнораз, гука́ч; **3.** (*у печи*) ляжа́к
боровик — (*гриб*) баравік, шчы́ры грыб
борода — барада́
бородавка — бародаўка, дзіч В. кр. сл.
бородавчатый — бародаўчаты
бородатый — барада́ты
бородач — барада́ч
борозда — баразна́; (*глубокая*) разора
бороздить — баразьні́ць, гнаць барозны
бороздка — баразёнка
бороздник — баразёньнік лс. т.
борона — бараны́; (*с еловыми сучьями*) смык
боронильщик — баранавалок, скародзька
боронить — баранава́ць, скародзіць
боронование, бороньба — баранава́ньне, скароджаньне
бороться — змага́цца, барацца, ходацца, ду́жацца, барука́цца
борт — край, бе́раг, кра́йка, борт
бортевой — барцёвы
бортник — бортнік
борть — борць, калода
борщ — боршч, бураки́
борщевник — *бот.* (*Heracleum L.*) баршчэ́ўнік
борьба — барацьба́, змага́ньне, ду́жаньне, бораньне, боркі
босиком — басанож, боса, басяком, басячком
босой — босы
быть босым — баси́ны спраўля́ць
босоногий — басаногі
босоножка — басаножка
босяк — бася́к
босяки — *собир.* басота
ботаник — бата́нік
ботаника — бата́ніка, расьліназна́ўства
ботанический — батані́чны, расьліназна́ўчы
ботва — бацьві́ньне
ботвинья — (*кушанье*) халадзе́ц, бацьві́ньне
боцман — боцман
бочар — бондар; (*подмастерье*) бандарчу́к
бочарничать — банда́рыць
бочарничество — банда́рства
бочарный — банда́рны

Б

Б

бочёвка — (*сортимент*) бачкоўка лс. т.
бочениться — **1.** бочыцца (*схіля́ цца ў бок*); **2.** бра́цца ў бокі
бочка — бочка, бонда, фа́ска, ка́даўб, ку́бел
бочковидный, бочкообразный — бачкава́ты
бочком — бачком, бераżком
бочонок — бочачка, кадўшка; (*из выдолбленного дерева*) кадоўбчык, ка́даўб, лі́паўка
боязливо — боязка, боязна, палахлі́ва, пужлі́ва
боязливость — боязкасьць, боязнасьць, палахлі́васьць, пужлі́васьць
боязливый — боязкі, боязны, палахлі́вы, пужлі́вы
боязнь — боязьнь (бая́зьнь), страхата́
боярин — бая́рын
боярыня — бая́рыня
боярышник — *бот.* (*Crataegus L.*) глог
боярышня — бая́рышня
бояться — бая́цца, палохацца, пужа́цца
бравировать — задава́цца
браво — добра, сла́ўна, бра́ва
бравурный — браву́рны, сьмелагу́чны мз. т.
бравый — маладзе́цкі, зухаўскі, зухава́ты
брага — **1.** (*хмельная*) бра́га; **2.** (*сусло*) вы́вар
брадобрей — галя́р, цыру́лік
бражник — гуля́ка, п'я́ніца
бражничанье — гуля́ньне
бражничать — гуля́ць, піць гарэлку
бражный — хме́льны
бразды — цу́глі
брак — **1.** (*недостаток*) брак; **2.** (*бракосочетание*) шлюб
браком сочетаться — пабра́цца, пашлюба́цца
в браке жить — жыць у па́ры
браковать — бракава́ць
браковка — бракава́ньне
браковный — бракоўны, бракава́льны
браковщик — бракава́льнік, бракоўнік
браконьер — браканье́р, самапра́ўны паляўні́чы
брандмауэр — глухі́ мур
брандмейстер — брандма́йстар
бранить — сварыцца (*на каго*), ля́яць; (*с укорами*) га́ніць
браниться — сварыцца (*з кім*), ля́яцца; (*в драке*) калаці́цца
бранливый, бранчивый — сварлі́вы, звадлі́вы, грызьлі́вы, зьвягліві
бранливая (баба) — брахўха, сакатўха
бранный: бранное слово — ля́янка
бранное поле — поле бітвы, баёвішча
брань — **1.** вайна́, бой; **2.** ля́янка, ля́яньне; сва́рка, грызьня́, калатня́
браслет — брынзале́т
браслетка — брынзале́тка
брат — брат, браце́нік
брат двоюродный — стрые́чны брат
брат названный — пабраці́м
братание — бра́таньне, сябрава́ньне
брататься — бра́тацца, сябрава́ць (*з кім*)
братец — браток, бра́тка, бра́ценька
братина — конаўка
братишка — бра́тка
братнин — бра́таў
братолюбивый — браталю́бны
братолюбие — браталю́бства
братоубийственный — братазгу́бны (*аб вайне́*)
братоубийство — братазабойства, братагу́бства
братоубийца — братазабойца, братагу́бец
братский — бра́цкі, братэрскі
братство — **1.** (*церк. организация*) бра́цтва; **2.** (*братские отношения*) братэрства
брать — браць; (*сов.* узя́ць, іма́ць, няць)
брать в заём — пазыча́ць, браць напаве́р
брать верх — браць гору, перамага́ць
брать взятки — хаба́рнічаць, хапа́ць
брать лишнее — перабіра́ць
брать в свидетели — за съве́дку (съве́тку) браць
брать (чью) сторону — ста́яць за каго
браться — бра́цца, хапа́цца
браунинг — бра́ўнінг
брачащиеся — маладыя
брачиться — браць шлюб, ісьці на за́піс
брачный — шлю́бны, вясе́льны
брачный возраст — шлю́бны век
бревенчатый — ру́блены; пабудава́ны з бярве́ньня
бревно — бервяно, бярно, брус; (*плоское*) пла́шка
брёвна — *собир.* бярве́ньне
бревно — (*нижнего венца в постройке*) падру́ба
бред — брэд, вяроза, марэньне, маячаньне
бредень — брадні́к (*гату́нак се́ці*)
бредина — *бот.* (*Salix L.*) брэднік
бредить — дрывіць

брезгать — грэбаваць, бры́дзіцца, гі́дзіцца, перабіра́ць
брезгливо — грэбліва, брыдлі́ва, гідлі́ва, пераборліва
брезгливость — грэблівасьць, брыдлі́васьць, гідлі́васьць, пераборлівасьць
брезгливый — грэблівы, брыдлі́вы, гідлі́вы, пераборлівы
брезент — брэзэ́нт
брезентовый — брэзэ́нтавы
брезжиться — **1.** мігце́ць, бліскаць; **2.** сьвіта́ць, займа́цца на зару́
брелок — падве́сак
бремя — цяжа́р, ярмо; бярэма
разрешиться от бремени — абрадзіцца, раскі́дацца
бренность — **1.** тле́ннасьць; **2.** нятрыва́ласьць, ма́рнасьць
бренный — **1.** тленны; **2.** нятрыва́лы, ма́рны
бренчание — бры́нканьне, дзы́нканьне
бренчать — бры́нкаць, дзы́нкаць
вычисление — вылічэньне, вырахава́ньне
вычислять / вычислить — вылічаць / вы́лічыць; рахава́ць / вы́рахаваць

вычитаемое — аднíмнік м. т.
вычитание — аднíма́ньне, адыма́ньне м. т.
вычитать / вычесть — адыма́ць / адня́ць; выліча́ць / вы́лічыць; адліча́ць / адлічы́ць
вычищать / вычистить — вычышча́ць / вы́чысціць
вычурно — вы́чварна
вычурный — вы́чварны
вышарить — вы́шарыць, вы́шукаць, вы́шныпарыць
вышвыривать / вышвырнуть — вышвыра́ць / вы́швырнуць
выше — вышэй, наўзвы́ш, узвы́ш, верх, поверх, над
выше силы — над сі́лу
выше меры — звыш ме́ры
вышеизложенный — вышэйпада́ны, вышэйпі́саны
вышеназванный — вышэйназва́ны, вышэйме́нены
вышеозначенный — вышэйазна́чаны
вышеуказанный — вышэйпака́заны
вышеупомянутый — вышэйпамя́нёны
вышибать / вышибить — выбіва́ць / вы́біць; высáджваць / вы́садзіць
вышивание, вышивка — вышыва́ньне, гафтава́ньне
вышивать / вышить — вышыва́ць / вы́шыць; гафтава́ць
вышивной — вышыва́ны, гафтава́ны
вышина — вышыня́
вышиною — увы́шкі
вышка — вы́шкі, са́лька (*пакой*)
вышколить — вы́муштраваць, вы́цьвічыць
вышлифовать — вы́шліхаваць, адшліхава́ць
вышмыгнуть — вы́шмыгнуць, вы́сьлізнуць
вышний — найвы́шні
выштукатурить — вы́тынкаваць
вышучивать / вышутить — жартава́ць / зжартава́ць
выщелачивание: выщелачивание дерева — выпалоскваньне дрэва лс. т.
выщелачивать / выщелочить — залі́ць / вы́залі́ць; лу́жыць / вы́лужыць; лугава́ць / вы́лугаваць
выщипывание — вышчы́пваньне, выскуба́ньне
выщипывать / выщипать — вышчы́пваць / вы́шчыпаць; выскуба́ць / вы́скубці (вы́скубсьці)
выщупывать / выщупать — ма́цаць / вы́мацаць; абма́цаць
выяснение — выясьне́ньне, вытлумачэньне
выяснеть, выясниться — (*о погоде*) распагодзіцца
выяснять / выяснить — выясня́ць / вы́ясьніць; тлума́чыць / вы́тлумачыць
вьюга — заве́я, завіру́ха, замяту́ха
вьюк — клу́нак
вьюн — *зоол.* (*Petromyzon*) уго́н з. т.
вьюнок — *бот.* (*Convolvulus L.*) павой б. т., бярозка
вьюнок полевой (берёзка) — *бот.* (*Convolvulus arvensis L.*) паўзу́н В. кр. сл.
вьюрок — *зоол.* (*Fringilla*) юрок
вьючить — пакава́ць, наклада́ць клу́нкі
вьючный — клу́начны
вяжечка — *бот.* (*Turritis Dill*) ве́жыца б. т.
вяз — *бот.* вяз
вязальный — вяза́льны
вязальщик — вяза́льнік
вязальщица — вяза́льніца
вязальщица чулок — панчошніца
вязание — вяза́ньне, пляце́ньне
вязанка — кі́тка; вя́зка, вя́занка, вясло
вязаный: вязаный платок — вязёнка В. кр. сл.
вязать — вяза́ць, плéсьці, плясьці́
вязель — *бот.* (*Coronilla L.*) цяцёрка б. т.
вязига — вязі́га
вязка — вясло, ні́зка, вя́зка
вязкий — гру́зкі
вязкость — гру́зкасьць
вязнуть — гру́знуць, угруза́ць; чапля́цца (*да каго*)
вязовый — вязовы
вязь — вязь, вяза́ньне
Вязьма — *г.* Вя́зьма
вяленный — су́шаны на сонцы
вялить — сушы́ць на сонцы
вялость — вя́ласьць, мля́васьць
вялый — вя́лы, мля́вы, апяша́лы
вянуть — вяць, вя́нуць, сохнуць, марне́ць
вятичи — *ист.* вя́цічы
вяхирь — (*голубь*) пяхце́р
Вячеслав — *и. соб.* Вечаслáў

Г

га — *межд.* га, агá
гавань — гáвань, пры́стань, порт
гавиал — *зоол.* (*Gavialis*) гавія́л
гавканье — гáўканьне, браха́ньне
гавкать — гáўкаць, браха́ць
Гавриил — *и. соб.* Габру́сь, Гаўры́ла
гага — *зоол.* гáга
гагара — *зоол.* гага́ра
гагат — гага́т, чорны бурштын
гад — гад, гáдзіна
гадальщик — варажбі́т
гадальщица — варажбі́тка
гадание — варажба́ (варожба), варажэ́ньне
гадательно — наўздага́д, здага́дна, няпэ́ўна
гадательный — здага́дны, няпэ́ўны
гадать — гада́ць, варажы́ць
гадёныш — гадзяня́
гадина — гáдзіна, поскудзь
гадить — гáдзіць, гі́дзіць, паску́дзіць, касьці́ць; псава́ць
гадкий — гі́дкі, бры́дкі, агі́дны, паску́дны, пага́ны
гадко — гі́дка, бры́дка, агі́дна, пага́на
гадливость — гідлі́васьць
гадливый — гідлі́вы
гадость — гі́дасьць, гідота, агі́да, брыда́, бры́дкасьць, погань
гадюка — *зоол.* (*Vipera berus*) гадзю́ка, вужа́ка
гадючий — гадзю́чы
гаер — бла́зан, штука́р
гаечка — гáечка, тру́бка, тру́бачка
газ — газ
газ ядовитый — атру́тны газ
газель — газэ́ля з. т., дзі́кая каза́
газета — газэ́та, часопіс
газетный — газэ́тны
газетчик — газэ́тнік
газовидный — газападо́бны, газава́ты
газовый — га́завы
газомер — газаме́р
газон — дзірва́н, мурава́
газоосвещение — га́завае асьвятле́ньне
газопроводимость — газаправо́днасьць
газопроводимый — газаправо́дны
газопроводчик — газаправо́днік
газоубежище — схова́нка ад га́заў
газохранилище — газаво́ўня
гайворон — *зоол.* (*Corvus frigelugus*) грак
гайдамак — гайдама́к
гайка — га́йка, тру́бка, мутэ́рка
галантерейный — галянтарэ́йны
галантерея — галянтарэя
галантир — халадзе́ц
галантно — даліка́тна
галантный — даліка́тны
галда, галдёж — га́лас, гармі́дар, гарла́ньне, тлум, гоман
галдеть — галасава́ць, тлумі́ць, гамані́ць
место, где галдят — гама́рня
галера — гале́ра
галерея — галерэя, кры́ты пераход
галета — гале́та, су́шка
галиматья — лухта́, бяссэнсіца, бязглу́здзіца
галица — *зоол.* (*Cynips*) га́ліца
Галиция — Галі́чына, Чырвонару́сь
галичанин — галіча́нін
галичанка — галіча́нка
галка — га́лка, ка́ўка

галликанский — галіка́нскі
галлицизм — галіцы́зм
Галлия — Га́лія
галлюцинация — галюцына́цыя, здань, ма́ра́
галлюцинировать — ма́рыць
галоп — галёп
галопировать — гарцава́ць
галопом — на́ўскач, на́ўскачкі
галофиты — расьлі́ны-солялю́бы б. т.
галоша — калёша
галстук — га́льштук
галун — галу́н
галушка — галу́шка, клёцка
гальванизация, гальванизирование — гальвані-зава́ньне
гальванизировать — гальванізава́ць
гальванизм — гальвані́зм
гальванический — гальвані́чны
гальванопластика — гальванапля́стыка
галька — аточак, га́лачка
гамада — гама́да, камяні́стая пусты́ня г.-к. т.
гамак — гама́к
гамета — *биол.* гамэта
гамма — га́ма
ганглий — га́нглі, нэрво́вы ву́зел
ганглиозный — ганглі́йны
гангрена — гангрэна, агнявіца (агне́віца)
гараж — гара́ж
гарантирование — гарантава́ньне, забясьпе́ка
гарантировать — гарантава́ць, забясьпе́чваць
гарантия — гара́нтыя, забясьпе́ка, зару́ка
гардероб — адзе́жная ша́фа
гардина — гарды́на, заслона, фіра́нка
гарем — гарэм
гаремный — гарэмны
гарканье — гы́рканьне, га́рканьне
гаркать / гыркнуть — гы́ркаць / гы́ркнуць; га́ркаць / га́ркнуць
гармонизация, гармонизирование — сула́джаньне л. т.
гармонизировать — настройваць на лад
гармоника, гармошка — гармонь
гармонировать — сула́дзіць
гармонист — гарманісты
гармонический — гарманічны, сула́дны л. т.
гармония — гармонія, лад, згода; сула́днасьць л. т., сула́дзьдзе пс.-л. т.
гарнец — га́рнец
гарнизон — залога в. т., гарнізон
гарнизонный — залогавы в. т., гарнізонны
гарнир — гарні́р, прыпра́ва
гарнировать — гарніра́ваць, прыпраўля́ць, аздабля́ць
гарнитур — гарні́ту́р
гарнцевый — га́рцавы
гарцевание — гарцава́ньне
гарцевать — гарцава́ць
гаршнеп — крачок
гарь — смоль, смаль, смаліна́
гасильный — гасі́льны
гасить — гасіць, тушы́ць
гаснуть — згаса́ць, га́снуць
гастрический — гастры́чны, чэраўны
гастролёр — гастралёр
гастролировать — гастраляваць
гастроль — гастроля
гастроном — гастраном, ласу́н, смаку́н
гатить — га́ціць
гать — гаць, грэбля
гаубица — га́ўбіца
гауптвахта — гаўптва́хта, галоўная ва́рта, адва́хта
гаф — гаф
гашиш — гашы́ш
гашник — учку́р, матуз
гаял — *зоол.* (*Bos frontalis*) бык лаба́н з. т.
гвалт — гвалт
гвардеец — гвардзе́ец
гвардейский — гвардзе́йскі
гвардия — гва́рдыя
Гвинея — Гвінэя
гвоздарь — цьвіка́р
гвоздевой — цьвіковы, гваздавы́
гвоздеобразный — цьвікава́ты
гвоздик — гваздок, цьвічок; (*с ушками*) вухна́лік
гвоздика — *бот.* (*Dianthus L.*) іскаркі б. т., гвозьдзікі, сардэчнік
гвоздить — гвазда́ць, забіва́ць гвозд
гвоздичный — гвозьдзікавы, іскаркавы
гвоздь — гвозд, цьвік; (*с ушками*) вухна́ль
гвоздь гонтовый — ганта́ль
гвоздь костыльковый — штыдэт
гвоздяной — *см.* **гвоздевой**
где — дзе
где бы — дзе б
где бы то ни было — дзе-хаця́
где угодно — дзе-хаця́
где попало — абы́-дзе
где уж тебе — куды́ табе́

Г

Г

где-нибудь, где-либо — дзе-не́будзь, абы́-дзе
гегемония — гегемо́нія, панава́ньне, перша-ва́ньне, верхаводства
геенна — пе́кла
геенский — пяке́льны
гей — *межд.* гэй
гейзер — ге́йзар г.-к. т.
гекзаметр — гекза́мэтр (гекза́мэтар), шасьцістоп
гектар — гекта́р
гектограмм — гектагра́м
гектограф — гектограф
гектолитр — гекталі́тр (гекталі́тар)
гелиограф — гэліяграф
гелиография — гэліяграфія, сонцапіс
гелиометр — гэліёмэ́тр (гэліёмэ́тар), сонцаме́р
гелиоскоп — гэліяскоп, сонцагля́д
гелиотроп — (*растение*) гэліятро́п
гелиотропизм — гэліятрапізм, зваротнасьць да Сонца
гелиофильный — сонцалю́бны
гелиофобный — ценялю́бны
гемисфера — гемісфэра, паўку́ля
геморроидальный — гемаройны
геморрой — гемарой
генеалог — генэале́ґ, радавод л. т.
генеалогический — генэалягічны, радаводны
генеалогия — генэале́ґія, радавод, радаводзтва
генезис — генэзіс, пахаджэньне, узьнікне́ньне
генерал — генэра́л
генеральный — генэра́льны, галоўны, агу́льны
генеральное сражение — рашу́чая бойка
генеральский — генэра́льскі
генеральша — генэра́ліха
генератор — генэра́тар
генерация — генэра́цыя
генетический — генэты́чны
гениальность — гэніяльнасьць
гениальный — гэніяльны
гений — гэні л. т.
Геннадий — *и. соб.* Гана́д
Генрих — *и. соб.* Гэнрых
Генуя — *г.* Гэну́я
географ — географ
географический — геаграфічны
география — геагра́фія
геодезия — геадэзія
геолог — геалёг
геология — геалёгія
геометр — геомэ́тр (геомэ́тар)
геометрический — геамэтры́чны
геометрия — геамэтрыя
Георгий — Ю́ры, Ю́рка
георгина — *бот.* (*Georgina L.*) юргі́ня б. т., вяргі́ня
геотропизм — геатрапізм, зваротнасьць да Зямлі́
геральдика — гэра́льдыка
геральдический — гэральды́чны
герань — *бот.* (*Geranium L.*) гера́ня б. т.; гра́белькі
Герасим — *и. соб.* Гара́сім
герб — гэрб
гербаризировать — зьбіра́ць зельле
гербарий — гэрба́ры, зе́льнік
гербовый — гэрбо́вы
гербовая бумага — дакумантовая папе́ра
гербовый сбор — гэрбавая апла́та
Герман — *и. соб.* Гармон, Гэрман
германец — герма́нец, не́мец
Германия — Герма́нія, Нямéччына
германский — герма́нскі, нямéцкі
германфродит — двохро́давец
герметически — шчы́льна
герметический — шчы́льны
героизм, геройство — гэро́йства
герой — гэро́й л. т.
геройский — гэраічны
герольд — зьвястýн, абве́сьнік
герцог — герцаг
герцогский — ге́рцагскі
гетерогенный — іншародны пс. т.
гетман — гэтман
гетманский — гэтманскі
гетманствовать — гэтмана́ваць
гетманша — гэтманіха
гетры — ге́тры, калычы́ В. кр. сл.
гешефт — гешэфт
гешефтмахер — гешэфтма́хер, ша́хер-ма́хер (ша́хір-ма́хір)
Гиады — (*звёздное скопление*) Дажджавікі́ г.-к. т.
гиацинт — гіяцы́нт
гибеллин — *ист.* гібэлі́н
гибель — **1.** гі́бель, пагі́бель, загу́ба, згу́ба, зьнішчэньне, пропасьць, садухі; **2.** (*несметное множество*) гі́бель, бе́зьліч, плойма, процьма
гибель ему! — няха́й ён згі́не!
гибельно — пагі́бельна, згу́бна
гибельный — пагі́бельны, згу́бны
гибкий — гі́бкі, гну́ткі, выгіна́сты

гибкость — гі́бкасьць, гну́ткасьць
гибнуть — гі́нуць, гібе́ць, прапада́ць
гибрид — гібры́д, мяша́нец б. т.
гигант — волат
гигантский — высачэнны, вялі́за́рны
гигиена — гігіе́на
гигиенически, гигиенично — гігіені́чна
гигиенический, гигиеничный — гігіені́чны
гигрометр — гігро́мэтр (гігро́мэтар), вільгацьме́р г.-к. т.
гигроскоп — гіграскоп
гигроскопический — гіграскапі́чны
гигрофиты — расьлі́ны-мокралю́бы б. т.
гидра — *зоол.* гі́дра
гидравлика — гідра́ўлі́ка
гидрографический — гідраграфі́чны
гидрография — гідраграфі́я
гидрология — гідралёгія
гидрометр — вадаме́р
гидропатия — вадалячэньне, гідрапа́тыя
гидростатика — гідраста́тыка
гидротерапия — вадалячэньне
гидрофиты — расьлі́ны-вадалю́бы б. т.
гиена — гіе́на
гик, гиканье — крык, зык, гойканьне, вы́гук
гикать — гойкаць, гука́ць, зы́каць
гиль — **1.** недарэчнасьць, бяссэнсіца, лу́хта́; **2.** *бот.* (*Motacylla erithacus L.*) чырвонано́жка
гильдия — гі́льдыя
гильза — гі́льза; (*патрон*) ладу́нак
гильзовый — гі́льзавы, ладу́нкавы
гильотина — гільяты́на
гильотинировать — сьціна́ць галаву́ на гільяты́не
гимн — гымн
гимназист — гімназі́сты
гимназистка — гімназі́стка
гимназический — гімназі́чны
гимназия — гімна́зія
гимнаст — гімна́ст
гимнастика — гімна́стыка
гимнастический — гімнасты́чны
гинеколог — гінэкале́г, жаночы ле́кар
гинекология — гінэкалёгія
гинуть — гі́нуць, прапада́ць
гипербола — гіпе́рболя м. т., пераўвялі́чэньне
гиперболический — пераўвяліча́ны л. т.
гипертрофированный — пераросты
гипертрофия — гіпэртрафі́я, перарост
гипноз — гіпноз
гипнотизёр — гіпнатызэр
гипнотизирование — гіпнатызава́ньне
гипнотизировать — гіпнатызава́ць
гипнотизм — гіпнаты́зм
гипнотический — гіпнаты́чны
гипотеза — дапушчэньне пс.-л. т.
гипотенуза — гіпатэну́за
гипотетический — дапушча́льны
Гиппократ — Гіпакра́т
Гиппократовы луночки — *мат.* Гіпакра́тавы сярпочкі м. т.
гиппопотам — рэчны конь
гипс — гіпс
гипсовый — гі́псавы
гирло — гарлаві́на г.-к. т.
гиря — вага́, гі́ра
гистология — гісталёгія
гитара — гіта́ра
гитарист — гітары́сты
гифы — гі́фы
глава — **1.** галава́; **2.** (*в книге*) разьдзе́л; **3.** (*на церкви*) ма́каўка
главарь — верхавод, правады́р
главенство — верхаводзтва
главенствовать — верхаводзіць
главнокомандующий — галоўны нача́льнік войска
главноначальствующий — галоўны нача́льнік
главноуправляющий — галоўны кіраўні́к
главный — галоўны
главное предложение — *грам.* асноўны (галоўны) сказ
глагол — *грам.* дзеяслоў
глагольный — дзеяслоўны
гладиатор — глядыя́тар
гладильный — прасава́льны
гладильня — прасава́льня
гладить — **1.** гла́дзіць, раўнава́ць; **2.** (*бельё*) прасава́ць
гладкий — гла́дкі, роўны
гладко — роўна
гладкость — гла́дкасьць, роўнасьць
гладыш — *зоол.* грабе́ц
гладь — гладзь, роўнядзь
глажение — (*утюгом*) прасава́ньне
глаз — вока (*мн.* вочы, зе́ркі, бе́льмы)
глаз близорукий — вока паніклівае, вока ні́зкае
глаз дальнозоркий — вока далеказрочнае
глаз нормальный — вока звыча́йнае
глаза зоркие — бы́стрыя вочы
за глаза — за́ачы

Г

Г

в глазах — уваччу́
на глаз — на вока
с глазу на глаз — сам-на́сам
видеть собственными глазами — на сваé вочы ба́чыць
глаза разбежались — вочы забе́галі
выходить с глаз — зьнік**а́**ць з вачэй
с дурным глазом — ліхі́ на вока
пустить пыль в глаза — пусьці́ць тума́ну
сомкнуть глаза — заплю́снуць вочы
стрелять глазами — зі́ркаць
хлопать глазами — лы́паць вачы́ма
щурить глаза — шчэ́ліцца
окинуть глазом — ски́нуць вокам
не на чем глаза остановить — не́йдзе й вокам зачапі́ць
прочь с глаз! — прэч з маіх вачэй!
глаз нельзя оторвать — аж вочы адбіра́е
глазастый — лупа́ты, зіркасты, вірлавокі
глазение — зі́рканьне
глазет — глязэт
глазеть — зі́ркаць, разьзяўля́ць (разяўля́ць), дзіва́ць
глазированный — (*о посуде*) паліва́ны
глазировать — (*о посуде*) паліва́ць; глянсава́ць
глазница — *анат.* (*orbita*) вакаві́ца ан. т.
глазничный — вакаві́чны ан. т.
глазной — вочны
глазное яблоко — вочнае я́блыка, ві́рла
глазок — вочка
глазок спящий — вочка сьпя́чае б. т.
глазомер — вокаме́р
глазурь — (*для посуды*) паліва
глас — *см.* **голос**
гласить — *юрид.* каза́ць, гаварыць
гласно — галосна, на лю́дзях
гласность — галоснасьць, я́ўнасьць
гласный — галосны, я́ўны
гласный звук — галосны гук
Глафира — *и. соб.* Глапі́ра
глашатай — зьвястýн, заклі́кач
Глеб — *и. соб.* Глеб
глетчер — ледаві́к г.-к. т.
глина — гліна
глина горшечная — гліна ганча́рная
глина лепная — гліна разьбя́рная
глина жирная — гліна тлу́стая
глина осадочная — гліна пластовая
глина фарфоровая — парцаля́нка г.-м. т.
глиний — алюмі́нь, гліня́к
глинистый — гліні́сты
глинистая земля — глей
глиновал — гліна́р
глиновальня — гліна́рня
глинозём — гліназе́м
глинокопня — гліні́шча
глиняный: глиняная чашка — гліня́нка
глист — гліст
глисты — рабакі
глистогон — *бот.* (*Santonina L.*) цытвáр
глицерин — гліцары́на
глицериновый — гліцары́навы
глобус — глёбус
глог — *см.* **спиж**
глодать — гры́зьці, жва́каць
глотание — глыта́ньне, каўта́ньне
глотать / глотнуть — глыта́ць / глыну́ць; каўта́ць / каўтну́ць, каўтану́ць
глотка — горла, глотка
глоток — глык, каўток, сёрб
глохнуть — глу́хнуць
глубже — глыбе́й
глубина — глыбіня́, глыбачыня́, глыбокасьць
глубиною (в глубину) — углы́бкі
до самой глубины — да споду
глубокий — глыбокі, глыбачэнны
глубокий траур — вялі́кая жалоба
глубокая печаль — засмучэньне
глубокая тишина — надзвыча́йная ці́ша
до глубокой ночи — да познае ночы
глубоко — глыбока
глубоководный — глыбокаво́дны
глубокомысленность, глубокомыслие — уду́млівасьць, разва́жнасьць
глубокомысленный — уду́млівы, ве́льмі разва́жны
глубокость — глыбокасьць
глубокоуважаемый — ве́льмі паваж**а́**ны, шаноўны
глубочайший — найглы́бшы
глубочайшее уважение — шчы́рая паша́на
глумиться — зьдзе́кваца (зьдзе́кавацца), кпіць (*з каго*)
глумление — зьдзек, зьдзе́кі, глум, кпіны
глупенькая — дурне́нькая, дурні́ца
глупенький — дурне́нькі, анікава́ты
глупеть — дурне́ць, бязглу́зьдзець
глупец — ду́рань, дурны́, дуры́ла; ёлуп (ёлап, ёлапень), таўка́ч
глупить — дуры́ць
глупо — па-дурному, неразу́мна, неразва́жна, з дурнога розуму, ке́пска

глуповатый — прыду́кава́ты, анікава́ты
глупость — **1.** дурата́, дурота, дурнота, дурны́ розум, блазнота; **2.** глу́пства
глупый — дурны́, бязглу́здны, неразу́мны, на розум небага́ты
глуп как пробка — дурны́ як пень
глупыш — *см.* **глупец**
глухарка — глушы́ца
глухарь — (*Tetrao*) глушэц
глухо — глу́ха
глуховатый — глухава́ты, недачу́тлівы
глухой — глухі́; глушэц, ту́кала
глухонемой — глуханямы́
глухота — глухата́
глухота неполная — недачува́ньне
глушить — глушы́ць
глушица — *бот.* (*Lamium album L.*) яснотка бе́лая б. т.
глушь — глуш, глушыня́
глыба — камлы́га, ски́ба, бры́ла, ком
глядение — глядзе́ньне, ба́чаньне, пазіра́ньне
глядеть — глядзе́ць, ба́чыць, пазіра́ць
глядь — *межд.* бач, зір, зірк
глядя — гле́дзячы
гнать — гнаць, гані́ць, выганя́ць, туры́ць; пагня́ць
выгнал из дома — вы́жануў з ха́ты
гнаться — гна́цца, імкну́цца
гнев — гнеў, гне́ваньне, сердава́ньне
гневаться — гне́вацца, сердава́цца, злава́цца
гневливость — гняўлі́васьць
гневливый — гняўлі́вы
гневный — гне́ўны, сярдзі́ты
гнедко / гнедой — гне́ды
гнездиться — гнязьдзі́цца, кубліцца
гнездо — гняздо, кубло
гнездо беличье — хайлу́к
гнездовка — *бот.* (*Neottia L.*) гняздоўнік б. т.
гнёздышко — гнязьдзе́чка, кубе́льца
гнейс — гнэйс
гнести — гнёсьці, гнясьці, ці́снуць, уціска́ць
гнёт — уці́ск, уціска́ньне, ціск, прыці́ск; (*орудие для увязки снопов*) рубе́ль, рубліна
гнида — гні́да
гниение — гніцьцё
гниловатый — пагні́лы, гніле́нькі, гнілава́ты
гнилой — гні́лы, трухля́вы, трупе́хлы, спарахне́лы
гнилостный — гнілотны, гнойны
гнилость — гнілота, трухля́васьць, трупе́хласьць, спарахне́ласьць
гниль — гніль, гнільлё, гной, тлень; гніліна́ лс. т.
гнильё — гнільлё
гнить — гніць; (*о дереве*) трухле́ць, пру́хнуць, парахне́ць
гноение — гнае́ньне
гноетечение — гнояце́ча
гноить — гнаіць
гноиться — гніць, гнаіцца
гной — гной; бруд, матэрыя
затянуться гноем — загнаіцца
гнойник — гная́ўка, валасе́нь
гнойный — гнойны
гном — гном
гномон — гноман, ля́ска
гноючесть — гнаістасьць
гноючий — гнаісты
гну — *зоол.* (*Antilope gnu*) гну
гнусавец — гамзе́ль, гомза
гнусавить — гамза́ць, гугня́віць, гугні́ць
гнусавость — гамза́тасьць, гугня́васьць
гнусавый — гамза́ты, гугня́вы
гнусно — гі́дка, бры́дка, гане́бна, паску́дна
гнусность — гідота, гане́бнасьць, паску́дзтва
гнусный — гі́дкі, гане́бны, бры́дкі, паску́дны, плюга́вы, агі́дны
гнуть — гнуць, гбаць, хілі́ць, згіна́ць
гнуться — гну́цца, хілі́цца, схіля́цца
гнушаться — грэбаваць, бры́дзіцца, перабіра́ць
гнущийся — гну́ткі
гобой — габой
говельщик — гаве́льнік
говение — гаве́ньне
говеть — гаве́ць
говор — **1.** (*диалект*) гаворка, гу́тарка; **2.** (*шум голосов*) гоман
говорение — гаварэньне, бала́каньне, гамонка
говорильня — гавары́льня
говорится — гаворыцца
как говорится — як ка́жуць
говорить — гавары́ць, каза́ць, мовіць; (*беседовать*) размаўля́ць, гаманіць, гу́тарыць, зюзю́каць
говорить несерьёзно — бала́каць, дуду́каць
говорить скороговоркой — як гарохам сы́паць
не с тобой говорят — не да цябе́ ка́жуць
говорить в шутку — каза́ць на жарт
говорливость — гутарлі́васьць
говорливый — гутарлі́вы, гаманлі́вы, гаваркі́

Г

говорун — гаварок, раздабáра, болбат
говорунья — гаварýха, балбатýха
говядина — я́лавíчына
говяжий — я́лавíчы
гоголь — (*птица*) гогаль
ходит гоголем — ходзіць пе́ўнем (задра́ўшы нос)
гоготать — **1.** (*по-гусиному*) гэгаць; **2.** (*кричать*) гойкаць, галёкаць; **3.** (*смеяться*) рагата́ць
год — год, ле́та, рок
год високосный — год перастýпны, перастýп
год текущий — сяголетні (бягýчы) год
в этому году — сёлета
в прошлом году — ле́тась
на другой год — нале́тась
в позапрошлом году — пазале́тась
година — гадзíна, час, часíна
годичный — гадавы́, рочны
годность — ужы́тачнасьць, ужы́тнасьць, прыда́тнасьць, зда́тнасьць
годный — ужы́тачны, ужы́тны, гожы, прыда́тны, зда́тны
годовалый — аднагодак
годовалый телёнок — пярэзімак
годовать — векава́ць
годовой — гадавы́, рочны
годовой ребёнок — аднале́так
годовщина — угодкі, гадавíна
голавль — галаве́нь
голенастый — цыба́ты, падгалёністы
голенастые — *зоол.* цыба́тыя з. т.
голенище — халя́ва
голень — галёнка, лы́тка
голенная кость — цэўка
голенький — галю́сенькі
голец — *зоол.* (*Nemachilus Hasselt.*) сьліж з. т.
голик — (*истрёпанный веник*) гале́нь, дзяркáч
голить / голиться — галíць / галíцца
голландец — галяндыец
Голландия — Галя́ндыя
голландский — галяндыйскі, галяндэрскі
голо — гола
голобородый — голабаро́ды, безбародзька
голобрюхий — галапýзы, галапýзік
голова — галава́, голаў
рубить / срубить голову — сьцінáць / сьцяць галаву́
ломать голову — марочыць галаву́
повесить голову — спусьцíць (схілíць) галаву́
покачать головой — пакруцíць галавой
очертя голову — стрымгалоў (стрымгалаў)
терять голову — ня даць сабе́ ра́ды
голова не в порядке — у галаве́ ня ўсе клёпкі
сколько голов, столько умов — што галава́, то розум
как снег на голову — неўспадзе́ўкі
головастик — **1.** галава́н; **2.** *зоол.* апалонік, палонік
головастый — галава́ты, мазгава́ты
головешка, головня — галаве́шка, галаўня́, галýза
головище — верхавíна, пача́так (ракí)
головка — галоўка
головка мака — ма́какаўка
головной — галаўны́
головной платок — хýстка
головня — *см.* **головешка**
головокружение — за́марака, запамарока
головоломка — галаваломка, ламанíна
головомер — галавамéр
головомойка — нагонка
головоногий — *зоол.* галаваног
головоногие — *зоол.* галаваногія
головорез — галаварэз, шы́бенік (шы́беньнік, шы́бельнік), вíсус, галíна
головушка — галовачка
головчатый — галоўчаты
гологоловый — галамоўза
голод — голад
заморить голод — угамава́ць голад, перакусíць
голодание — галадава́ньне
голодать — галадава́ць
голодно — голадна
голодный — галодны
голодный год — няхлéбны год, бясхлéбіца
голодовка — галадоўля, галадава́ньне
голодуха — галадýха
гололедица — воблíў, галашчок, галалёд, галялёд
голоногий — галаногі
голоперый — галапéры, галапýпік
голопятый — галапя́ты, галадра́нец
голорукий — з голымі рука́мі
голос — голас, мат
голос совещательный — голас дара́дчы
понижать голос — зьніжа́ць голас
повышать голос — падвышáць голас; падніма́ць голас

кричать во весь голос — гарлáць, гарлáніць
в один голос — аднагалосна
подавать (за кого) голос — галасавáць (*за каго*)
голосеменные — *бот.* (*Gymnospermae*) голанасéнныя б. т.
голосистость — галасíстасьць, галасьлíвасьць
голосистый — галасíсты, галасьлíвы, звонкі
голосить — галасíць, выць, лементавáць
голословно — бяз довадаў, без падстáвы, бязгрунтоўна
голословность — бяздоваднасьць, беспадстáўнасьць, бездакáзнасьць, бязгрунтоўнасьць
голословный — бяздовадны, беспадстáўны, бездакáзны, бязгрунтоўны
голосование — галасавáньне
голосовать — галасавáць (*за каго*)
голосоведение — *муз.* вядзéньне голасу мз. т.
голосовой — галасавы́
голосовой звук — *грам.* гýчны (звонкі) гук
голосовая связка — галосьніца
голосок — галасок
голоусый — галавýсы, галавýс
голоштанник — галадрáнец
голубёнок — галубянá
голубец — **1.** блакíт, блакíтная фáрба **2.** кобец
голубизна — блакíць
голубика — *бот.* (*Vaccinium uliginosum L.*) буякí б. т., дурнíцы, п'янíцы В. кр. сл.
голубиный — галубя́чы, галубíны
голубить — мілавáць, пéсьціць
голубичник — буя́чнік
голубка — *ласк.* галýбка
голубой — (*цвет*) блакíтны, васíльковы
голубочек — галубок
голубушка — галýбка, мая́ каханая
голубчик — галубочак
голубь — *зоол.* (*Columba*) голуб
голубь каменный — (*Columba livia*) дзíкі голуб
голубь-воркун — (*Columba tympanisans*) тýрчык, турок
голубятник, голубятня — галубоўнік, галубоўня
голый — голы
голыми руками — галарýч
голая правда — шчы́рая прáўда
гол как сокол — голы як бізýн (як бýбен)
голытьба — галота, галытвá; злы́дні
голыш — голы, галя́к, галы́ш; галадрáнец, злы́дзень
голь — галéча, злы́дні
Гомель — *г.* Гомель
гомельский — гомельскі
Гомельская губерния — Гомельшчына
гомеопат — гамэапáт
гомеопатия — гамэапáтыя
Гомер — Гамэр
гомерический — гамэры́чны, заходзісты
смеяться гомерическим смехом — рагатáць аж заходзіцца
гомогенный — аднародны пс.-л. т.
гомографический — аднапíсны
гомофония — гамафонія, аднагалосьсе мз. т.
гон — гон
в гоны — навы́перадкі
гонг — гонг
гонение — ганéньне, гнацьцё, пагон, уціск
гонец — **1.** ганéц, пасланéц; **2.** *бот.* (*Sedum acre L.*) расходнік востры б. т
гонимый — гнáны
гонитель — напáсьнік, вораг
гонительница — напáсьніца
гонка — гон, сплаў лéсу
гонобобель — *см.* **голубика**
гонор — гонар
гонорар — ганарáр, áўтарская плáта
гонорея — ганарэя
гонт — гонт, гонты
гонтина — ганцíна
гонтовый — гонтавы
гончар — ганчáр, гаршкáль
гончарничать — ганчараваць
гончарный — ганчáрны
гончарный промысел — ганчáрніцтва
гончарня — ганчáрня
гончий — гончы
гончая собака — ганчáк
гонщик — (*плотов*) плы́тнік
гоньба — гнацьцё, пагон
гонять — ганя́ць, гнаць, ганíць, турбíць
гоняться — ганя́цца, гнáцца (*за чым*), імкнýцца (*да чаго*), лавíць (*што*)
гора — гарá
под гору — з гары́
в гору — на гору
на гору — пад гору
ходить по горе — хадзíць гарою (на гары́)
как гора с плеч — як кáмень ад сэрца
гора денег — сíла (бéзьлíч) грошай
у него гора денег — у яго грошай кýры ня клюю́ць

Г

горазд — прыда́тны
гораздо — шмат, дале́ка (далёка), бага́та
горб — горб
горбатый — гарба́ты
горбатого исправит могила — маленькі саба́чка да сьме́рці (да ве́ку) шчаня́
горбик — гарбок
горбина — гарбі́на, гарбаві́на
горбить — горбіць, гарба́ціць
горбиться — горбіцца, гарба́ціцца
горбун — гарба́ты, гарба́ч
горбунья — гарба́тая
горбушка — (*хлеба*) акра́ец, акра́йчык
горбыль — (*вид тёса*) аполак
горделивость — гардава́тасьць, фанабэрнасьць
горделивый — гардава́ты, фанабэрны
гордец — горды, гарду́н, надзу́цік, амбі́т, пы́шка
гордиться — гардзі́цца, надзіма́цца, пы́шыцца, занасі́цца, задава́цца, амбі́ціцца, фанабэрыцца; мець многа мух у носе Я. Кол.
гордость — гордасьць, пы́ха, фанабэрыя
гордый — горды, пы́шны, амбі́тны, фанабэрысты
гордыня — гарды́ня, гардота
гордячка — гордая, пы́шная, надзу́тая, фанабэрыстая
горе — **1.** гора, лі́ха; **2.** жаль, смо́так, туга́
горя не знает — жыве́ аніга́дкі
на горе — на жаль
изведать горе — зазна́ць гора
с горя — з жа́лю
горевание — гарава́ньне, бедава́ньне
горевать — гарава́ць; (*печалиться*) тужы́ць, ну́дзіцца, сумава́ць; (*бедствовать*) бедава́ць
горелка — (*у лампы*) палі́лка
горелки — (*игра*) гарэлкі, гары́пні
горелый — гарэлы, па́лены
горемыка — гаротнік, гарапа́шнік, небара́ка, бяда́к
горемычный — гаротлівы, бяздольны
горение — гарэньне, пале́ньне
горенка — сьвятлі́чка, пакойчык
горестно — бале́сна, тужлі́ва
горестный — гаротны, тужлі́вы, пры́кры
горестная жизнь — злы́дні
горесть — гаротнасьць, гарэча; жаль *м.*, туга́, смо́так
гореть — гарэць, пали́цца; цяпліцца; сьвяці́цца
гореть нетерпением — прагчы́ся
горит во рту — пячэ ў роце
горец — *бот.* (*Polygonum*) драсён б. т.
горец аптечный — (*Polygonum bistorta L.*) ра́чыкі, ра́кавыя шы́йкі
горец узловатый — (*Polygonum convolvulus L.*) дрост, драсён павойны
горец — гарня́к
горечавка, горчанка — *бот.* (*Gentiana L.*) гары́чка б. т.
горечь — горкасьць, гаркота́, ёлкасьць
горечью отдаёт — гарэніць
горизонт — кругаві́д, пазе́м
горизонталь — пазе́мнік г.-к. т.
горизонтальный — пазе́мны
горилла — *зоол.* гары́ля
гористость — гары́стасьць
гористый — гары́сты, узгоркаваты
горихвостка — *зоол.* (*Ruticilla*) чарнагру́дка з. т.
горицвет — *бот.* (*Lychnis dioica L.*) сьве́тнік б. т., гарыцьве́т
горка — горка
горкнуть — гарка́вець, гарчэць, ялчэць
горлан — гарла́ч
горланить — гарла́ніць, гарла́ць
горластый — гарла́сты
горлач — (*кувшин*) глады́ш
горлец — *см.* **горец**
горлица — *зоол.* (*Columba turtur*) ту́рчык, турок
горло — горла, гарля́к, гарля́нка; зеў, жарало
кричать во всё горло — гарла́ць, гарла́ніць
горловина — гарлаві́на, жарало
горловой — гарлавы́
горлодёр — гарла́ч
горлышко — горлачка, шы́йка
горлянка — *бот.* (*Cucurbita lagenaria L.*) гарля́нка
горн — **1.** (*на заводах*) гоpан; **2.** *муз.* горн
горний — вы́шні
горнило — гоpан
горнист — гарні́сты
горница — пакой, сьвятлі́ца
горничная — пакаёўка
горнозаводский — гісэрневы г.-к. т.
горнокаменный — горнакаме́нны
горнопромышленник — нетракапа́льнік
горнопромышленность — нетракапа́льная прамысловасьць г.-к. т.

горнорабочий — гарня́к, шахцёр (шахта́р)
горностай — *зоол.* (*Mustela*) гарнаста́й
горный — горны, гаравы́, гарні́чы
горное масло — на́фта, зе́мны але́й
город — ме́ста, горад
ни к селу ни к городу — ні да скла́ду ні да ла́ду
городить — гарадзі́ць
городить чушь — плявузгаць, чаўпсьці́
городище — гарадзе́ц
городовой — **1.** *прил.* ме́скі, гарадавы́; **2.** *сущ.* міліцыяне́р
городок — гарадок, мястэчка
городской — гарадзкі́, ме́скі
городчастый — (*лист*) зарубча́сты б. т.
горожанин — гарадча́нін, мешча́нін, мястовец пр. т.
горожанка — гарадча́нка, мяшча́нка
горообразование — гораўтварэ́нне г.-к. т.
гороскоп — гараскоп
горох — гарох
место, где рос горох — гарохавішча
гороховая солома — гарохавіны
гороховина — гарохавіна
гороховинка — гарохавінка
гороховый — гарохавы
горошек — гарошак
горошек посевный — *бот.* (*Vicia sativa L.*) ві́ка се́ўная б. т.
горошина — гарошына
горошинка — гарошынка
горст — горст
горсть, горстка — жме́ня
горсть льна — мы́чка
гортанный — гарта́нны, гарля́чны ан. т.
гортань — гарта́нь, гарля́нка, гарля́к ан. т.
гортензия — *бот.* (*Hortensia L.*) гартэнзія
горчайший — найгарчэйшы
горчак — *зоол.* (*Rhodeus*) гарча́к
горчица — *бот.* (*Sinapis L.*) гарчы́ца
горчичник — гарчы́чнік
горчичница — гарчы́чніца
горчичный — гарчы́чны
горшечник — гаршка́ль, гаршкалёп
горшечный — гаршэчны
горшок — гаршчок (*род.* гаршка́); (*с узким горлышком*) гляк
горшочек — гаршчочак, гаршэчак, гарну́шак
Горы-Горки — Горкі
горький — горкі, ёлкі
горько — горка, ёлка; пры́кра
горьковатость — гарка́васьць, ёлкава́тасьць
горьковатый — гарка́вы, елкава́ты
горькость — горкасьць, ёлкасьць
горюн — гару́н, мармыту́н
горючесть — гару́часьць, па́лкасьць
горючий — гару́чы, па́лкі, пяку́чы
горючие слёзы — горкія сьлёзы
горючий материал — па́ліва
горюшко — горанька, горачка
горячечный — гара́чкавы
горячий — гара́чы, пяку́чы, па́лкі
горячий человек — на ім аж ску́ра гары́ць, гара́чы чалаве́к
горячиться — гарачы́цца, запаля́цца, распаля́цца, азардава́ць
горячка — гара́чка, гару́чка
горячность — гара́чнасьць, пал, запа́л
горячность в работе — руплі́васьць, агнёвасьць
горячо — горача, па́лка
госпиталь — шпіта́ль
госпитальный — шпіта́льны
господин — пан
господа — панове, паны́; *собир.* па́нства
господский — па́нскі
господский дом — гаспода, двор
господство, господствование — панава́ньне
господствовать — панава́ць, па́нстваваць
господствующий — пану́ючы; перава́жны
господь — гаспод, пан бог
госпожа — па́ня
госпожа дома (хозяйка) — гаспады́ня
гостеприимный — гасьці́нны
гостеприимство — гасьці́ннасьць
гостиница — гасьці́ніца, гатэль
гостить — гасьцява́ць, гасьці́ць
гость — госьць
гостья — госьцейка
государственность — дзяржа́ўнасьць, гаспада́рнасьць
государственный — дзяржа́ўны, гаспада́рны
государственная казна — скарб
государство — дзяржа́ва; гаспада́рства, па́нства
государыня — валада́рка, па́ня, карале́ва
государь — гаспада́р, пан
милостивый государь — Ва́ша мі́ласьць
гот — гот
готика — готыка
готический — гаты́чны

Г

готовальный — гатава́льны
готовальня — гатава́льня
готовить — гатава́ць, рыхтава́ць, ла́дзіць
готовиться — гатава́цца, рыхтава́цца
готовка — гатава́ньне
готовность — гатовасьць
в готовности — напагатове
готовный, готовый — гатовы, ахвочы
гощение — гасьцява́ньне
граб — *бот.* (*Carpinus*) граб
грабаздать — ла́пацъ, хапа́ць
грабёж — грабе́ж, рабу́нак, драпе́жніцтва
грабелина — гра́бліна
грабельщик — грабе́ц
грабитель — грабе́жнік, рабоўнік, драпе́жнік, зьдзі́ра
грабительский — грабе́жніцкі, рабоўніцкі, драпе́жніцкі, зьдзі́рскі
грабительство — рабоўніцтва, драпе́жніцтва, зьдзі́рства; раба́ваньне, гвалт
грабить — гра́біць, рабава́ць, драпе́жнічаць
грабли — гра́блі
грабовый — гра́бавы
гравий — жвір, жарства́
гравилат — *бот.* (*Geum*) гарлачоўка
гравировальный — грава́вальны
гравировальня — грава́вальня
гравировка — грава́ньне
гравюра — грав'ю́ра
град — град
градация — ступеня́ваньне л. т.
градобитие — градабі́цьце
градоначальник — нача́льнік гораду (ме́ста), *уст.* бурмі́стар
градской — гарадзкі́, ме́скі
градуирование — падзе́л на гра́дусы
градус — гра́дус, ступе́нь
градусник — гра́дусьнік
гражданин — грамадзя́нін
гражданка — грамадзя́нка
гражданский — грамадзя́нскі, цывільны
гражданственность — грамадзя́нскасьць
гражданственный — грамадзя́нскі
гражданство — грамадзя́нства
грамм — грам
грамматик — граматы́сты
грамматика — грама́тыка
грамматический — граматы́чны
грамота — **1.** гра́мата, пісьмо; **2.** *юрид.* гра́мата, прывіле́й, унівэрса́л, дэкрэ́т, ліст
охранная грамота — абаронны (ахоўны) ліст
дарственная грамота — дарава́льны ліст
грамотей — грамаце́й, пісьме́нны
грамотка — пісу́лька, цыду́лка
грамотность — гра́матнасьць, пісьме́ннасьць
грамотный — гра́матны, пісьме́нны
гран — (*аптечный вес*) гран
гранат — *бот.* (*Punicum granatum L.*) грана́т
граната — *воен.* грана́та
гранатный — грана́тавы, грана́тны
гранатомётчик — гранатамётнік
грандиозность — вялі́за́рнасьць, вялічэ́знасьць
грандиозный — вялі́за́рны, вялічэ́нны, вялічэ́зны
гранение — шліхава́ньне
гранёный — шліхава́ны
гранильный — шліхава́льны
гранильня — шліхава́льня
гранильщик — шліхава́льнік
гранит — грані́т, зярня́к г.-м. т.
гранит гнилой — грані́т вы́петралы
гранитный — грані́тны
гранить — шліхава́ць
граница — грані́ца, мяжа́, рубе́ж, кардон
выйти из границ — перабра́ць ме́рку
граничить — грані́чыць, межава́цца (*з чым*), упіна́ць (*ува* (*у*) *што*)
граничный — грані́чны, суме́жны, рубе́жны, кардонны
гранка — шпа́льта
грань — сьце́нка м. т.
граф — граф, грап
графа — графа́; шпа́льта
графин — кара́фа
графинчик — кара́фка
графиня — графі́ня, грапі́ня
графит — графі́т
графить — лінава́ць
графический — графі́чны, пісоўны
грациозность — пава́бнасьць, стройнасьць
грациозный — пава́бны, стройны
грация — **1.** *мифол.* гра́цыя; **2.** ва́бнасьць, стройнасьць, прыгожасьць
грач — *зоол.* (*Corvus*) грак
грачонок — грачаня́
гребёнка — шчотка
гребень — грэбень
гребень волны — грэбень хва́лі

гребень горной цепи — грэбень горнага ланцугá г.-к. т.
гребец — грабéц, вясьля́р
гребешок — грабянéц, грабéньчык
гребник — *бот.* (*Cynosurus L.*) грэбнік б. т.
гребной — вясловы
грёза — вяроза Я. Кол.; мáра́
грезить — вярозіць Я. Кол., мáрыць
грезиться — мáрыцца, вярзьці́ся
грек — грэк
греко-восточный — грэка-ўсходні
греметь — **1.** грымéць; **2.** (*о посуде*) зьвінéць, бразкатáць; **3.** (*об экипаже*) тарахцéць; **4.** (*о громе*) перунава́ць Шп.
гремучий — грымýчы
гремучая змея — грымýчка, бражджоўніца з. т.
гремушка — бра́зкаўка
гренадер — грэнадзéр
гренадерский — грэнадзéрскі
гренок — грэнка
грести — **1.** (*веслом*) грабці́, гарнýць, весла́ваць; **2.** (*граблями*) грабці́
греть — грэць
грех — грэх, віна́, правíна
загладить грех — адпакýтаваць
с грехом пополам — так-сяк
греховность — грахоўнасьць
греховный — грахоўны
греховодник — грахаводнік
грехопадение — праграшэньне
Греция — Грэцыя
греча, гречиха — *бот.* (*Polygonum fagopyrum L.*) грэчка, грыка, грэка
гречанка — грача́нка
греческий — грэцкі
гречневый — грэцкі
гречневая солома — грача́нка
грешить — грашы́ць, рабíць грэх
грешник — грэшнік, грахаводнік
грешница — грэшніца, грахаводніца
грешный — грэшны
грешок — грашок, правíнка
гриб — *бот.* (*Fungus*) грыб
белый гриб — (*Boletus bovinus*) баравік, шчы́ры (праўдзíвы) грыб
гриб чёрный — (*Boletus scaber*) ляднік, ляднічок, абáбак, падабáбак
грибастый — губáты, губáр, губáч
грибница — грыбня́ б. т.
грибной — грыбны
грибовидный — грыбáсты
грибозвон — цымбáлы
грибок — грыбок
грива — гры́ва
гривенник — дзяся́тка, грыўня
гривка — грыўка
Григорий — *и. соб.* Рыгор, Грыгор
грим — грым
гримаса — грымáса, крывáя мíна, гíмора
гримасничать — грымáсьнічаць, рабíць гíморы (мíны)
гриф — *зоол.* грыф
грифель — грыфель
грифельный — грыфельны
гроб — труна́, дамавíна, гроб
вогнать в гроб — на той сьвет загна́ць
гробница — надгробак, магíльня гр. т.
гробовой — трýнны, дамавíнавы
гробовщик — трунáр
гробокопатель — грабакоп
гродненский — горадзенскі
Гродно — *г.* Горадня, Горадзен
гроза — навальніца, бýра
гроздевый — гранкавы, гронавы
гроздь — гранка, грона, пук
грозить — пагражáць (*каму́*), страшыць (*каго*), разíць
грозно — грозна, з пагрозаю
грозность — грознасьць, страшэннасьць
грозный — грозны, страшэнны
грозовой — навальнíчны, громавы
грозовая ночь — вераб'íная ноч
гром — гром (*род.* грому), грымоты
удар грома — пярýн
громада, громадина — вéліч
громадность — вялíзарнасьць, вялíчэзнасьць
громадный — вялíзны, вялíзарны, вялíчэзны, агромністы
громила — грамíла
громить — руйнавáць, бурыць, нíшчыць, пустошыць, разбýрваць
громкий — голасны, галасьлíвы, гýчны, зы́чны, моцны; выразны, слáўны
громко — голасна, галасьлíва, гýчна, зы́чна, моцна, выразна
громко кричать — благáць
громкость — голаснасьць, гýчнасьць, зы́чнасьць
громовержец — грамавік

Г

громовой — пяруновы; гу́чны, зы́чны (*голас*)
громогласие — галоснасьць, гу́чнасьць
громогласный — галосны, гу́чны
громоздить — накладáць, награмаджáць
громоздкий — няўклáдзісты, грамозны
громоотвод — пярунавод, пяру́ньнік
громыхание — гру́кат, грукатáньне, тарахцéньне
громыхать — гру́каць, тарахцéць
громыхнуться — *см.* **грохнуться**
гросс — грос
грот — пячора
гротеск — гратэск
гротовый — пячорны
грохнуть — гру́кнуць, гры́мнуцца, бу́хнуць
грохнуться — гру́кнуцца, гры́мнуцца, бу́хнуцца, упáсьці
грохот — гру́кат
грохотанье — гру́каньне, грукатáньне
грохотать — гру́каць, грукатáць, тарахцéць
грош — грош, шаг, шэлег
грошевой — грашовы, шаговы
грубеть — цьвярдзéць, калянéць, шурпáцець, гру́бнуць
грубить, грубиянить — грубíць, грубіянíць
грубо — гру́ба, па-грубіянскý, папростý, нязграбна
грубоватый — **1.** трохі гру́бы; **2.** (*о ткани*) жорсткі, шурпáты, ц́у́бкі
грубость — грубіянства
грубый — **1.** гру́бы, грубіянскі, просты, недалікáтны; **2.** (*о ткани*) жорсткі, шурпáты; **3.** (*о работе*) нязграбны
груда — гру́да, ку́па, бры́ла, мноства
грудастый — грудзíсты
грудина — грудзíна
грудинка — грудзíнка
грудобрюшной: грудобрюшная преграда — *анат.* плявá
грудной — грудны́, пéлькавы
грудная клетка — *анат.* агру́дзьдзе
грудь — гру́дзі (*только мн.*); пéлькі; (*сосцы*) ц́ы́цкі
взяться за грудь в драке — узя́цца зá грудкі
груз — цяжáр
груздь — *бот.* (*Agaricus piperatus*) грузд
грузило — патапéц В. кр. сл.
грузин — грузíн
грузинка — грузíнка
грузинский — грузíнскі
грузить — клáсьці, накладáць; пакавáць
Грузия — Гру́зія
грузно — ц́я́жка, вáжка
грузнуть — гру́знуць, загрузáць
грузный — ц́я́жкі, вáжкі; (*человек*) тоўсты, гладкі
грузовой — цяжаровы, пакоўны, пакавáльны
грузчик — пакоўнік, пакавáльнік
грунт — грунт
грунтование, грунтовка — грунтавáньне, кітавáньне
грунтовать — (*готовить фон*) грунтавáць, кітавáць
группа — гру́па, ку́па, гурток
группирование, группировка — групавáньне, гуртавáньне
группировать — групавáць, гуртавáць
групповый — гру́павы
грустить — смуці́цца, сумавáць, смуткавáць, журы́цца, ну́дзіцца
грустно — сму́тна, су́мна, журбліва, маркотна
грустный — сму́тны, су́мны, журбліві, маркотны
грусть — журбá пс.-л. т., сму́так, маркота, тугá
груша — *бот.* (*Pyrus*) гру́ша
грушевидный — грушáсты
грушевый — гру́шавы
грушовка — грушоўка
грыжа — кілá
грыжевой — кілавáты; кілу́н
грыжник — *бот.* (*Herniaria glabra L.*) гладу́н б. т.
грызение — грызéньне
грызня — грызня́, свáрка, згрызоты, гы́рканьне
грызть — гры́зьці
грызть семечки — лузáць (насéньне)
грызться — гры́зьціся, свары́цца, гы́ркацца
грызун: грызуны — *зоол.* (*glires*) грызуны́
гряда — **1.** градá; **2.** загон
грядка — грáдка
грядущее — бу́дучыня
грядущий — бу́дучы, патомны, насту́пны
грязевой — грáзевы, грязявы́
грязелечебный — грязялéкавы
грязнить — бру́дзіць, брудзя́ніць
грязно — бру́дна, балотна
грязнуха — плю́ндра, лаху́дра, задры́па, няхлю́йка
грязный — бру́дны, балотны, нячы́сты; (*о дороге*) грáзкі

грязь — гразь, бруд, балота
грязи — *мед.* гра́зі
грянуть — **1.** (*о громе*) гры́мнуць, гру́кнуць; **2.** (*о пушке*) бу́хнуць, баба́хнуць
грянуться — *см.* **грохнуться**
губа — **1.** (*залив*) затока, за́вад; **2.** губа́, ву́сьніна В. кр. сл.
губы — гу́бы, ву́сны; (*насмешливо*) грыбы́, цымба́лы
дуть губы — закапы́льваць гу́бы
сжать губы — сьці́снуць гу́бы
губан — губа́р, губа́ч
губастый — губа́ты, грыба́сты
губернатор — губэрна́тар
губерния — губэрня
губернский — губэрскі
губитель — згу́бнік, згу́бца
губительный — згу́бны, згу́бліві
губительство — згу́ба, зьнішчэньне
губить — губі́ць, ні́шчыць, пагубля́ць, звадзі́ць
губка — гу́бка
губной — губны́
губошлёп — разьзя́ва (разя́ва), разьзява́ка (разява́ка)
губчатость — (*ткани*) губкава́тасьць
губчатый — губкава́ты
гувернантка — гувэрна́нтка, выхава́льніца
гувернёр — гувэрне́р, выхава́льнік
гугнивый — *см.* **гнусавый**
гудение — гудзе́ньне
гудеть — гусьці́, гудзе́ць
гудок — гудок
гуж — гуж
гужевой — гужавы́
гужом — гу́жам
гул — гудзе́ньне, гук, гул
гулёж — гульня́
гулкий — гу́чны, галосны
гулко — гу́чна, галосна
гульба — *см.* **гулёж**
гульбище — ігры́шча
гуляка — гуля́ка, гульта́й, лодар, латру́га, буса́йла
гулянье — гу́лі, гульня́, гуля́ньне, ігры́шча
гулять — **1.** гуля́ць; **2.** (*лентяйничать*) гультаява́ць, латрава́ць (*ср.* **бить баклуши**)
гулящий — *см.* **гуляка**
гулящая девка — ку́рва
гуманизм — гуманізм
гуманист — гуманісты
гуманистический — гуманісты́чны
гуманитарный — гуманіта́рны
гуманность — гума́ннасьць, лю́дзкасьць
гуманный — гума́нны, лю́дзкі
гуменник — прыгуме́ньне
гуменце — гуме́нца
гуммиарабик — гуміара́бік
гумно — гумно, клу́ня
приспособление на гумне для просушки снопов — азярод
место за гумном — загуме́ньне
гумус — гу́мус, перагной
гурия — гу́рыя, ра́йская дзяўчы́на
гурт — гурт, агу́л
гуртовой — гуртавы́, агу́льны
гуртом — агу́лам, ра́зам, гу́ртам
гурьба — гу́рма
гурьбой — гу́рмам, грамадой
гусар — гуса́р
гусарский — гуса́рскі
гусеница — ву́сень
гусёнок — гусяня́
гусиный — гусі́ны, гуся́чы
гусиный жир — шма́лец
гусли — гу́сьлі
гусляр — гусьля́р
густенёк — гусьце́нькі
густера — *зоол.* (*Blicca boerkna L.*) цяроха з. т.
густеть — гусьце́ць
густо — гу́ста
густой — густы́
густота — гушчыня́, гу́шча, гу́стасьць, гусьце́ль В. кр. сл.
густошёрстый — руні́сты
гусыня — гу́ска, гусь
гусь — *зоол.* (*Anser*) гуса́к
гуськом — гу́жам, наўсьця́ж, ключом
гусятина — гуся́ціна
гусятник — гуся́тнік
гуттаперча — гу́ма
гуттаперчевый — гу́мавы
гуща — гу́шча, гушча́р; (*остатки на дне*) фуз

Д

да — але́, але́ ж, ды, дый, ага́, эге́, а то ж, а ўжо ж, так
да вот — ужо ж
да разве — ці ж, альбо ж, няўжо ж, хіба́ ж
да уже — ужо ж
да и только — дый годзі
да будет — няха́й бу́дзе, ста́нься
да и то правда — то бо й то
ни да ни нет — ні так ні сяк
дабы — каб
давалец — дава́льнік
даватель — даве́ц
давать / дать — дава́ць / даць, надава́ць
давать взаймы — пазыча́ць
давать дороже — перадава́ць
давать залп — выпа́льваць
давать знать — паведамля́ць, нака́зваць
давать клятву — запрысяга́ць
давать насильно — упіра́ць
дать отступного — даць адчэпнага
дать отчёт — здаць спра́ву
дать очную ставку — зьвясьці вочы на вочы
дать промах — схібіць, спудлава́ць
дать приют — прытулі́ць
дать себя знать — да́цца ў зна́кі
дать тумака — штурхану́ць, даць штурха́нца
дать тягу — даць драпака́, пусьці́цца наўце́кі
дать что-н. — перакі́нуць
дать делу другой оборот — перавярну́ць спра́ву
давать обед (ужин, пир) — спраўля́ць абе́д (вячэру, банке́т)
даваться / даться — дава́цца / да́цца
давеча — надоячы (надоечы), анагды́сь, нядаўна
давешний — надоячны (надоечны), нядаўні
Давид — *и. соб.* Давы́д
давильный — ці́скальны
давить — **1.** ці́скаць, дави́ць, гнясьці́, душы́ць; **2.** му́ліць
давит грудь — сэрца сьціска́е
ботинок давит — кама́ш му́ляе
давка — сьціск, да́ўка, даўката́
давление — ціск, на́ціск, даўле́ньне, нагнёт
давненько — даўню́тка, подаўна
давний, давнишний — да́ўні, даўню́ткі
давно — даўно, даўне́й
довольно давно — подаўна
давно это было — гэта было, калі́ яшчэ швэд босы хадзі́ў
давнопрошедший — *грам.* даўномину́лы
давность — да́ўнасьць, даўніна́
давным-давно — даўно-даўно
Дажбог — *миф.* Дажбог
даже — аж, ажно, на́ват, нат, а́ні
даже до — аж да, што да
и даже — а то й
если даже — калі́ на́ват
дактилический — дактыліч́ны (*верш*)
дактиль — да́ктыль
далее, дальше — да́ле́й, дальш, нада́лей, да́лі
далёкий — дале́кі (далёкі), да́льні
далеко — дале́ка (далёка)
далеко так идти — такі́ сьвет ісьці́
далёконько — далекава́та, падале́ка
далёкость — дале́касьць (далёкасьць)
даль — даль, далячыня́, да́леч
дальнейший — дале́йшы, напатомны

в дальнейшем — надáлей
дальний — дáльні, далéкі (далёкі)
дальний путь — вялíкая дарога
дальнобойность — далекабóйнасьць, далекастрэльнасьць
дальнобойный — далекабóйны, далекастрэльны
дальновидность — празóрнасьць, абáчлівасьць
дальновидный — празóрны, празóрлівы, абáчлівы
дальнозоркий — далеказрóчны
дальнозоркость — далеказрóчнасьць
дальномер — дальнамéр
дальномерный — дальнамéрны
дальномерщик — дальнамéрнік
дальность — *см.* **далёкость**
дальше — *см.* **далее**
дама — дáма, пáня; (*в картах*) пáнфіль, дáмка, крáля
даман — *зоол.* (*Hyrax*) дамáн
Дамаск — *г.* Дамáск
дамба — дáмба, грэбля, гаць
дамка — (*в игре в шашки, карты*) дáмка
дамский — дáмскі, жаночы
Даниил — *и. соб.* Данíла
Дания — Дáнія
данник — дáньнік
даннический — дáньніцкі
данный — дáдзены, дáны
данное — дáнае м. т., дáдзенае
дантист — дантысты, зубны лéкар
Данциг — *г.* Гданск
данцигский — гдáнскі
дань — данíна
дань зерном — асянíна
дань за проезд — вазовае
дар — дар, падарýнак
дар на память — пáмятка
дар слова — моўнасьць
Дарданеллы — Дарданэлы
дарёный — дарабáны
дарить — дарыць, дарабáць, абдáрваць (*каго чым*)
дармовой — *см.* **даровой**
дармоед — дармаéд
дарование — (*талант*) тáлент, талáнь, здольнасьць, здáтнасьць
дарование — дарабáньне
даровать — дарабáць, абдáрваць (*каго чым*)
даровитость — талéнтнасьць, таланавíтасьць, здольнасьць, здáтнасьць
даровитый — талéнтны, таланавíты, здольны, здáтны
даровой — дарэмны, дармавы (дармовы); даравы, дарабáны
даровщина — дарэмшчына
даром — **1.** дармá, задáрма; **2.** (*напрасно*) дарэмна, задармá задарэмна, мáрна, на дурнíцу
дароносица — дараносіца
дарственный — дарабáны
дарственная грамота — дарабáльны ліст
Дарья — *и. соб.* Адáр'я, Дáр'я, Дáрка
дата — дáта
датель — давéц
дательный — (*падеж*) давáльны (*склон*)
датировать — азначáць дáту, датавáць
датский — дáньскі
датчанин — даньчáнін
дать — *см.* **давать**
дача — **1.** даньнё, давáньне, падáча; **2.** лéтніца; **3.** (*лесная дача*) дзялянка
даяние — давáньне
даятель — *см.* **даватель**
два — два
двадцатигранник — дваццацісцéньнік прáвільны, ікасáэдр (ікасáэдар) м. т.
двадцатигранный — дваццацісцéнны
двадцатилетний — дваццацігадовы
двадцатый — дваццáты
двадцать — двáццаць
дважды — двойчы, падвойчы, падвакроць, два разы
две — дзьве (*р.* дзьвёх, дзьвюх)
двенадцатигранник — дванаццацісцéньнік
двенадцатиперстный: двенадцатиперстная кишка — дванáстка, дванаццаціпáлая кíшка ан. т.
двенадцатый — дванáццаты, дванáнцаты
двенадцать — дванáццаць, дванáнцаць
дверка — дзьвéрцы, дзьвéркі
дверной — дзьвéрны
дверцы — дзьвéрцы, дзьвéркі; (*у ворот*) фортка
дверцы револьвера — зáсланка рэвальвéру в. т.
дверь — дзьвéры (*только мн.*)
дверь одностворчатая — дзьвéры ардынáрныя
двести — дзьвéсьце

Д

двигатель — рухавік
двигательный — рухавы́
двигать / двинуть — ру́хаць / ру́шыць; соваць / су́нуць; кра́таць / кану́ць; пасува́ць / пасу́нуць; пару́шыць, папхну́ць
двигаться / двинуться — ру́хацца / ру́шыцца; совацца / су́нуцца; падава́цца / пада́цца
с места не двинусь — з ме́сца ня ру́шуся
движение — рух, рушэнне; ход, бег
движение населения — зьме́на лю́днасьці г.-к. т.
движение произвольное — рух адвольны пс.-л. т.
дать делу движение — даць спра́ве ход
дело лежит без движения — спра́ва ня ру́хае напе́рад
привести в движение — зварухну́ць, пасу́нуць
движимость — рухомасьць
движимый — рухомы
движимое имущество — рухомая маёмасьць
движущийся — рухомы
Двина — *р.* Дзьвіна́
Двинск — *г.* Дзьвінск, Дына́бург
двое — двое
двоебрачие — **1.** другажонства, другі шлюб; **2.** двужонства
двоебрачный — **1.** другажэнец, другашлю́бны; **2.** двушлю́бны
двоедушие — двуду́шнасьць, фальшы́васьць, няшчы́расьць
двоедушничать — двуду́шнічаць, фальшы́віць, крыві́ць
двоедушный — двуду́шны, фальшы́вы, няшчы́ры
двоежёнство — *см.* **двоебрачие**
двоекратный — двукра́тны, двуразовы
двоемыслие — двузна́чнасьць, вага́ньне, ду́маньне надвое
двоение — двае́ньне; падвае́ньне, раздвае́ньне
двоеточие — *грам.* двукроп'е
двоить — два́іць, падваяць
двоиться — двоіцца
двойка — двойка
двойник — спары́ш
двойной — падвойны, двойчаты, дубальтовы
двойное количество — ду́бальт
двойня — двайня́ты, блізьня́ты
двойственность — двоістасьць
двойственный — двоісты
двойственное число — *грам.* па́рны лік
двор — двор, панадворак, дзядзі́нец; (*крытый, обнесённый надворными постройками*) даржэнь, даржні́к Мядз.
двор постоялый — зае́зны двор
скотный двор — за́гарада, абора, стадола
дворец — пала́ц
дворецкий — аканом
дворик — дварок
дворище — вялі́кі двор, дворышча, панадворышча
дворник — дворні́к, вартаўні́к
дворницкая — дворні́цкая
дворничиха — дворні́чыха
дворня — чэлядзь
дворняга, дворняжка — дварня́к
дворовый — дваровы, дамовы
дворянин — дваране́н, шля́хціц
дворянка — дваря́нка, шляхця́нка
дворянский — дваря́нскі, шляхе́цкі
дворянство — дваря́нства, шляхе́цтва
дворянчик — шляхцю́к
двоюродный — стрые́чны, збратдзе́тны
двоюродная сестра — стры́ечка
двоюродные родственники — з-братдзе́ці
двоякий — два́які, падвойны
двояко — два́яка, на́двае
двояковыпуклый — дваякавы́гнуты
двоякоперистый — (*лист*) двойчапе́ры б. т.
двоякость — два́якасьць
двубрачие — *см.* **двоебрачие**
двуглавый — двугаловы
двуглазый — двувокі, двохво́кі
двугласный — двугалосны
двугривенник, двугривенный — двацца́тка, саракоўка
двугубый — двугу́бы
двудневный — двудзённы, двохдне́вы
двудомные — *бот.* рознапне́выя
двузначный — двохзна́чны
двузначное число — *мат.* двохзна́кавы лік
двузубец — *бот.* (*Bidens*) саба́чка
двузубый — двузу́бы
двуколейный — двукале́йны
двуколка — бяда́
двуконечный — двуканцовы
двуконный — двуконны, параконны
двукопытный — двукапы́тны

двукратно — два́краць
двукратный — двукра́тны
кабачок: кабачки — кабачкі́, гарбу́зікі
кабачок — карчомка, шынок
кабель — ка́бэль
кабельный — ка́бэльны
кабинет — габінэт, пакой
кабинетик — габінэцік
кабинетный — габінэтны
каблук — абса́ц, за́днік, падбор
каблучник, каблучный мастер — абса́цнік
каблучница — абса́цніца
каблучный — абса́цны
каботаж — кабата́ж
каботажный — кабата́жны
кавалер — кавале́р
кавалерийский — кавалеры́йскі, конны
кавалерист — кавалеры́сты, коньнік
кавалерия — коньніца, кавале́рыя
кавалерский — кавале́рскі
кавардак — гармі́дар, разгардзія́ш, гама́рня, мешані́на
кавардачить — гармідарава́ць
кавардачный — гармі́дарны
каверза — ка́пасьць, абмова, нагавор, ка́верза
каверзник — ка́пасьнік, ка́верзьнік, абмоўнік, баламу́т
каверзница — ка́пасьніца, ка́верзьніца, абмоўніца, баламу́тка
каверзничать — ка́пасьнічаць, каверзава́ць, абмаўля́ць, зводзіць, баламу́ціць
каверзный — ка́пасны, ка́верзны
каверна — *анат.* пячора ан. т.
Кавказ — Каўка́з
кавказец — каўка́зец
кавказский — каўка́скі
кавычки — ду́жкі, чужаслоў, ла́пкі гр.-л. т.
кагал — кага́л
кагальный — кага́льны
кагор — кагор (*віно*)
кадастр — када́стар
кадет — кадэт
кадетский — кадэцкі
кадило — кадзі́ла; жыга́ла

кадильница — кадзі́льня
кадильный — кадзі́льны
кадить — кадзіць, жыга́ць
кадка, кадушка — дзяжа́, дзе́жка, каду́шка, ка́дка, ка́даўб; (*кадушка для мытья белья*) бале́я; (*дубовая*) дубоўка; (*из-под селёдок*) селядоўка
кадочка — дзе́жачка; (*с ушками*) фа́ска; (*сельдяная*) селядоўка; (*из липы*) ліпаўка; (*с крышкой и замком*) ку́бел, ку́блік
кадочник — бондар
кадр — кадр (ка́дар)
кадровый — ка́дравы
кадык — кады́к, гарля́нка
кадычный — кадыковы
каёмка, каёмочка — беражок, ускра́ек
каждение — каджэнье
каждодневно — абыдзе́нна (абыдзённа), штодзе́нна (штодзённа), штодзе́нь
каждодневный — абыдзе́нны (абыдзённы), штодзе́нны (штодзённы)
каждолетний — штого́дні, што́рочны
каждомесячный — штоме́сячны
каждоминутный — штомінўтны
каждонедельный — штотыднёвы
каждочасный — штогадзі́нны
каждый — кожны (кожан), абы́-хто, уся́кі, уся́ляк; (*при отрицании*) жа́дны
каждый день — штодзе́нь, дзень у дзень, дзень пры дню
каждую ночь — што́ноч, што́ночы
решительно каждый — кажнюсенькі
кажется — *безл.* здае́цца, здэцца, ба́чыцца, падобна
казак — каза́к
казакин — казачы́на
казарма — каза́рма, каша́ры
казарменный — каза́рменны, каша́равы, каза́рмавы
казать — (*что*) пака́заць (*што*)
казаться — пака́заццa; *глаг. безл.* здава́цца
казацкий, казачий — каза́цкі, казаковы
казачить — казакава́ць
казачка — каза́чка
казачок — казачок
казеин — *хим.* казэ́ін
каземат — казэма́т
казёнка — пры́печак; каморка, сыпіжа́рня; манаполька
казённый — скарбовы, дзяржа́ўны, казённы
казённая часть ружья — за́дняя часьці́на стрэльбы
Казимир — *и. соб.* Казіме́р
казисто — пака́зна, пры́кла́дна
казистый — пака́зны, пры́кла́дны
казна — скарб, скарбні́ца
казначей — ска́рбнік
казначейский — скарбовы
казначейство — скарбоўня
казначейша — жонка ска́рбніка
казнить — (*кого*) кара́ць сьме́рцю, ка́тава́ць (*каго*)
казниться — му́чыцца
казнохранилище — скарбоўня, скарбахава́льня
казнохранитель — ска́рбнік
казнь — ка́ра, ка́ра сьме́рцю, ка́тава́ньне
приговорить к смертной казни — асудзі́ць на сьмерць
казовый — паказны́
казуар — *зоол.* казуа́р
казус — прыгода, вы́па́дак, здарэньне
Каин — Ка́ін
кайма — бе́раг, ускра́ек, аблямоўка, шляк *лс. т.*
кайман — *зоол.* (*Alligator*) аліга́тар
как — як
как бы — як бы, ні́бы
как же — чаму́ ж
как же не так — чаму́ ж не
как будто — мэрам; як бы́ццам, ні́бы, ні́быта
как будто так — то бо то, то бо то што
как будто не — як бы́ццам не
как придётся — як тра́піцца, як здары́цца
как угодно — як зна́еце, як хаця́
как следует — як нале́жыць, як ма́е быць
как вдруг — аж вось
как скоро — як толькі
как попало — як-не́будзь, нядба́ла
как нарочно — як на тое, як наўмы́сьля
как раз — якра́з
как так — як то
как есть — зусі́м, цалком, чы́ста
какао — кака́ва
какая — *см.* **какой**
как-либо, как-нибудь — як-не́будзь, як-колечы, абы́-як
как-никак — як-ні́як
каков, каковой — які́
каково — як
каково вам живётся — як ма́ецеся
какое — *см.* **какой**

К

какой — *м.* які́ (*ж.* яка́я), (*ср.* якое)
какой-либо, какой-нибудь — які́-не́будзь, які́-колечы, абы́-які́, сякі́-такі́
какой-то — які́йсь, які́сь
как-то — не́як, я́кась
кактус — *бот.* (*Cactus*) ка́ктус
кал — кал; гной
каламбур — жарт, жартаслоўе л. т.
каламбурист — жартаўні́к, жартасловец
каламбуристка — жартаўні́чка
каламенок — калама́йка
каланча — ве́жа, ба́кшта; каланча́
калач — кала́ч, пірог
калачик — кала́чык
калачник — кала́чнік
калачница — кала́чніца
калачный — кала́чны
калейдоскоп — калейдаскоп
калека — кале́ка, кале́чка
календарный — каляндарны
календарчик — каляндарык
календарь — каляндар
календы — кале́нды
каление — гартава́ньне; расьпяка́ньне; пражэньне
калёный — гартава́ны, га́ртны; расьпе́чаны; пра́жаны
калеченый — кале́кі, пакале́чаны, скале́чаны, абязьве́чаны
калечить — кале́чыць, бязьве́чыць
калиберный — калі́бравы
калибр — калі́бар
калиевый — ка́ліевы
калий — ка́лі
калика — ста́рац
калильный — гартава́льны
калильня — гартава́льня, гартоўня
калина — *бот.* (*Viburnum opulus L.*) калі́на
калинник — калі́ньнік
калиновый — калі́навы
калита — калі́та́, машна́; (*кожаная*) шабе́та
калитка — фортка
калиточка — фортачка
калить — гартава́ць; расьпяка́ць, пра́жыць, сма́жыць
калкун — і́ндык
каллиграф — каліграф, прыгожапісец
каллиграфия — каліграфія, прыгожапіса́ньне
калмык — калмы́к
калмычка — калмы́чка
калорийность — калярыйнасьць
калорийный — калярыйны
калориметр — калярымэтр (калярымэтар)
калория — калёры
калоша — калоша
Калуга — *г.* Калу́га
калужница — *бот.* (*Caltha L.*) лапаце́нь, лопаць б. т., (*Caltha palustris F.*) лапу́ха в. кр. сл.
калуфер — *бот.* (*Tanacetum balsamita L.*) *см.* **кануфер**
калым — калы́м, даніна
калькулятор — таксатар, калькуля́тар
калькуляция — таксава́ньне, калькуля́цыя
кальсоны — сподніа, ма́йткі, штаны́
кальций — ка́льцы, ва́пень х. т.
кальцит — кальцы́т, шпат вапняковы г.-м. т.
калякание — бала́каньне, гамонка, раздабарваньне, дуду́каньне
калякать — бала́каць, гаманіць, зю́каць, раздабарваць, дуду́каць
камаши — кама́шы, чарані́кі
камбала — *зоол.* (*Pleuronectes*) ка́мбала
камбий — мязга́, твор
камедь — гу́ма
камедь свинцовая — смолка валявя́ная г.-м. т.
камелия — *бот.* (*Camellia L.*) камэлія
каменистый — камяні́сты
каменка — ка́менка
каменноугольный — каменнавугальны
каменный — каме́нны, мурава́ны
каменный дом — камяніца
каменный фундамент — падму́рак
каменная настилка — брукоўка
каменная стена — мур
каменная болезнь — ка́мень
каменный уголь — каме́нны ву́галь
каменобитный — каменябі́тны
каменобитня — каменябі́тня
каменование — каменава́ньне
каменовать — каменава́ць
каменолом — каменялом
каменоломный — каменяломны
каменоломня — каменяломня
каменотёсный — каменячосны
каменщик — му́ляр, му́раль
камень — ка́мень
камень адский — ка́мень пяке́льны
камень амазонский — ка́мень амазонскі, амазаніт

камень аспидный — лупня́к а́сьпідны (га́сьпідны), ка́мень гры́фельны
камень горновой — ка́мень горнавы
камень горшечный — ка́мень гаршэчны, тальк
камень драгоценный — ка́мень дарагі́
камень жерновой — ка́мень жорнавы, ка́мень млыновы
камень квасцовый — ка́мень галыновы, галы́н, алюні́т
камень краеугольный — ка́мень нарожны
камень лунный — ка́мень ме́сячкавы
камень лучистый — ка́мень прамяні́сты
камень облицовочный — ка́мень ніцава́льны
камень оловянный (касситерит) — цыня́к (касітэры́т)
камень пробный (чёрная яшма) — лідыйскі кварц; спробны ка́мень, чорная яшма́
камень роговой — ка́мень рагавы́
камень солнечный — ка́мень сонечны
камень точильный — ка́мень тачы́льны
камень тяжёлый (шеелит) — ка́мень ця́жкі
камень философский — ка́мень філязофскі
надгробный камень — надгробак
камера — камора
камердинер — пакаёвы
камеристка — пакаёўка
камертон — камэртон
камешек, камушек — каме́ньчык
камея — камэя
камзол — камзэлька, камізэлька
камилавка — каміла́ўка
камин — комін
камка — адама́шка
камлот — камлёт
камнеломка — *бот.* (*Saxifraga L.*) каменяломнік б. т.
камнесечение — каменясячэньне
кампания — кампа́нія, таварыства, сяброўства; паход
камфарник — *бот.* (*Camphora officinalis L.*) камфорнік
камфора — камфора
камфорка — камфорка
камфорный, камфоровый — камфоравы
камчадал — камчада́л
Камчатка — Камча́тка
камчатый — адама́шкавы
камыш — *бот.* (*Scirpus L.*) чарот, мі́ліца, сі́тняк б. т.
камышевка — чаратоўка
камышница — *зоол.* (*Gallinula chloropus*) зялёнаножка з. т.
камышовый — чаротавы
канава — кана́ва, роў
канавка — кана́ўка, равок
канадец — *анат.* ходзік ан. т.
канал — кана́л, ход, кана́ва
канал жёлчный — *анат.* кана́л жаўцёвы
канал мочеиспускательный — *анат.* кана́л мачавы́
канал пищепроводный — *анат.* страваход
канал морской — кана́л морскі
канал обходный — кана́л абходны
канал оросительный — кана́л абвадня́льны
канал осушительный — кана́л асуша́льны
канал речной — кана́л рэчны
канал соединительный — кана́л злуча́льны
канал судоходный — кана́л суднаходны
канал ствола оружия — *воен.* ку́ля, ход ру́лі
канализация — каналіза́цыя
канализировать — каналізава́ць
канальский — шальмоўскі
каналья — шэльма, пага́нец, паску́да
канапе — кана́па
канареечка — кана́рачка
канареечный — кана́ркавы
канареечное дерево — *бот.* (*Canarium commune L.*) кана́ркавае дрэва
канарейка — *зоол.* (*Fringilla canariensis*) кана́рка; кана́рак
канарейник — *бот.* (*Phalaris L.*) чаротніца
канарейное семя — *бот.* (*Phalaris canariensis L.*) чаротніца кана́рская б. т.
канат — лі́на, кана́т
канатик — лі́нка; матуз, матузок, паўроз, паўрозік
канатный — кана́тны, лі́навы
канва — канва́
кандалы — ланцугі, кандалы́, кайда́ны, пу́ты, зяле́зы; (*деревянные*) калодкі
кандальник — ланцу́жнік, калоднік
канделябр — кандэля́бар
кандидат — кандыда́т
кандидатка — кандыда́тка
кандидатский — кандыда́цкі
каникулы — вака́цыі, адпачы́нак
каникулярный — вакацы́йны, адпачы́начны, адпачы́нкавы
канителить — мару́дзіць

канитель — цыганíна, марýда
канительный — марýдны
канифас — каніфáс
канифоль — жывíца, каніфоля
каннибал — людаéд
каннибализм — людаéдзтва
канон — **1.** прáвіла, норма; **2.** канон
канонада — кананáда, бамбавáньне, гармáтная страляніна
канонерка — кананéрка, гармáтаўка
канонир — кананíр, гармáтнік
кансиона — кансыёна
кант — **1.** *лит.* кант.; **2.** (*край*) кант, бéраг, руб
кантата — кантáта, хвáльная пéсьня
кантон — кантон, акрýга, павéт
кантонист — кантаністы
канун — перадзéнь, перадсьвя́та, канон
канун Рождества — куцьця́
канун Крещения — галодная куцьця́
канун Нового года — багáтая куцьця́; шчодрык, шчодрая куцьця́, шчодры вéчар
кануть — кáпнуць, крáпнуць; прапáсьці, запрапáсьці, зьнíкнуць, патанýць
кануфер — *бот.* (*Tanacetum Balsamita L.*) калýфер б. т.
канцелярист — канцылярысты
канцелярия — канцылярыя
канцелярский — канцылярскі, канцылярыйны
канцион — *лит.* канцыён
канцлер — кáнцлер
канцлерский — кáнцлерскі
канцона — *лит.* канцона
канюк — *зоол.* (*Strix scops*) кáня
канючить — назаля́ць, кáнькаць, цыгáніць
каолин — каалін, белаглінь г.-м. т. бéлая гліна
кап — (*лес*) наплы́ў лс. т.
кáпание — кáпаньне, крáпаньне
кáпать / кáпнуть — кáпаць / кáпнуць; крáпаць / крáпнуць
капелла — капэля
капелька — кáпелька, кáпачка, кропелька, крапíнка, сьлязíнка, брызка
капельмейстер — капэльмáйстар, кіраўнік аркéстру
капер — капéр, морскі разбойнік
каперс — *бот.* (*Capparis spinosa L.*) кáпар
каперсы, каперцы — кáпары
капиллярный сосуд — валасьнік ан. т.
капитал — капітáл, грошы, ísта
капитал вспомогательный — капітáл дапаможны
капитал оборотный — капітал зваротны
капитал основной — капітáл асноўны, ísta
капиталец — капітáльчык, грашаня́ты
капиталист — капіталісты, багатыр
капиталистический — капіталістычны
капиталистка — капіталістка, багатырка
капитальный — капітáльны, грунтоўны, асноўны
капитан — капітáн
капитель — *архит.* капітэль, мáкаўка
капитул — капітýл
капитулировать — капітуляваць, здавáцца
капитуляция — капітуля́цыя
капище — мольбíшча, бажніца
капкан — пáстка; (*на птиц*) сіло
каплун — каплýн
каплунный — каплуновы
капля — кáпля, кропля, кáпка; (*росы*) расíца; (*жира на воде*) скáлка
капор — каптýр
капот — капота
капрал — капрáл
капральский — капрáльскі
каприз — капры́с (капры́з), вы́брык
капризник — капры́сьнік (капры́зьнік)
капризничать — капры́сіць (капры́зіць), наравíцца, карожыцца
капризный — капры́сны (капры́зны), наравíсты, натýрысты
капсула — кáпсюля
капсюль — кáпсюль, пістон
капсюльный — кáпсюльны, пістонавы
капуста — *бот.* (*Brassica L.*) капýста
капуста брюссельская — (*B. oleracea gemmifera L.*) капýста брусэльская
капуста кочанная — (*B. ol. capitata*) капýста качановая
капуста савойская — (*B. ol. Sabauda*) капýста савойская
капуста спаржевая — (*B. ol. asparagoides*) капýста шпараговая
капуста цветная — (*B. ol. caulifera*) капýста кучарáвая, каліфáравая
капуста заячья — *бот.* (*Sedum maximum Suff.*) расходнік вялікі
сечь капусту — шаткаваць (крышы́ць) капýсту
капустка — *бот.* (*Sedum acre L.*) (*см.* **очиток**)

капустница — бе́лы маты́ль
капустный — капу́сны
капут — капу́т, капе́ц, саду́хі
капуцин — *зоол.* (*Cebus*) капуцы́н
кара — ка́ра, кара́ньне
карабин — карабі́н
карабиновый — карабі́навы, стрэ́льбавы
карабкание — кара́бканьне, дра́паньне
карабкаться — кара́бкацца, дра́пацца
каравай — карава́й, бохан
каравайчик — карава́йчык
караван — карава́н
карагазин — *бот.* (*Anabasis aphylla L.*) карагазы́н
караган — *зоол.* (*Canis melanotus*) кара́н, стэпавы ліс
карагатка — *зоол.* (*Anas rutila*) чырвоная ка́чка
карагач — *бот.* (*Ulmus campestris*) бе́раст б. т.
караим — караі́м
каракатица — (*Sepia officinalis*) сьлі́зень
караковый — ру́ды, цёмна-гне́ды
каракулевый — смушковы
каракуль — сму́шак
каракуля — крыву́ля, грымзані́на
каракушки — кукярэ́чкі (кукарэ́чкі)
карандаш — аловак, каранда́ш
карандашик — аловачак, каранда́шык
карантин — каранты́н
карантинный — каранты́навы
карапуз, карапузик — курду́пель, курду́плік, каранты́ш
карапузистый — курду́плісты, каранты́шны
карась — кара́сь
карат — (*мера*) кара́т
каратель — ка́рнік, кара́цель
карательный — ка́рны
карать — (*кого*) кара́ць
караул — *сущ.* ва́рта, старожа, калаву́р; *межд.* ратуйце
вступать в караул — стаць на ва́рту
кричать караул — на гвалт крыча́ць
караулить — варта́ваць, калаву́рыць, сьцерагчы́, пільнава́ць
караульная, караульня — калаву́рка, ва́хта, бу́дка, старожка
караульник, караульный, караульщик — вартаўні́к, варты́, вартаўні́чы, калаву́рны
карачун — карачу́н, капе́ц
карболка — карболка, карболь
карбонат — *мин.* карбана́т, вугля́к, сьвідрава́льны ка́мень г.-м. т.
карбункул — *мин.* іскра́к; *мед.* карбу́нкул
карга — карга́, качарга́
каргаль — *зоол.* (*Anas tadorna*) ка́чка, чы́рка
карда — часа́лка
кардамон — *бот.* (*Amomum Cardamomum L.*) кардамон
кардинал — **1.** *церк.* кардына́л; **2.** *зоол.* (*Tanagra*) кардына́л
кардинальный — кардына́льны, галоўны
карел, кареляк — карэл
Карелия — Карэ́лія
карельский — карэ́льскі
карельская берёза — чачотка
карета — карэта, калама́жка
каретка — карэтка
каретник — калёсьнік, стальма́х
каретный — карэтны, калама́жкавы
карий — ка́ры
карикатура — карыкату́ра
карикатурист — карыкатуры́сты
карканье — кра́каньне, ка́рканьне, ка́ўканьне
каркать/каркнуть — кра́каць / кра́кнуць; ка́ўкаць / ка́ўкнуць; накліка́ць / накліка́ць (*бядў*)
Карл — *и. соб.* Кароль
карлик — ка́рла
карлица — ка́рліца
карличий — ка́рлавы
кармазин — кармазы́н
кармазиновый — кармазыновы
карман — кішэня, кішэнь
карманник — (*вор*) кішэньнік, машнарэз
карманный — кішэнны, кішанёвы
кармашек, карманчик — кішэнька, кішонка
кармин — кармі́н
карминовый — карміновы
карнавал — карнава́л
карнавальный — карнава́льны
карниз — гзымс, карні́з, ліштоўка, пале́іца; прыкамі́нак (*у пе́чы*)
карнизный — гзы́мсавы, карні́завы
карп — *зоол.* (*Cyprinus carpio*) карп
Карпаты — Карпа́ты
карта — ка́рта, ма́па
играть в карты — гуля́ць у ка́рты
картавить — карта́віць
картавость — карта́васьць
картавый — карта́вы
картёж — заўзя́тае гуля́ньне ў ка́рты, карты́ж
картёжник — карты́жнік, картагра́ч
картёжница — карты́жніца, картагра́чка
картёжный — карты́жны
картечь — картэча

К

картина — малю́нак, абра́з, карці́на
картинка — малю́начак, абразок, карці́нка
картинность — маляўні́часць, вобразнасць
картинный — маляўні́чы, вобразны
картишки — ка́ртачкі
картография — картагра́фія
картон — картон, кардон, бі́була
картон горный — *мин.* а́ркуш зе́мны, асбэст (азбэст) г.-м.т.
картофелина, картофелька — бу́льбачка, картоплінка
картофель — *бот.* (*Solanum tuberosum L.*) бу́льба, картопля, бараболя
картофельник, картофельное поле — бульбоўні́шча, картапля́ні́шча
картофельный — бульбя́ны́, картапля́ны
картофельная зелень — бульбоўнік, картапля́нік
карточка — ка́ртка, ка́ртачка
карточный — ка́рткавы
картуз — ша́пка з казырком
карусель — карусэля, круцёлка
карцер — ка́рцар, кату́х
карьер — трушок
в карьер — трушком, наўзгалёп
карьера — кар'е́ра
карьерист — кар'еры́сты
касание — датыка́ньне, дачыне́ньне, чы́рканьне, дакрана́ньне, каса́ньне
точка касания — *мат.* пункт дотыку
касательно — датычна, адносна
касательный — датычны
касательство — датычнасць, дачыне́ньне
касатик — *бот.* (*Iris L.*) каса́ч, каса́ціца; (*Iris pseudoacorus L.*) кардоўнік В. кр. сл.
касатик водяной (болотный, жёлтый) — (*I. pseudoacorus L.*) каса́ч жоўты б. т., вужа́чкі
касатка — ля́бёдка
касаться — (*чего, до чего*) датыка́цца, дакрана́цца, чы́ркацца, торкацца (*чаго, да чаго*); займа́ць, чапля́ць (*каго, што*), каса́цца
что касается меня — што да мяне́
это мало меня касается — гэта ма́ла мяне́ датычча (абходзіць)
каска — ка́ска
каскад — каска́д, вадаспа́д пры́стýпкавы г.-к. т.
Каспий, Каспийское море — Касьпі́йскае мора
касса — ка́са
касса несгораемая — ка́са незгара́льная
касса сберегательная — ка́са ашчэ́днасьці (ашча́днасьці)
кассационный — касацы́йны
кассация — каса́цыя
Кассиопея — (*созвездие*) Вісажа́р
кассир — каси́р, ска́рбнік
кассирование — касава́ньне
кассировать — касава́ць
кассирша — каси́рка, ска́рбніца
кассовый — ка́савы
каста — ка́ста
кастелян — кашталя́н
кастить — касьці́ць, га́дзіць
Кастор — (*альфа Близнецов*) Ка́стар
кастор — кастор
касторка — рыцы́на
касторовый — касторавы, рыцы́навы
касторовая шляпа — капялю́ш
кастрат — кастра́т, лягча́нец, спакла́даны
кастрация — кастра́цыя, лягча́ньне, спакла́даньне
кастрирование — лягча́ньне, спакла́даньне
кастрировать — лягча́ць, спакла́даць
кастрюля, кастрюлька — кастрю́ля, рондаль, рондлік
катавасия — катава́сія, сва́рка, калатне́ча, гармі́дар, завіру́ха
катакомбы — катакомбы, пячоры
каталепсия — катале́псія
каталептик — катале́птык
каталог — каталёг, рэчасьпіс, кнігасьпіс
каталогизация, каталогизирование — каталягава́ньне
каталогизировать — каталягава́ць
катальный — кача́льны
катальный станок — ма́галь, качолка (кача́лка)
катальщик — кача́льнік
катальщица — кача́льніца
катание — пае́здка, паяжджа́ньне; (*по льду*) коўзаньне; (*белья*) маглява́ньне, маглёўка, прасава́ньне, кача́ньне
катанный — кача́ны, маглява́ны, пасу́каны
катар — *мед.* ката́р
катаракта — *мед.* катара́кта, бяльмо
катастрофа — *драм.* катастрофа, разьвя́зка
катать — кача́ць, каці́ць; вазі́ць; (*бельё*) маглява́ць, прасава́ць
кататься — кача́цца, е́зьдзіць; гойдацца
кататься со смеху — сьмяя́цца аж за бакі бра́ цца

К

кататься по льду — коўзацца
катафалк — катафа́лк
категорический, категоричный — катэгары́чны; рашу́чы, бязумоўны
категорично — рашу́ча, бязумоўна
категория — катэго́рыя
Катенька — *и. соб., ласк.* Кацяры́начка
катер — ка́тэр
Катерина — *и. соб.* Кацярына, Катары́на
катет — *мат.* ка́тэт
катетер — *хир.* ката́тэр
катехизис — катахі́зм
катить — каці́ць, ту́рыць
катиться — каці́цца
катище — (*место склада леса для сплавки рекой*) рум лс. т.
катки — качо́лкі (ката́лкі), ма́глі
каткий — коткі
катком — кацьма́
каткость — коткасьць
катод — *физ.* катод
каток — качолка (кача́лка), ма́галь; коўзанка, коўзалка, сьлі́зкаўка, каўзе́ль
католик — каталі́к
католикос — каталікос
католицизм, католичество — каталіцы́зм, каталі́цтва
католический — каталі́цкі
католичка — каталі́чка
катоптрика — катоптрыка
каторга — ка́тарга
каторжанин, каторжник — ка́таржнік
каторжанка — катаржа́нка
каторжный — ка́таржны
катушечка — шпу́лечка
катушка — **1.** шпу́лька; **2.** *зоол.* (*Planorbis*) скру́тка з. т.
Катюша, Катя — *и. соб.* Ка́ся
каурка — була́нка
каучук — каўчу́к, гу́ма, гумаля́стык
каучуковый — каўчу́кавы, гумаля́стыкавы
кафедра — катэдра, каза́льніца
кафедральный — катэдра́льны
кафедральный собор (костёл) — катэдра
кафельный — кахля́ны
кафля — ка́хля
кафтан — капта́н; жупа́н
качалка — калы́ска, зы́бка
качание — кача́ньне, калыха́ньне, гу́таньне, гоцаньне, люля́ньне, хіста́ньне; (*воды насосом*) пампава́ньне
качать — кача́ць, калыха́ць, гу́таць, гоцаць, зы́баць, мата́ць; (*воду*) пампава́ць
качаться — кача́цца, калыха́цца, гойдацца, гу́тацца, зы́бацца, хіста́цца, гу́шкацца
качели — гу́шканка, гу́шкалка, арэлі, гутарэлі
качественный — я́касны
качество — я́касьць
качим — *бот.* (*Gypsophila L.*) ва́пнаўка б. т.
качка — хіста́ньне, гойданьне, гойдаўка, калыха́нка
каша — ка́ша; *перен.* гармі́дар
каша жидкая — куле́ш
кашевар — кашава́р
кашель — ка́шаль
кашемир — кашамі́р
кашемировый — кашамі́равы
кашица, кашка — ка́шка
кашляние — ка́шля́ньне, кахі́каньне
кашлять / кашлянуть — ка́шляць / кашлянуць, кахі́каць / кахі́кнуць
кашне — ша́лік
кашник — **1.** гаршчок ад ка́шы; **2.** кашалю́б, кру́пнік
каштан — *бот.* (*Fagus castanea*) каштан
каштан конский — (*Aesculus hippocastanum L.*) каштан конскі
кащей — **1.** (*сухой человек*) шкі́льда, шкіляндзя́; **2.** (*скупец*) скна́ра, скупяндзя́; **3.** *миф.* кашчэй
каюта — каю́та, пакой на караблі́
каютный — каю́тавы
каяк — каяк
каяние — ка́яньне
каяться — ка́яцца, пакуту́аваць, шкадава́ць
квадерный: квадерный песчаник — *мин.* кантаслу́павы пескавік г.-м. т.
квадрант — квадра́нт
квадрат — квадра́т
квадратный — квадратовы, квадра́тны
квадратура — квадратура́
квака — *зоол.* (*Botaurus*) ча́пля
кваканье — квакта́ньне, кракта́ньне
квакать / квакнуть — квакта́ць / квакну́ць; кракта́ць; ку́мкаць
квакер — ква́кер
квакерский — ква́керскі
квакуха, квакушка — жа́ба; ка́чка
кварта — ква́рта
квартал — кварта́л, цы́ркуль
квартальный — кварта́льны
квартет — квартэт

К

квартетный — квартэтны
квартира — кватэра, дамоўка
квартирант — кватэра́нт
квартирантка — кватэра́нтка
квартирка — кватэрка
квартирмейстер — кватэрма́йстар
квартирный — кватэрны
квартирование — кватэрава́ньне
квартировать — кватэрава́ць
квартиронаниматель — кватэранайма́льнік
квартиросдатчик, квартирохозяин — гаспада́р кватэры
квартовый, кварточный — ква́ртавы
кварц — *мин.* кварц, крамня́к
квас — квас; (*сок берёзовый*) бярозавік; (*сок кленовый*) кляновік
квасить — ква́сіць, кі́сьліць
кваситься — ква́сіцца
квасноватый — кваснава́ты
квасной, квасный — ква́сны
квасовар — квасава́р
квасоваренный — квасава́рны
квасоваренный завод — квасава́рня
квасок — квасок
квасцовый — галыновы
квасцы — галы́н, галу́н
кваша — запа́ра
квашение — ква́шаньне
квашенина — квашані́на, халадзе́ц, сту́дзень
квашенный — ква́шаны
квашня — дзяжа́
кверху — дагары́, угару́
квинта — *муз.* кві́нта
квит, квиты — квіт, квіты
квитанция — квіт, квіток
квохтать — квакта́ць
кегель — ке́гель
кегельный — ке́глевы
кеглевидный, кеглеобразный — кеглява́ты
кегля — крэгля
кедр — *бот.* (*Pinus Cedrus L.*) кедр (ке́дар)
кедровка — *зоол.* (*Nucifraga*) арэхаўка з. т.
кедровый — ке́дравы
кейпер — кейпэр г.-м. т.
келарский — ке́ларскі
келарь — ке́лар
келейник — кяле́йнік
келейно — сакрэтна, таёмна, адзін на адзін
келейность — сакрэтнасьць
келейный — сакрэтны, таёмны
кельнер — ке́льнэр
кельнерша — ке́льнэрка
келья — ке́льля, ке́льня
кенгуру — кангу́р
кентавр — цэнта́ўр (цэнта́ўра)
керамика — кера́міка
Кербер — (*созвездие*) Цэ́рбэр
керкание — кі́рканьне
керкать — кі́ркаць
керосин — га́за, на́фта, карасі́на
керосинка — бляша́нка на га́зу
керосиновый — га́завы, карасі́навы
керосиновая лампочка — газоўка
кесарский — цэзарскі
кесарь — цэзар
кефаль — *зоол.* (*Mugil L.*) кефа́ль
кибитка — бу́да, буда́н
кивание — ківа́ньне
кивать / кивнуть — ківа́ць / кіўну́ць
киви — *зоол.* (*Apteryx*) бяскры́л
кивок — кіў, ківок
кивот — ківот, аса́да на абра́з, скры́ня
кивсяк — *зоол.* (*Iulus terrestris*) тысячаножка з. т.
кидальщик — кіда́льнік
кидание — кіданьне
кидать — кі́даць, шпурля́ць
кидаться — кі́дацца, ры́нуцца
кидается в глаза — б'е ў вочы
кидком — кідма́
Киев — *г.* Кіеў
кизельгур — кізэльгу́р
кизерит — кізэры́т
кизил — (*Cornus mas L.*) кізы́л, дрон
кизяк — су́шаны каровячы гной (*на апа́л*)
кий — кій
кикимора — ма́ра́, вычва́ра
кила — кіла́, грызь
кило — кілё
киловатт-час — кілуа́т-гадзі́на
килограмм — кілагра́м
килолитр — кіляліт (кіляліта́р)
километр — кілямэтр (кілямэтар)
килосечение — апэра́цыя кілы́, кіласячэньне
киль — трам, кіль
килька — *зоол.* (*Clupea latulus*) кі́лька
кимвал — цымба́лы
кинематограф — кіно, кінэмато́граф
кинематографический — кінэматаграфі́чны
кинжал — штыле́т, кінджа́л
кинжальный — кінджа́льны

киноварный — цынобравы
киноварь — цынобра
киновия — кіновія; бра́цтва
киносеанс — кіносэ́анс
кинофильм — кінофі́льма
кинутый — кі́нуты
кинуть — кі́нуць, ры́нуць
кинуться — кі́нуцца, ры́нуцца
киоск — кіёск
киот — ківот, скры́ня
кипа — пак, па́чка, ві́язка, рэза (*папе́ры*)
кипарис — *бот.* (*Cupressus L.*) цыпры́с, кіпары́с
кипарисовый — цыпры́савы, кіпары́савы
кипение — кіпе́нне
кипеть — кіпе́ць, гатава́цца, шумава́ць
кипеть сильно — клекота́ць, булькота́ць
кипрей — *бот.* (*Epilobium L.*) скры́пень б. т.
Киприан — *и. соб.* Купрэй
кипучесть — кі́пкасьць, кіпу́часьць
кипучий — кі́пкі, кіпу́чы
кипятильник — гатава́льнік, кіпяці́льнік, каза́н
кипятить — гатава́ць, вары́ць
кипяток — вар, кі́пень, кіпяток, укроп
кипяточный — кіпяточны, кіпнёвы
кипячёный — гатава́ны (*гатава́ная вада́*)
кипящий — кіпу́чы
Кир — *и. соб.* Кір
кирасир — па́нцырнік, кірасі́р
киргиз — кіргі́з
Киргизия — Кіргі́зія
киргизский — кіргі́скі
Кирик — *и. соб.* Кі́рык
Кирилл — *и. соб.* Кі́рыла
кириллица — (*азбука*) кі́рыліца
кирка — капані́ца, маты́ка, кі́рка
кирпич — цэгла
кирпич непалёный — сырэц
кирпичина — цагліна
кирпичник — цагельнік, цагля́р
кирпичный — цагля́ны, мурава́ны
кирпичный завод — цагельня
кирпичный дом — камяніца
кирха — кі́рха
киса́ — шабе́та, капшу́к
киса, кисонька — котка
кисейный — мусьліновы, сітава́ты
кисель — кісе́ль
кисель овсяный — жур
кисельный — кісе́льны
кисет — кісэт, капшу́к
кисея — мусьлі́н
киска — котка
кисление — кісьле́ньне
кисленький — кі́сьленькі, ква́сьненькі
кисленько — кі́сьленька
кислить — (*что*) кісьлі́ць, ква́сіць
кислиться — кісьлі́цца, ква́сіцца
кислица — *бот.* (*Oxalis L.*) кі́сьлі́ца
кислица обыкновенная — (*O. acetosella*) заечы шча́вель
кисличные — (*Oxalidaceae DC*) кісьлі́чныя (*расьлі́ны*)
кисло — кі́сла, ква́сна
кисловато — кісьля́ва, кіслава́та, кваснава́та
кисловатый — кісьля́вы, кіслава́ты, кваснава́ты
кислород — тлён, кіслатвор В. Ласт.
кисло-сладкий — кі́сла-салодкі
кислота — кі́сласьць, кісьліня́, кісьля́, квас
кислотность — ква́снасьць
кислый — кі́слы, ква́сны
сделать кислую мину — скрыві́цца як серада́ на пя́тніцу
кислятина — кісьля́, кісьліня́
киснуть — кі́снуць, ква́снуць
кистевой — пясьцёвы, кутасовы, гра́нкавы
кистень — кісьце́нь
кисточка — гра́начка, кута́сік, пэнзьлік
кисть — (*орехов, ягод*) гра́нка, гронка; (*кукурузы*) кія́х; (*у пояса*) кута́с; (*для рисования*) пэнзаль; (*для мазания*) квач
кит — *зоол.* (*Balaena*) кіт; (*созвездие*) Рыбазьве́р г.-к. т.
китаец — кіта́ец
Китай — Кіта́й
китайка, китаянка — кіта́йка
китайский — кіта́йскі
китель — кулёк, кі́цель
китовый — кі́тавы
китолов — кіталоў
китоловство — кіталоўства
китообразный — кітава́ты
китообразные — *зоол.* кітазьве́ры з. т.
кичиться — пы́шыцца, фанабэрыцца, выстаўля́ца, высока не́сьціся
кичливо — фанабэрыста, пышлі́ва
кичливость — фанабэрыя
кичливый — фанабэрысты, пышлі́вы
кишение — кішэньне, капашэньне

К

кишеть — кішэць, капашы́цца
кишечка — кі́шачка
кишечнодышащий: кишечнодышащие — *зоол.* нутрады́шнікі з. т.
кишечный — кі́шкавы
кишечный — кішочны ан. т.
кишка — кі́шка
кишка прямая — ку́тніца
клавиатура — клявіяту́ра
клавиша — кля́віш, пі́шчык
клад — скарб
кладбище — могілкі, магі́лкі, магі́льнік, могліцы; жа́льня Шп., мы́нка Мядз., валатоўкі В. кр. сл.
кладбищенский — могілкавы
кладение — кладзе́ньне, уклада́ньне; лягча́ньне
кладеный — **1.** кла́дзены; **2.** вы́легчаны, спакла-да́ны
кладка — **1.** кладзе́ньне; **2.** лягча́ньне, спакла-да́ньне
кладовая — камора, клець, сыпіжа́рня; (*для овощей*) істопка, варыўня́
кладь — кладзь, пакла́жа
кланяться — кла́няцца, укланя́цца, віта́ць (*каго*), вітацца (*з кім*)
клапан — кля́па; за́сланка ан. т.
клапанчик — кля́пка
кларнет — клярнэт
класс — кля́са; разьдзе́л
классик — кля́сык
классификация — клясыфіка́цыя, падзе́л
классифицировать — клясыфікава́ць, падзя-ля́ць
классический — клясы́чны
классный — кля́сны, кля́савы
классовый — кля́савы
класть — кла́сьці, пакла́дзь, лажы́ць
класть кирпичи — мурава́ць
класть земные поклоны — біць паклоны
клевание — клява́ньне, дзяўба́ньне
клевать — клява́ць, дзяўба́ць, дзю́баць, клю́каць
клевать носом — дзяды́ вадзі́ць
клевер — *бот.* (*Trifolium L.*) канюшы́на, дзя́целіна б. т.; дзя́тліна
клевета — абмова, зводы, кля́паньне, намоўка, плятня́, абэлка В. кр. сл.
клеветание — абмаўля́ньне, абнясла́ўленьне, кля́паньне
клеветать — (*на кого*) абмаўля́ць, зводзіць (*каго*); кля́паць, плясьці́, браха́ць (*на каго*); шальмава́ць (*каго*), ю́дзіць (*ср.* **клеветничать**)
клеветник — абмоўнік, паклёпнік, звод, зво-дзень
клеветница — зводніца, абмоўніца, паклёп-ніца
клеветничать — зводнічаць
клеветнический — зводнічы
клевец — клявец́, сыпіча́к
клеврет — ся́бар (ся́бра), тава́рыш, папле́чнік; падхле́бнік
клееварный — клеява́рны
клееварный завод — клеява́рня
клееватый — клеява́ты
клеевой — кле́евы
клеёнка — цыра́та
клеёнчатый — цыра́тавы
клеильный — кля́ільны
клеистость — кля́істасьць
клеистый — кля́исты
клеить — кле́іць, ляпіць
клеиться — кле́іцца
не клеится — ня выходзіць
клей — клей
клейкий — кле́йкі, лі́пкі, ліпу́чы
клейковатость — клейкава́тасьць, ліпу́часьць
клейковатый — клейкава́ты, ліпу́чы
клейкость — кле́йкасьць, лі́пкасьць
клеймение — кляйме́ньне, зна́чаньне, таўра-ва́ньне
клеймить — зна́чыць, таўрава́ць, штампава́ць, адбіва́ць
клеймо — кляймо, кляйно, знак, штэмпэль, таўро; пяча́тка, адбой лс. т.
клейстер — кле́йстар
клёк — крактаньне (*жаб*)
клён — *бот.* (*Acer*) клён
кленовый — кляновы
клепало — бі́ла
клепать — кляпа́ць, пля́ска́ць; літава́ць
клёпка — клёпка
клерикал — клерыка́л
клерикальный — клерыка́льны
клёст — *зоол.* (*Loxia curvirostra*) крыжадзю́б з. т.
клетка — **1.** кле́тка; **2.** каморка
клеточка — кле́тачка, каморачка
клеточный — каморкавы
клеточный сок — каморкавы сок
клеточная оболочка — каморкавая абалонка
клеточное ядро — каморкавае ядро б. т.
клетушка — камора

клетчатка — абалоніна
клетчатый — у кле́тачкі
клеть — клець, камора, сьві́ран
Клецк — *г.* Кле́цак
клёцка — клёцка
клешневый — кля́шневы
клешня — кля́шня
клещ — *зоол.* (*Acarus*) клешч
клещи — абцугі́; кляшчы́ (*у хамута́*)
клиент — кліе́нт
клизма — кліз́ма, прамыва́чка
клик — клік, поклік, крык, гук, гука́ньне
клика — кліка, згра́я
кликание — кліка́ньне, гука́ньне
кликать / кликнуть — кліка́ць / клікнуць; гука́ць / гукну́ць
кликуша — апанта́ная, дурна́я, гістэры́чка
Клим — *и. соб.* Клім
климат — клімат
климат влажный (сырой) — клімат вільготны
климат жаркий — клімат гара́чы
климат континентальный — клімат сухазе́мны
климат морской — клімат морскі
климат подтропический — клімат падзваротнікавы
климат сухой — клімат сухі́
климат умеренный — клімат ме́рны
климат холодный — клімат халодны г.-к. т.
климатический — кліматы́чны
климатическая станция — кліматы́чная ста́нцыя
климатология — кліматалёгія
Климент — *и. соб.* Кліме́нт
клин — клін, скаба́
клиника — кліні́ка
клинить — клінава́ць
клинический — клінічны
клиновидный, клинообразный — клінава́ты
клинок — клінок, штыле́т, лязо
клинцевать — клінцава́ць
клир — клер, духаве́нства
клирик — кле́рык, духо́ўнік
клирос — кры́лас
клистир — кліз́ма, ка́нка
клитор — *анат.* кліта́р, сі́кель, се́кіль, ласкаце́нь ан. т.
клич — кліч, покліч, за́клік
кличка — мяну́шка, прозьвішча
клише — кліше
клобук — капту́р, падка́пак
клозет — су́тачкі (су́дачкі), клязэт
клок — клок, жмут, шкума́т, пук, чуб, па́сма (*валасоў*)
клокот — клёкат, шлёхат
клокотание — клекота́ньне, булькота́ньне
клокотать — клекота́ць, шлехата́ць, булькота́ць
клонить — хіліць, нахіля́ць, гнуць
клониться — хіліцца, хіну́цца, ні́кнуць, набліжа́цца
клониться к упадку — занепада́ць
к чему это клонится — да чаго яно йдзе
клоп — *зоол.* (*Cimex*) клоп
клоп полевой — бзьдзюль
клопик — клапок
клоповник — клапоўнік; *бот.* (*Ledum palustre L.*) багу́н балотны
клопс — клёпс
клохтание — квакта́ньне
клохтать — квакта́ць, кохаць
клохтунья — квакту́ха
клочение — кля́чаньне
клочить — кля́чыць, скля́чваць
клочиться — скля́чвацца
клочковатый — кля́чаны
клочок — клачок, жмуток, шкуматок, пучок, чубок
клочья — клочча, шкумацьцё
клуб — клюб
клубить — клубіць
клубиться — клубі́цца
дым клубится — дым шуга́е
клубника — (*Fragaria collina L.*) клубні́цы; (*Fragaria viridis Duch.*) тру́скаўкі
клубничный — клубні́чны, суні́чны
клубный — клю́бны
клубовидный — клубкава́ты
клубок — клубок
клубочек — клубочак
клумба — клю́мба, кве́тня
клуша — квакту́ха, хлуя́
клык — і́кла, кел, зуб
клыкастый — іклА́сты
клюв — дзю́ба, дзю́бка, дзёўб
клюка — кульба́, качарэжка, ля́ска, кавяня́
клюква — *бот.* (*Vaccinium Oxycoccus L.*) журави́ны
клюквенный — журави́навы, журави́нны

К

клюковка — журавíнка
клюнуть — клю́нуць, дзеўбану́ць, дзю́бнуць
ключ — **1.** (*от замка*) ключ; **2.** (*источник*) крыні́ца
ключевой — ключовы; крыні́чны
ключик — клю́чык; крыні́чка
ключица — *анат.* ду́жка, лучок, раме́ньніца ан. т.
ключник — клю́чнік, ахмі́стар
ключница — ахмі́стрыня, клю́чніца
клякса — пля́ма
клянченье — ка́ньканьне
клянчить — ка́нькаць, кля́нчыць
кляпец — па́стка
кляпка — за́тычка
кляп тебе в рот — каб цябе́ зарва́ла
клясть — кля́сьці, праклі́наць
клясться — кля́сьціся, прысяга́цца
клятва — кляцьба́; праклён, прысяга́ньне, бажба́; зарок
клятвенно — з кляцьбой, прысяга́ючыся
клятвенный — прыся́жны
клятвопреступление — крывапрыся́га
клятвопреступник — крывапрыся́жнік, вераломк
клятвопреступный — крывапрыся́жны, вераломны
кляуза — абмова, паклёп, ка́верза
кляузник — абмоўнік, ка́пасьнік, ка́верзьнік
кляузница — абмоўніца, ка́пасьніца, ка́верзьніца
кляузный — абмоўны, паклёпны
кляузы — абмовы, плёткі, ка́пасьці
кляча — кля́ча, шка́па, шаўлю́жка, дра́ба, па́дла
книга — кні́га
книга домовая — кні́га дамовая
книга жалобная — кні́га для ска́ргаў
книга конторская — кні́га канторская
книга разносная — кні́га разносная
книга входящих бумаг — кні́га атрыма́ных папе́р
книга исходящих бумаг — кні́га адасла́ных папе́р
книгоиздатель — выдаве́ц кніг
книгоиздательство — выдаве́цтва кніг
книгоноша — кніганоша
книгопечатание — друкава́ньне
книгопродавец, книготорговец — кніга́р
книготорговля — кні́жны га́ндаль
книгохранилище — бібліятэка; кнігахава́льня
книжник — кні́жнік
книжный — кні́жны
книжный магазин — кніга́рня
книжная палата — кні́жная пала́та
книжонка, книжечка, книжка — кні́жка, кні́жачка
книзу — дані́зу, уні́зу, дадолу
кнопка — кнопка, цьвічок
кнут — пу́га, бізу́н, канчу́к, біч, гара́пнік
кнутик — пу́жка, бізунок
кнутовище — пугаўё
княгиня — княгі́ня
княжение — княжэньне
княжеский — кня́жацкі, князёў
княжество — кня́ства
княжий — князёў, кня́жы
княжить — князява́ць, кня́жыць
княжна — князёўна
княжнин — князёўнін
князёк — князёк
князь — князь; (*на крыше*) грэбень
великий князь — вялі́кі князь
коалиционный — кааліцы́йны
коалиция — кааліцыя
кобальт — *мин.* кабальт
кобель — саба́ка, пёс (*самец*)
кобелятник — сабака́р
кобенить — ку́рчыць, выкрыўля́ць
кобениться — ку́рчыцца, выкрыўля́цца, тапы́рыцца
кобец — *зоол.* (*Falco apivorus*) ка́ня
кобза — кобза
кобзарь — кабза́р, ле́рнік
кобура — кабура́, похва
кобчик — кабе́ц, *зоол.* (*Falco vespertinus*) саколжулёнак (сокал-жулёнак) лс. т.
кобыла — кабы́ла, кабыля́ка
кобылица — кабыліца
кобылка — кабы́лка
кобылятина — кабыля́ціна, кабы́ліна, каніна
кование — кава́ньне
кованый — кованы, ку́ты
коварный — здра́длівы, падсту́пны, крывады́шны
коварство — здра́да (зра́да), подступ
ковать — кава́ць, куць
ковач — кава́ль, кава́ч
ковёр — дыва́н, кілі́м, кабе́рац
коверканье — скажэньне, крыўля́ньне, псава́ньне

коверкать — казíць, кýрчыць, перакрýчваць, калéчыць, псавáць, крышы́ць, ламáць, крывíць
ковка — кавáньне, падкоўваньне (*коняй*)
ковкий — коўкі
ковкость — коўкасьць
Ковна — *г.* Коўна
коврига — лýста, скíба; бохан, кулíдка
коврижка — лýстачка, скíбачка
коврик — дыванок, кабéрац
ковровый — дывановы, кабéрцавы
ковчег — скры́ня, карабéль
ковш, ковшик — коўш, конаўка, карэц, чарпáк, чарпéнь
ковы — подступ
строить ковы — падкопвацца (*пад каго*)
ковыль — *бот.* (*Stipa L.*) кавы́ль
ковыляние — клы́паньне, канды́баньне
ковылять — клы́паць, канды́баць, шканды́баць
ковыряние — калупáньне, карпáньне, длýбаньне
ковырять — калупáць, карпáць, длýбаць
когда — калí
когда бы — каб
когда же — а як
когда угодно — абы́-калí, калí-хаця́
когда-либо, когда-нибудь — калí-нéбудзь, абы́-калí
когда-то — калíсьці, нéкалі, нéяк, даўнéй
коготок — кíпцік, капцюрок
коготь — кíпець, капцю́р, кіпцю́р, пазýр
кодекс — кóдэкс, зборнік законаў
кое-где — абы́-дзе, дзе-нідзе́, дзе-а-дзе, дзе-колечы
кое-как — мясцáмі, абы́-як, так-сяк, ні то ні сё, нішто, нічога, нічагéнька, як-колечы
кое-когда — абы́-калí, калí-нікалí, дзе-калí; **кое-кто** — абы́-хто, нéхта, дзе-хто, хтось
кое-куда — абы́-куды́, дзе-куды́
кое-что — абы́-што, нéшта, дзе-што, тое-сёе
кое-чего — абы́-чаго, дзе-чаго
кожа — скýра, скýрка, шкýра; лушпáйка; лушпíна
кожа выделанная — (*в кусках*) скурáт, шкурáт; шкурлáт
кожа невыделанная — сырэц
кожа сыромятная — сыры́ца
кожа горная — *мин.* тканíна мінэрáльная
кожа змеиная — зьлíнак
кожа ягнёнка — смýшак
кожан — *зоол.* (*Vespertilio*) кажáн
кожаный — скураны́, шкураны́
кожевенник — гарбáр, кажамя́ка
кожевенный — гарбáрны
кожевенный завод — гарбáрня
кожевничать — гарбаравáць
кожевнический — гарбáрскі, кажамя́цкі
кожевничество — гарбáрства, кажамя́цтва
кожеед — *зоол.* (*Dermestes*) скураéд *з. т.*
кожемяка — *см.* **кожевенник**
кожистый — скуравáты
кожица — скýрка, шкýрка; плéўка
кожный — скýрны, шкýрны
кожура — лушпáйка, плéўка; шалупáйка, лускá; скýрка
кожуринка — скýрачка, лушпáечка, плéвачка
кожух — (*у пулемёта*) халадзíльнік Пр. в. сл.
коза — казá
козёл — казёл
козелец — *бот.* (*Scorzonera L.*) чорнакóрань *б. т.*
козелки — *бот.* (*Pastinaca sativa L.*) пастарнáк
козельник — *бот.* (*Tanacetum vulgare L.*) пíжма
козий — казíны, казя́чы
козиться — казíцца, кацíцца
козица — козка, козачка, казíца
козлёнок — казьляня́
козлик — козьлік
козлиный — казьлíны, казловы
козлить — (*петь козлиным голосом*) кéпска сьпявáць
козлобородник — *бот.* (*Tragopogon*) казлабарод *б. т.*, (*Tragopogon pratensis L.*) казялок В. кр. сл.
козловый — казловы
козлоногий — казланогі
козлорогий — казларогі
козлы — перадок, козлы; казлы́, рыштýнак
козляк — *бот.* (*Boletus granulatus L.*) казьля́к
козлятина — казьлíна, казьля́ціна
козлячий — казьля́чы, казьлíны
козни — подступы, падкопы, кáпасьці
строить козни — падкопвацца (*пад каго*)
козодой — *зоол.* (*Caprimulgus europaeus*) лéжань, (*Caprimulgus*) ляля́к *з. т.*
козуля — *зоол.* (*Cervus capreolus*) сáрна
козырёк — брыль, казырок
козыристый — казы́рысты
козырной, козырный — казы́рны
козырь — козыр
свои козыри — (*игра*) воз

K

козырять / козырнуть — казыра́ць / казырну́ць
козюля — казю́ля
козявка, козявочка — казя́ўка, казю́лька, казу́рка
койка — ложак, койка
кой-как — *см.* **кое-как**
кой-какой — абы́-які́, такі́-сякі́
кой-кто — *см.* **кое-кто**
кокарда — кука́рда, цэшка
кокетка — баламу́тка, баламу́тніца, залётніца, харашу́ха
кокетливо — баламу́тна, залётна
кокетливый — баламу́тны, залётны
кокетство — баламу́цтва, залёты
коккостеус — (*рыба*) *мин.* чарапы́, косткі
коклюш — коклюш
коклюшка — верацёнца
кокон — ля́лька, капшучок, вопрадзень В. Ласт.
кокорыш — *бот.* (*Aethusa cynapium L.*) блёкат
кокос — *бот.* (*Cocos nucifera L.*) какос
кокотание — саката́ньне
кокотать — саката́ць
кокотун — сакату́н
кокотунья — сакату́ха
кокошник — какошнік, чапе́ц
кокс — кокс, каме́нны ву́галь
коксовый — коксавы
кол — кол, колік, друк, дручок, па́лка, па́ля, ты́чка (*собир.* кольле)
колба — коўба
колбаса — каўбаса́
колбаса из внутренностей — вантраба́нка
колбаса кровяная — крыва́нка
колбасная — каўба́сьня, каўба́сная
колбасник — каўба́сьнік
колбасница — каўба́сьніца
колбочка — коўбачка
колдовать — вядзьма́чыць, ведзьмакава́ць, чарава́ць, знахарава́ць, варажы́ць, шапта́ць
колдовской — вядзьма́цкі, вядзьма́рскі, зна́ха́рскі, чараўні́цкі
колдовство — вядзьма́цтва, вядзьма́рства, чараўні́цтва, зна́ха́рства
колдун — вядзьмак, вядзьма́р, чараўні́к, зна́ха́р, варажбі́т, шапту́н
колдунья — ве́дзьма, вядзьма́чка, вядзьма́рка, чараўні́ца, зна́ха́рка, варажбі́тка, шапту́ха
колебание — вага́ньне, віха́ньне, хіста́ньне, зы́баньне, кача́ньне
колебательный — вага́льны, зы́бісты
колебать — вага́ць, віха́ць, хіста́ць, зы́баць, гойдаць, ша́стаць, калыха́ць, ру́хаць, ківа́ць
колебаться — віха́цца, вага́цца, трасьці́ся, хіста́цца, зы́бацца, ру́хацца, ківа́цца, гойдацца
колеблемость — вага́льнасьць, хі́сткасьць, зы́бкасьць
колеблемый — вага́льны, хі́сткі, зы́бкі
колеить — рабі́ць каляі́ны
колейный — каляі́навы
коленко — кале́нка, кале́нца
коленкор — парка́ль, ма́міс
коленкоровый — паркалёвы
коленный — кале́нны, кале́ністы
коленная чашка — галёнка
колено — кале́на (*мн.* кале́ны)
коленопреклонение — кле́нчаньне
коленопреклонённо — укле́нчыўшы
коленце — кале́нка, кале́нца
коленчатый — кале́нчасты, каленкава́ты
колер — колер, масьць
колесить — калясі́ць, гаварыць наўздага́д
колесник — калёсьнік, стальма́х
колёсный — колавы, калёсны
колёсная мазь — каланіца, коламазь
колесо — кола
две пары колёс — каток
колесование — калесава́ньне, ка́тава́ньне
колесовать — калесава́ць, ка́тава́ць
колесовидный — калесава́ты, падобны да кола
колесовой — колавы, кругавы́
колесцо — колка
колечко — пярсьцёначак, абру́чык, колка, кольца, колца
колея — каляі́на
колибри — *зоол.* (*Trochilus*) калі́бры
коливо — куцьця́
колика — колька
количественный — колькасны, лічэбны
количество — колькасьць, лічэбнасьць, лі́чба
колка — расколка, калоцьце, скяпа́ньне
колкий — колкі, калю́чы, ске́пкі; тклі́вы, упікліві, ура́зьлі́вы
колко — тклі́ва, упікліва, ура́зьлі́ва
колковатость — тклі́васьць, ура́зьлі́васьць
колковатый — тклі́вы, ура́зьлі́вы, упі́чны, ушку́льны
колкость — ске́пкасьць, прыты́ка, тклі́васьць, упі́ка, ушчыплівасьць

колкости — дамовы, пстрычкі, дапінкі, шкуляньне, прытыкі
коллега — калега, таварыш
коллегиальный — калегіяльны
коллегия — калегія
колледж — каледжа
коллектив — калектыў, гурток
коллективизм — калектывізм
коллективный — калектыўны, зборны, суспольны, гуртавы
коллекционер — калекцыянер
коллекция — калекцыя, збор
коллизия — суспрэчнасьць
колобок — баханка
колоброд, колобродник — пляткар, зброд
колобродить — плясьці, зброднічаць, блазнаваць
коловерть — вір
коловорот — сьвердзел, сьвідар; вір
коловратно — зьменна, колаваротна
коловратность — зьменнасьць, колаваротнасьць
коловратный — зьменны, няпэўны; колаваротны
колода — калода, калодка, пень, жолаб, карыта
колода карт — талія
колодезный — калодзежны
колодезный журавль — коварат, вочап
колодезь — калодзеж, студня
колодка — калодка
колодка для сапог — капыл
колодник — вязень, нявольнік, арыштант
колодница — нявольніца
колокол — звон
колокола — званы
колоколенка — званічка
колоколенный — званічны
колоколец — званок, балабон, бражджотка, бома М. Багд.
колокольный — званічны
колокольня — званіца
колокольчик — званочак
колокольчики — *бот.* (*Campanula L.*) званкі, ворлікі, званочкі, калбанчыкі В. кр. сл.
колокольчиковые — (*Campanulaceae*) званковыя (*расьліны*)
коломазь — каланіца, коламазь
коломенский: коломенская верста — дылда, дырда, дзыга
колониальный — каляніяльны, высялковы, асадніцкі
колониальные товары — бакалея
колонизация — каляніза́цыя, аса́дніцтва
колонизировать — каляніза́ваць, аса́джваць
колонист — каляністы, высяле́нец, аса́днік
колония — калёнія, выселак; аса́да
колонка — калёнка, калюмка, слупок
колоннада — каляна́да, калюмна́да
колорит — калярыт, афарбоўка
колоритность — калярытнасьць, яскравасьць
колоритный — калярытны, яскравы, барвісты
колос — колас (*мн.* каласы, *собир.* калосьсе)
колосья вымолоченные — каласавіны
колосистый — каласісты
колоситься — каласіцца, каласава́ць
колосница — *бот.* (*Stachys L.*) чысьцец
колосок — каласок
колосс — волат, ве́ліч
колоссальный — вялічэзны, вялізарны
колотилка, колотовка — боўка
колотить — (*бить*) біць, зьбіва́ць, таўчы, пе́таваць, пе́таць, трапа́ць, лупцава́ць; (*бельё*) праць; (*грушу*) трасьці
колотуха, колотушка — доўбня, даўбе́шка
колотырить — гандлява́ць; займа́цца плёткамі, браха́ць
колотырка — пляткарка, брахуха
колотырник — пляткар, брахун
колоть — калоць, шчапа́ць, скяпа́ць, варса́ць; басьці
колоть в глаза — упіка́ць
колотье — **1.** колька, коліка; **2.** *см.* **колка**
колочение — біцьцё, забіва́ньне, пе́таваньне; бра́заньне
колпак — каўпак, каптур; целяпе́нь, разьзя́ва (разя́ва)
колпачок — каўпачок, каптурок
колтун — *мед.* (*plica polonica*) каўту́н; каўцюх
колтуноватый — каўтунава́ты, кудлава́ты
колупание — калупа́ньне, карпа́ньне, длу́баньне
колупать / колупнуть — калупа́ць / калупну́ць; карпа́ць / карпану́ць; длу́баць / длубану́ць
колчан — каўча́н
колчедан — іскра́к
колченогий — клышаногі, клыпа́ты, клыша́ты, куля́вы, кульга́вы, клышу́н, шкандыба
колыбель — калыска, зыбка, люлька, таган В. кр. сл.
колыбелька — калысачка
колыбельный — калыскавы
колымага — каламага, каламажка, рыдван

К

колыхание — калыха́ньне, зы́баньне, гойданьне, кача́ньне
колыхать — калыха́ць, зы́баць, гута́ць, гойдаць, кача́ць
колыхаться — калыха́цца, гойдацца, зы́бацца, гу́тацца, кача́цца
колышек — калок, калочак, ты́чка
коль — як, калі́
кольнуть — кальну́ць, калану́ць
кольцевание — *бот.* абручкава́ньне б. т.
кольцевидный — кальцава́ты, пярсьцёністы, пярсьцёнкаваты ан. т.
кольцевой — кольцавы, кругавы́
кольцо — пе́рсьцень, пярсьцёнак, жуковіна, кольца; абру́чык; ба́нька, скру́тка; кала́ч
кольцо с печатью — сыгнэт
торговец кольцами — пярсьцёначнік
кольца древесины — *бот.* драўніновыя персьцяні́ б. т.
кольчатый — кальча́ты, кольчаты, пярсьцёністы
кольчуга — па́нцыр, кальчу́га Пр. в. сл.
колючепёрый — *зоол.* калючапе́ры з. т.
колючесть — калю́часьць
колючий — калю́чы, колкі
колючка — калю́чка, бадзю́лька
колючник — *бот.* (*Carlina Tourn.*) урочнік б. т.
колюшка — *зоол.* (*Gasterosteus aculeatus*) калю́чка
коляда — каляда́
колядный — каля́дны
колядовать — калядава́ць, шчадрава́ць
коляска — каля́ска
ком — кам'я́к, камлы́га, гру́дка, бры́ла
команда — кама́нда, зага́д
командир — камандзі́р
командировать — камандырава́ць, выпраўля́ць
командировка — камандыро́ўка, выпраўле́ньне (*куды́*)
командировочный — вы́правачны, камандыровачны
командирша — жонка камандзі́ра
командование — кама́ндаваньне
командовать — кама́ндаваць, зага́дваць
командующий — камандзі́р, нача́льнік войска
комар — (*Culex*) кама́р; *собир.* камарэча
комбинация — камбіна́цыя, злучэньне
комбинировать — камбінава́ць, злуча́ць
комедиант — камэдыя́нт, камэдыя́ншчык
комедиантка — камэдыя́нтка, камэдыя́ншчыца
комедия — камэдыя; кумэдыя
кукольная комедия — батле́йка
комелёк — кам'і́нак; камлёк
комель — каме́ль
комендант — камэнда́нт
комендантский — камэнда́нцкі
комендатура — камэндату́ра
комета — камэта, мятла́
комизм — кам'і́зм, сьме́шнасьць
комик — комік, сьме́шнік
комиссар — каміса́р
комиссариат — камісарыя́т
Комиссариат внутренних дел — Камісарыя́т уну́траных спраў
Комиссариат иностранных дел — Камісарыя́т чужазе́мных (заме́жных) спраў
Комиссариат земледелия — Камісарыя́т земляробства (ральні́цтва)
Комиссариат просвещения — Камісарыя́т асьве́ты
Комиссариат путей сообщения — Камісарыя́т шля́хаў зносін
Комиссариат социального обеспечения — Камісарыя́т сацыя́льнае забясьпе́кі
Комиссариат внешней торговли — Камісарыя́т заме́жнага га́ндлю
Комиссариат труда — Камісарыя́т пра́цы
Комиссариат почты и телеграфа — Камісарыя́т пошты й тэлегра́фу
Комиссариат юстиции — Камісарыя́т юсты́цыі (судовых спраў)
Комиссариат финансов — Камісарыя́т грашовых спраў
Комиссариат военный — Камісарыя́т вайсковых спраў
комиссарский — каміса́рскі
комиссионер — камісіяне́р
комиссионный — камісі́йны
комиссия — кам'і́сія
комитет — камітэт
комитетский — камітэцкі
комический — кам'і́чны, сьме́шны, праку́дны
комкать — мяць, комкаць
комковатый — зьмя́ты, пама́ты, камякава́ты, грудава́ты
комком — камяком, жму́там
комма — кома, коска

комментарий — тлумачэ́нне
комментатор — тлума́ч
коммерсант — гандля́р
коммерция — га́ндаль, камэ́рцыя
коммерческий — камэ́рцыйны, гандлёвы
коммуна — каму́на
коммунизм — камуні́зм
коммунист — камуні́сты
коммунистический — камуні́стычны
Коммунистический союз молодёжи — Камуні́стычны саю́з моладзі
Коммунистический интернационал — Камуні́стычны інтэрнацыяна́л
коммунистка — камуні́стка
комната — пакой, бакоўка, сьвятлі́ца, камора
комнатка — пакойчык, баковачка, сьвятлі́чка, каморка
комнатный — пакаёвы
комод — камода
комок, комочек — камок, камячок
компактный — сьці́слы, шчы́льны
компанейский — таварыскі, кампане́йскі
компания — кампа́нія, кумпа́нія, сяброўства, таварыства, хэўра
компаньон — ся́бра (ся́бар), супольнік, кумпа́ньнік, кампаньён
компаньонка — сяброўка, супольніца; кампаньёнка
компас — компас
компенсация — узнагарода, адшкадава́ньне, кампэнса́цыя
компенсировать — узнагараджа́ць, адшкадоўваць, кампэнсава́ць
компилировать — кампілява́ць, падбіра́ць
компилятивный — кампіляцы́йны, зборны
компилятор — кампіля́тар
компиляция — кампіля́цыя, збор, зьбіраніна
комплекс — комплекс
комплект — компле́кт, поўналі́к
комплектование — камплектава́ньне
комплектовать — камплектава́ць
комплимент — лёстка, камплімэнт
композитор — кампазы́тар
композиция — кампазы́цыя
компост — гной
компресс — кампрэс, прыпа́рка
компрометировать — бясчэсьціць, бэсьціць, пага́ніць
компромисс — усту́пка; згода
комфорт — камфорт, раскашава́ньне, раскоша
конвенция — канвэнцыя, умова, згода
конверт — канвэрт, агортка В. Ласт.
конвоир — канво́йны
конвоировать — ве́сьці пад канвоем
конвой — канвой
конвульсии — корчы, су́тарга; кі́даньне
конгломерат — канглямэра́т, зьле́пішча, зьляпня́к, мешаніна
конгресс — кангрэс
конденсация — кандэнса́цыя, згушчэньне
кондитер — цукёрнік
кондитерская — цукёрня
кондитерский — цукёрны
кондиция — канды́цыя, умова
кондрашка — пара́люш
кондуктор — канду́ктар
коневод — канявод
коневодство — гадоўля коняй
конёк — конік, конічак; *зоол.* (*Anthus*) стрыка́тка з. т.; (*на крыше*) шчыт, грэбень
огнемер — *физ.* агнямер
огнемётный — агнякідальны
огненный — агнёвы, вогненны, агні́сты, пала́ючы; чырвоны
огнеобразный, огнеподобный — агняваты, падобны да агню́
огнепоклонение — агняхва́льства
огнепоклонник — агняхва́л, агняхва́льнік
огнестойкий — агнятрыва́лы, агнястойкі
огнестрельный — агнястрэльны
огнеупорный — *см.* **огнестойкий**
огниво — краса́ла, крэсіва
огнистый — агні́сты
огноить — загнаіць
оговаривать / оговорить — (*кого*) абмаўля́ць / абмовіць; (*многих*) паабмаўля́ць; (*что*) амаўля́ць / амовіць; заўва́жваць / заўва́жыць

О

оговор — абмова, намова, паклёп, набрэхі
оговорённый — абмоўлены
оговорка — абмоўка л. т.; ува́га
оговорщик — абмоўнік
оговорщица — абмоўніца
оголтелый — ачмурэлы, ачму́чаны
оголтеть — ачмурэць, ачмуце́ць
оголять / оголить — агаля́ць / агаліць, абгаліць
огонёк — вогнік, аганёк, агоньчык
огонь — агонь, цяпло, *детск.* жы́жа, бага́ч старабел.
быть в огне — быць у агні́
сильно гореть огнём — полымем пала́ць
предать огню — спопеліць (спапяліць)
сидеть с огнём — пры агні́ сядзе́ць
огораживание — гарадзьба́; агароджванне
огораживать / огородить — агароджваць / агарадзіць
огораживать / огородить тыном — ты́ніць / заты́ніць; ку́таць / заку́таць
огоркнуть — агоркнуць, апры́крыцца
огород — гарод (агарод)
огородишко, огородчик — гародчык (агародчык)
огородник — гароднік
огородница — гародніца
огороднический — гародніцкі
огородничество — гародніцтва
огородный — гародны
огородные овощи — гародніна
огороженный — агароджаны, заты́нены
огорошить — зьбянтэжыць
огорчать / огорчить — засмуча́ць / засмуці́ць; апрыкра́ць / апры́крыць
огорчаться / огорчиться — засмуча́цца / засмуці́цца
огорчение — засмучэньне, пры́красьць, смýтак
огорчённый — засмучоны
огорчительный — смýтны, невясёлы
ограбление — рабу́нак, рабава́ньне, грабе́ж
ограблять / ограбить — рабава́ць / абрабава́ць
ограда — агарожа; (*из брёвен*) плот, паркáн; (*из кольев*) тын; (*из прутьев*) пераплот; (*каменная*) мур; (*железная*) кра́ты
оградный — агарожны
ограждать / оградить — агараджа́ць / агарадзіць; баранíць / абаранíць; атуля́ць / атуліць; адстойваць / адстаяць (*каго*)
ограждение — агарожа; абарона, атуле́ньне, заслона
ограничение — абмежава́ньне, агранічэньне
ограниченность — абмежава́насьць, агранічанасьць
ограниченный — абмежава́ны, агранічаны
ограниченный человек — недарэка, аніякава́ты
ограничивание — абмяжоўваньне, агранічваньне
ограничивать / ограничить — абмяжоўваць / абмежава́ць; агранічваць / агранічыць
ограничиваться / ограничиться — абмяжоўвацца / абмежава́цца; здавальня́цца / здаволіцца
ограничительный — абмежава́льны
огранка — шліхоўка, сьценкатварэньне г.-м. т., абсьценкава́ньне, абкантава́ньне
огранять — абкантоўваць, рабíць ка́нты; шліхава́ць
огребание — граба́ньне
огребать / огрести — граба́ць / агрэбці
огревание — грава́ньне, ацэпліваньне
огревать / огреть — грава́ць / агрэць; ацэпліваць / ацэпліць
огреть по щеке — пля́сну́ць па шчацэ
огромно — вялíзна, вялічэзна, вялізарна
огромность — вялíзнасьць, вялічэзнасьць, агромністасьць
огромный — вялíзны, вялічэзны, вялíза́рны, агромністы, бальшэнны, нязьме́рны
огрубевший, огрубелый — агру́блы, загру́блы, зьдзічэлы
огрубеть — агру́бнуць, загру́бнуць, зьдзічэць
огрызать / огрызть — абгрыза́ць / абгры́зьці
огрызаться — агрыза́цца, аскірза́цца, выскаля́цца, пярэчыць
огрызок — абгры́зак, куса́нік
огрязнить — убру́дзіць
огузок — агу́зак, зад
огузье — падхвосьніца
огурец — гурок, агурок
огурец жёлтый — жаўту́н
огуречник — агурочнік
огуречница — агурочніца
огуречный — агурочны
огуречная трава — *бот.* (*Borago officinalis L.*) агурочнік ле́кавы б. т.
огустеть — згусьце́ць
ода — *лит.* ода
одалиска — адалíска

одарённость — даравíтасьць л. т., уздольненасьць, таленавíтасьць
одарённый — даравíты л. т., уздольнены, таленавíты
одаривать / одарить — абдáрваць / абдарыць, абдараваць
одевальня — адзявáльны пакой, адзявáльня
одевание — адзявáньне, апранáньне
одевать / одеть — адзявáць / адзéць; (*верхнее платье*) апранáць / апрануць
одеваться / одеться — адзявáцца / адзéцца; апранáцца / апрануцца; прыбірáцца / прыбрáцца
одеваться чопорно — чапурыцца, строіцца
одежда — адзéньне, адзéжа; (*верхняя*) вопратка
одёжина — адзéжына
одёжинка — адзéжынка
одёжный — адзéжны
одёжный шкаф — шáфа для адзéньня
одеколон — адэкалён
одёргивавать — *см.* **обдёргивать**
одеревеневший, одеревенелый — зьдзервянéлы, адубéлы
одеревенелость — зьдзервянéласьць, адубéласьць
одеревенение — зьдзервянéньне, адубéньне
одеревенеть — зьдзервянéць, адубéць
одерживать / одержать — атрымліваць / атрымáць
одержать верх — узяць верх (гору)
одержать победу — узяць перамогу, адалéць
одержимый — апантáны, вар'ят
одернеть — зьдзірванéць
одесную — праварýч
Одесса — *г.* Адэса
одессит — адэсьіт
одеяло — коўдра; (*каньёвое*) кáпа
одеяльный — коўдравы
одеяльце — коўдрачка
одеяние — *см.* **одежда**
один — адзін (*ж.* аднá, *ср.* адно)
один на один — адзíн на адзíн, сам-нáсам
один к другому — адзíн да аднаго
один с другим — адзíн з адным
один другого — адзíн аднаго
стоит один рубль — каштýе рубля́
в одну прядь — у адну́ столку
одно и то же — тое ж сáмае
быть за одно — (*с кем*) трымáцца (*з кім*)
все до одного — усé чы́ста
одинаково — аднáка, аднáкава, аднолькава, таксáма
одинаковость, одинакость — аднáкасьць, аднáкавасьць, аднолькавасьць
одинаковый, одинакий — аднáкі, аднáкавы, аднолькавы, такí сáмы
одинёхонек, одинёхонький, одинёшенек — адзінюсенькі
одиннадцатый — адзінáццаты, адзінáнцаты
одиннадцать — адзінáццаць, адзінáнцаць
одинокий — самотны, самотнік, адзінотны, бязродны, адзінокі
одиночество — самота, адзіноцтва, адзінота
в одиночестве — на самоце
одиночка — адзінéц, самотнік, самотніца
в одиночку — саматýгам
одичалость — зьдзічэласьць
одичалый, одичавший — зьдзічэлы
одичать — зьдзічэць
одна — *см.* **один**
однажды — раз, аднаго рáзу, адны́м рáзам, аднóйчы
однако — аднáк
однако же — аднáк жа, а вось жа
одно — *см.* **один**
однобокий — аднабокі
однобочка — аднабочка
однобрачие — аднашлю́бнасьць, аднажэнства
однобрачный — аднашлю́бны, адзíн раз жанáты
одноверец — *см.* **единоверец**
одноверный — *см.* **единоверный**
одноверхий — аднавéрхі
одновесельный — аднавёславы
одновременно — адначáсна, рáзам, аднаразова
одновременность — адначáснасьць
одновременный — адначáсны, адначасовы
одноглавый — аднагаловы, аднавéрхі
одноглавая церковь — царквá з аднэю мáкаўкай
одноглазый — аднавокі
одногодок — *см.* **ровесник**
одноголовый — аднагаловы
одногорбый — аднагорбы
одногубка, одногубый — аднагýбка, аднагýбы
однодневный — аднадзённы

О

однодольный: однодольные растения — *бот.* (*monocotyledones*) адналі́сьцéневыя расьлі́ны б. т.
однодомный — аднадомны; *бот.* аднапнёвы б. т.
одноженец — аднажэнец
одножёнство — аднажэнства
однозвучие — аднагу́чнасьць
однозвучно — аднагу́чна
однозвучный — аднагу́чны
однозначащий — адназна́чны
однозубый — адназу́бы
одноименность — аднайме́ннасьць
одноименный — аднайме́нны
однокалиберный — аднакалі́бравы
однокарманный — аднакішанёвы
однокашник — аднака́шнік, кале́га па школе
одноклеточный — *биол.* аднакаморкавы
одноколейный — аднакале́йны, аднаколя́йнавы
одноколенчатый — аднакале́нкавы
одноколка — аднаколка
одноконечный — аднаканцовы, аднаконцы
одноконный — аднаконны
однокопытный — аднакапы́тны
однократно — аднакра́ць, аднакроць, аднаразова
однократный — аднакра́тны, аднакротны, аднаразовы
однокровный — аднакроўны
однолапый — аднала́пы
однолепестковый — аднапялёсткавы
однолетний — аднагадовы, аднале́тні
однолеток — аднагодак, аднале́так; раве́сьнік
однолистный — адналіcты
однолитровый — адналіт ровы
одноличный — аднаасабовы
одномачтовый — аднашчоглавы
одномерный — аднаме́рны
одноместный — аднаме́сны
одномесячный — аднаме́сячны
однометровый — аднамэтравы
одноногий — аднаногі
однообразие — аднаста́йнасьць
однообразно — аднаста́йна
однообразный — аднаста́йны
однопалатный — аднапала́тны
однопалубный — аднапа́лубны
однопалый, одноперстный — аднапа́льцавы
однопестиковый — *бот.* (*monogunus*) аднаслупковы
одноплодный — аднаплодны
однопокровный — *бот.* (*monochlamydeus*) аднапакры́ўны
однополый — **1.** аднаполы, з аднэй палою; **2.** аднародавы
однорогий — аднарогі
однородный — аднародны, аднаста́йны
однорукий — аднару́кі
однорядка — сьвяточны сурду́т
односелье — прысёлак
односельчанин — з аднае́ вёскі
односемейный — аднасяме́йны
односемянный — аднанасе́нны
односкатный — аднаспа́давы
односложный — аднаскладовы
односотенный — аднасоткавы
односпальный: односпальная кровать — ложак на адну́ асобу
одностволка — (*ружьё*) паядзы́нка
одноствольный — аднаствольны
одностебельный — аднасьцябловы
односторонне — аднабока
односторонний — аднабокі, аднабочны м. т.
одностру́нный — аднастру́нны
односуставный — аднасуста́ўны
одноугольный — аднаку́тны
одноухий — аднаву́хі, бязву́хі
однофамилец — аднае́ фамі́лii, аднаго прозьвішча
одноцветный — аднакаляровы, аднама́сны
одноценный — аднацэнны
одночертный — *муз.* аднары́сны
одночлен — *мат.* адначле́н м. т.
одноэтажный — аднапавярховы
одноягодный — адная́гадны
одобрение — ухва́ла, ухвале́ньне, апраба́та, апраба́цыя
одобренный — ухва́лены
одобрять / одобрить — ухва́льваць, ухваля́ць / ухвалі́ць; апрабо́ўваць / апрабава́ць
одолевать / одолеть — перамага́ць / перамагчы́; асі́льваць / асі́ліць; ду́жаць / здужаць; здольваць / здолець; адале́ць; бараць / збараць; ваява́ць / зваява́ць
одоление — перамага́ньне, перамога; адоля; асі́льваньне
одолжать / одолжить — пазыча́ць / пазы́чыць; дапамага́ць / дапамагчы́; услужа́ць / услужы́ць
одолжаться / одолжиться — пазыча́ць / запазы́чыць; пазыча́цца / запазы́чыцца

одолжение — пазы́ка, пазы́чка, пазыча́ньне; услу́га, паслу́га, ла́ска
сделайте одолжение — зрабе́це ла́ску
одолженный — пазы́чаны, запазы́чаны
одолжительный — услу́жлівы
одр — ложак, пасьце́ля
одр смерти — сьмяротная пасьце́ля
одряхлевший, одряхлелый — састарэлы, здрузьле́лы, згрыбе́лы; трухля́к
одряхлеть — састарэць, здрузьле́ць, згрыбе́ць
одувание — абдува́ньне, абдмуха́ньне, абдзьмуха́ньне
одуванчик — *бот.* (*Taraxacum vulgare Schrank*) дмухаве́ц (дзьмухаве́ц) б. т., пухар В. кр. сл. ксяндзоў плеш
одувать / одуть — абдува́ць / абду́ць; абдму́хваць / абдму́хаць; абдзьму́хваць / абдзьму́хаць
одуматься — разду́мацца, схамяну́цца
одурачивание — абду́рваньне
одурачивать / одурачить — абду́рваць / абдуры́ць
одуревший, одурелый — здурэлы, здурне́лы, ачму́раны, атлу́млены, зьняпрытомнены
одурение — здурэньне, здурне́ньне, ачмурэньне, атлумле́ньне
одуреть — здурэць, здурне́ць, ачмурэць, зьняпрытомнець
одурманить — адурма́ніць, ачмуці́ць, атума́ніць
одурь — здурэньне, адурэньне
одурять / одурить — адурма́ньваць / адурма́ніць; атума́ньваць / атума́ніць; затлумля́ць / затлуме́ць; чму́ці́ць / ачмуці́ць
одутловатость — ады́тасьць, азы́зласьць
одутловатый — ады́ты, азы́злы
одухотворение — адухаўле́ньне
одухотворённость — адухоўленасьць
одухотворённый — адухоўлены
одухотворять / одухотворить — адухаўля́ць / адухавіць; запа́льваць / запалі́ць натхне́ньнем
одушевление — адухаўле́ньне; натхне́ньне; ажыўле́ньне
одушевлённый — адухоўлены; натхнёны
одушевлять / одушевить — адухаўля́ць / адухавіць; натыха́ць / натхну́ць; надава́ць / нада́ць ду́ху; ажыўля́ць / ажывіць
одышка — ды́хавіца
одышливый — дыхавічны
ожелудь — галалёд, аблі́ва́ха, воблі́ў
жениться — ажаніцца, аба́біцца
ожеребиться — ажарабіцца
ожерелье — кара́лі, мані́сты
ожерельный — мані́ставы
ожесточать / ожесточить — зрабіць жорсткім (лю́тым); абу́рваць / абу́ры́ць; азьвяра́ць / азьвяры́ць
ожесточение — заяда́ласьць, заўзя́тасьць, лю́тасьць, азьвярэньне
приходить в ожесточение — заяда́цца
ожесточённо — заяда́ла, заўзя́та, лю́та, пазьве́рску
ожесточённый — заяда́лы, заўзя́ты, разьлютава́ны, лю́ты, зьве́рскі
ожесточённый бой — заўзя́тая бойка
ожесточиться — разьлютава́цца, разьлютава́ць, заўзя́цца (*на каго*), абу́ры́цца, азьвярэць
ожечь — апалі́ць, апячы́
ожечься — апалі́цца, апячы́ся
оживание — аджыва́ньне
оживать / ожить — аджыва́ць / аджы́ць
оживление — ажыўле́ньне, жва́васьць
оживлённый — ажы́ўлены, жва́вы, спры́тны
оживлять / оживить — ажыўля́ць / ажывіць; аджыўля́ць / аджывіць
ожидаемый — чака́ны, спадзява́ны
ожидание — чака́ньне, пачака́нка; часава́ньне; спадзява́ньне, спадзява́нка, жда́ньне
в ожидании (чего) — чака́ючы (*чаго*), спадзяючы́ся (*на што*)
ожидать — чака́ць, спадзява́цца, ждаць
ожика — *бот.* (*Luzula DC*) сі́тніца б. т.
ожиревший, ожирелый — тлу́сты, гла́дкі; адкормлены, гладу́н
ожирение — затлусьце́ньне, пагладчэньне
ожиреть — затлусьце́ць, пагладчэць, зрабіцца тоўстым (тлу́стым, гла́дкім); адкарміцца
ожог — апёк
озаботиться — заклапаці́цца, паклапаці́цца
озабоченность — заклапочанасьць
озабоченный — заклапочаны
озабочивать / озаботить — заклапочваць / заклапаці́ць
озаглавить — (*кнігу*) даць (паста́віць) загаловак (*кні́зе*)
озадаченный — азада́чаны, зьбі́ты з панталы́ку
озадачивать / озадачить — азада́чваць / азада́чыць; зьбіва́ць / зьбіць з панталы́ку
озадки — паза́дкі, аза́дзьдзе
озарение — азарэньне, асьвятле́ньне

озарять / озарить — азара́ць / азары́ць; асьвятля́ць / асьвятлі́ць
озверевший, озверелый — азьвярэлы
озвереть — азьвярэць
оздоравливать / оздоровить — аздараўля́ць / аздарав і́ць
оздороветь — вы́здаравець, ачу́няць, папра́віцца
оздоровление — аздараўле́ньне
оздоровленный — аздароўлены
озеленять / озеленить — пазеляня́ць / пазелянці́ць
оземь — вобземлю
озёристый — вазёрысты (азёрысты)
озёрный — вазёрны (азёрны)
озеро — возера *мн.* вазёры (азёры), плёса
озеро концевое (устьевое) — возера бясстокавае
озеро краевое — возера ўскра́йнае
озеро кратерное — возера жарлавое
озеро плотинное — возера грэблевае
озеро проточное (речное) — возера стокавае (рэчнае)
озеро самосадочное — возера самаса́дкавае г.-к. т.
озимый — зімавы́, азі́мы
озимые всходы — рунь
озимь — азі́міна, зімавое; рунь
озираться / озирнуться — азіра́цца / азірну́цца; аглядза́цца / аглянну́цца
озлатить — пазалаці́ць
озлобление — злаба́, злосьць, зласьлі́васьць, раззлава́ньне
озлобленно — злосна, злобна
озлобленность — раззлава́насьць, злобнасьць
озлобленный — раззлава́ны, злобны, разгне́ваны
озлоблять / озлобить — злава́ць / раззлава́ць; азлаб і́ць, разгнявіць; раздражня́ць / раздражні́ць
ознакомиться — азнаёміцца, аглядзе́цца, асвойтацца, спазна́цца, агоўтацца
ознакомление — азнаямле́ньне
ознакомленный — азнаёмлены, азнаёмлены
ознакомлять / ознакомить — азнаёмліваць / азнаёміць, азнаёміць, пазнаёміць
ознаменование — азна́ка, знак, адзначэньне, па́мятка
ознаменовывать / ознаменовать — адзнача́ць / адзна́чыць; азнайма ваць; выяўля́ць / вы́явіць; вы́славіць
означать / означить — зна́чыць, азнача́ць / азна́чыць, пазна́чыць, вы́значыць
означение — азначэньне
означенный — азна́чаны
озноб — дрыжыкі; (*лихорадочный*) тра́сца
озолотить — азалаці́ць; пазалаці́ць
озон — *хим.* азон
озорник — свавольнік, шы́беньнік (шы́бенік, шы́бельнік), ві́сус, галі́на, буя́н
озорница — свавольніца, шы́беньніца (шы́беніца, шы́бельніца)
озорной — свавольны
озорство — свавольства, буя́нства
озяблый, озябший — зьмерзлы, скале́лы
озябнуть — зьме́рзнуць, зьме́рзьці, скале́ць, пакале́ць
ой — вой, ай
ой ли — хіба́ ж, няўжо ж
ойкание — войканьне, е́нчаньне
ойкать — войкаць, е́нчыць, е́нкаць
Ока — *р.* Ака́
оказия — ака́зія, вы́па́дак, здарэньне
оказывать / оказать — (*кому что*) выяўля́ць / вы́явіць; чыні́ць / учыні́ць; рабі́ць / зрабі́ць
оказать давление — намагчы́ся, наці́снуць
оказать заботливость — дагле́дзець
оказать помощь (содействие) — дапамагчы́, даць ра́ду
оказать сопротивление — супраці́віцца, папраці́віцца
оказать уважение — ушанава́ць
оказываться / оказаться — (*чем*) зьяўля́цца / зьявіцца; стаць, ста́цца; (*где*) апыну́цца
окаймление — аблямава́ньне
окаймлённый — аблямава́ны
окаймлять / окаймить — аблямо ўваць / аблямава́ць
окалечить — пакале́чыць, скале́чыць
окаменевший, окаменелый — скамяне́лы
окаменелость — скамяне́ласьць
окаменеть — скамяне́ць, закамяне́ць, укамяне́ць
оканчивание — закончваньне
оканчивать / окончить — канча́ць / скончыць; закончыць, дакончыць
окончить работу — упра́віцца, падупра́віцца
окончить вспашку — абара́цца
окончить косьбу — абкасі́цца
окончить молотьбу — абмалаці́цца
окончить посев — абсе́яцца

окончить счёты — расквітáцца
окончить курс учения — скончыць навýкі, вы́адукавацца
окапчивать / окоптить — закопчваць / закапці́ць
окапывать / окапать — абка́пваць / абка́паць; зака́пваць / зака́паць; акапі́ць
окапывать / окопать — акопваць / акапа́ць; абкопваць / абкапа́ць
окармливать / окормить — абкормліваць / абкарміць
окарнывать / окарнать — адціна́ць / адця́ць; абраза́ць / абрэзаць
окатывать / окатать — акругля́ць / акругліць; абкочваць / абкача́ць
окачивать / окатить — аблівáць / аблíць
окашивать / окосить — абкошваць / абкасíць
окаянный — праклáты; бязбожны
окаянство — бязбожнасьць; бяда́, няшча́сьце
окаять — праклiна́ць
океан — акія́н
океанический — акіяні́чны
океанский — акія́нскі
окидывать / окинуть — абкíдваць, абкіда́ць / абкíнуць; абсыпа́ць / абсы́паць; абгортваць / абгарну́ць
окинуть взором — скíнуць вокам (вачы́ма) (*на што*)
окинуло губы — абсы́пала гу́бы
окидываться / окинуться — акíдвацца, акіда́цца / акíнуцца; акрыва́цца / акры́цца; ахýтвацца / ахýтацца
окинуться платком — акры́цца (ахíну́цца) хýсткай, завíну́цца ў хýстку
окисать / окиснуть — скіса́ць / скíснуць; сквáшвацца / сквáсіцца
окисление — акісьлéньне
окислённый — акíсьлены, сквáшаны
окислость — акíсласьць, сквáсласьць, сквасьнéласьць
окислый — акíслы, скíслы, сквáслы, сквасьнéлы
окислять / окислить — акісьля́ць / акíсьліць; скíсьліць
окись — *хим.* акíсласьць, тлéньнік х. т.
оккупант — акупáнт
оккупационный — акупацы́йны
оккупация — акупáцыя, забráньне
оккупированный — акупавáны, забráны
оккупировать — акупавáць, забірáць
оклад — **1.** (*жалованье*) аклáд, пэнсія; **2.** (*у иконы*) апрáва, шáты
оклад лица — аблíчча
окладистый — асáдзісты
окладистая борода — шырокая барадá
окладка — вокладка, апрáва
окладной: окладное жалованье — вы́значаная па штáту пэнсія
окладывание — абклáдваньне, абкладáньне
окладывать / окласть — абклáдваць, абкладáць / абклáсьці; абшываць / абшы́ць (*дошкамі*); асáджваць / асадзíць; апраўля́ць / апрáвіць; (*камнем, кирпичом*) абмуроўваць / абмуравáць
оклеветание — абмаўлéньне, абмовá; удáньне
оклеветанный — абмоўлены, удáны
оклеветать — абмовíць, аббрахáць, ашальмавáць, абнясла́віць, збэсьцíць; удáць
оклёвывать — *см.* **обклёвывать**
оклеивать / оклеить — абклéйваць / абклéіць; аклéйваць / аклéіць; абляпля́ць / абляпíць
оклейка, оклеивание — абклéйваньне, аклéйваньне
оклейщик — абклéйнік, аклéйнік, шпалéрнік
оклик — гукáньне, вы́гук, воклíк
окликать, окликивать / окликнуть — гукáць / гукну́ць; аклікáць / аклíкнуць
оклычиться — усклы́чыцца
окно — вакно
вставить стекло в окно — устáвіць шы́бу (*балонку*)
око — вока
око воробьиное — *бот.* (*Capsella Bursa pastoris Moench.*) стрэлкі б. т.
окованный — акýты, закýты
оковка — акýцьце
оковы — аковы, кайдáны, зялéзы, ланцугí
оковывание — акоўваньне, акýцьце
оковывать / оковать — акоўваць / акавáць, акýць; закоўваць / закавáць, закýць
околачивать / околотить — абабівáць / абабíць; атрýшваць / атрусíць; насáджваць / насадзíць
околачиваться — абабівáцца; брóінды біць, бíбікі біць, агінáцца, туля́цца, латравáць, гультаявáць
околдованный — ачаравáны, зачаравáны
околдовывать / околдовать — ачароўваць / ачаравáць; зачароўваць / зачаравáць
околевать / околеть — здыхáць / здохнуць, паздыхáць; акаляваць / акалéць, здырдзíцца, скапы́ціцца
околевший, околелый — здохлы; акалéлы

О

околесить — скалясíць / аб'éзьдзіць
околёсица — лýхта́
нести околёсицу — лýхціць, малоць лýхту́, плявýзгаць, чаўпсьцí (*ня вéдаючы што*)
околица — ваколіца, акру́га
околичный — вакольны, акалíчны, наўкольны
около — каля́, акаля́, вокал, вакол, навокал, наўкола, край; блíзка, зблíзу
обойти около дома — абыйсьцí навокал ха́ты
сесть около дома — сéсьці каля́ ха́ты
около 3 вёрст — блíзка трох вёрст; на валоў рык
около осени — пад восень
около того — блíзка таго
околопестиковый — *бот.* (*perigynus*) каляслупковы
околоплодник — *бот.* (*pericarpium*) каляплоднік, насéньнік
околотить — *см.* **околачивать**
околоток — ваколіца; раён, акру́га
околоточный — раённы; сусéдні, памéжны
околоцветие — *бот.* (*perianthium*) аквéцьце б. т.
околошейный — каляшы́йны
околпачивать / околпачить — абду́рваць / абдурыць
околыш — аколак
окольный — кру́жны, узбочны, памéжны
окольная дорога — кру́жня
оконечность — канéц, канча́так, аканцава́ньне
оконечный — канцавы́, канцовы
оконница — *см.* **ставень**
оконный — ваконны, вакéнны
оконное стекло — шы́ба (*уменьш.* шы́бка), кватэрка, балонка
оконопачивать / оконопатить — аканапáчваць / аканапáціць; зашпаклёўваць / зашпаклява́ць
оконфузить — *см.* **сконфузить**
оконце — ваконца, акéнца
окончание — заканчэньне (*як дзéяньне*); канéц, канча́так
окончание вспашки — даворкі
окончание молотьбы — дамалоткі
окончание жатвы — дажы́нкі
окончание посева — дасéўкі
окончание следует — канéц бу́дзе
окончательно — канчаткова, канча́льна, аканча́льна; у канéц, ушчэнт, дашчэнту, упра́х
окончательный — канчатковы, канча́льны, аканча́льны
оконченный — скончаны, закончаны
окончить — *см.* **оканчивать**
окоп — акоп
окопать — *см.* **окапывать**
окопник — *бот.* (*Symphytum officinale L.*) жывакост б. т.
окопный — акопны
окорачивать / окоротить — укарочваць / уцараціць, пакараціць
окоренеть — укаранéць, укараніцца
окоржавевший — скаржавéлы, скарэлы
окоржаветь — скаржавéць, скарэць
окормить — *см.* **окармливать**
окорнать — *см.* **окарнывать**
окорок — кумпя́к, шы́нка, сьцягня́к, ля́жка
окоростелый — карасьлíвы
окоряветь — скара́вець, скарэць
окосмателый — кашла́ты, касма́ты
окосматеть — акашла́цець, акасма́цець
окостенелость — скасьцяне́ласьць, закасьцяне́ласьць
окостенелый — скасьцяне́лы, закасьцяне́лы
окостенение — скасьцяне́ньне, закасьцяне́ньне
окостенеть — скасьцяне́ць, закасьцяне́ць
окотиться — акаціцца
окоченевший, окоченелый — адубе́лы, адубяне́лы
окоченение — адубе́ньне
окоченеть — адубе́ць, задубе́ць; зьме́рзнуць, азале́ць
окраина — ускра́іна, паўзьме́жжа, мяжа́
окраинный — ускра́інны, паўзьме́жны
окраска — афарбоўка, афарбава́ньне, абмаля-ва́ньне
окрашенный — афарбава́ны, абмалёваны, абмалява́ны
окрашивание — фарбава́ньне, афарбава́ньне, малява́ньне, абмалёўваньне
окрашивать / окрасить — афарбоўваць / афарбава́ць; абмалёўваць / абмалява́ць
окрепнуть — узмацне́ць, узмацні́цца, узду́жаць, пакрапчэць
окрепший — узмацне́лы
окрест — *см.* **кругом**
окрестить — ахрысьці́ць, вы́хрысьціць
окрестность — ваколіца, вакольнасьць, акру́жына
окрестный — ваколíчны, вакольны
окривевший, окривелый — аднавокі

окриве́ть — пакале́чыць вока
окри́к — гука́ньне, вы́гук
окрика́ть / окрикну́ть — гука́ць / гукну́ць
окристаллизова́ться — акрышталізава́цца, вы́крышталізавацца
окрова́вливать / окрова́вить — акрыва́ўліваць / акрыва́віць, акрыва́ніць; укрыва́ўліваць / укрыва́віць
окровя́нить — акрыва́ніць
окроек — акра́вак
окропля́ть / окропи́ть — акрапля́ць / акрапі́ць; пакрапі́ць
окро́шка — (*кушанье*) халадні́к, халадзе́ц
о́круг — акру́га
округлённый — акру́глены, закру́глены
округло — акру́гла, кругля́ва
округлость — акру́гласць, кругля́васць
округлый — акру́глы, кругля́вы
округля́ть / округли́ть — акругля́ць / акругліць, закругля́ць / закругліць
окружа́ть / окружи́ть — акружа́ць (абкружа́ць) / акружы́ць (абкружы́ць); атача́ць / атачы́ць; абсе́джваць, абсяда́ць / абсе́сьці; апаноўваць / апанава́ць; абгарну́ць
окружа́ющий — вакольны, наўкольны, навакольны
окруже́ние — акружэ́ньне (абкружэ́ньне), атачэ́ньне; асяда́ньне; апанава́ньне
окружно́й, окружны́й — акруговы, акру́жны
окру́жность — акру́жына м. т., абадні́ца
окру́жность вписанная — акру́жына ўпі́саная
окру́жность описанная — акру́жына апі́саная м. т.
окручивать / окрути́ть — акру́чваць / акруці́ць; закру́чваць / закруці́ць
окрыле́ние — акрыле́ньне
окрылять / окрыли́ть — акрыля́ць / акрыліць; надава́ць / нада́ць натхне́ньня
окры́ситься — натапы́рыцца, настаўбу́рыцца
октава — **1.** *муз.* акта́ва; **2.** *лит.* васьміве́рш
октя́брины — акцябры́ны
октя́брь — кастры́чнік
октя́брьский — кастры́чнікавы, кастры́чніцкі
окудря́веть — закучара́вець
окулирование — прышчэпліваньне
окулировать — прышчапля́ць, прышчэпліваць
окулировка — прышчэпка
окули́ст — вочны доктар, акулі́сты
окунать / окунуть — апуска́ць / апусьці́ць у ваду́
окуневый — акунёвы
окунуться — апусьці́цца ў ваду́, чабоўхнуцца
окунь — *зоол.* (*Perca fluviatilis*) вокунь
окупать / окупить — акупля́ць / акупі́ць; выкупля́ць / вы́купіць; адшкадоўваць / адшкадава́ць (*выда́ткі*)
окуривать / окурить — абку́рваць / абкурыць
окурносить — зрабіць кірпаносым
окуро́к — аку́рак, недаку́рак
окутывание — аку́тваньне, атуле́ньне, заку́тваньне
окутывать / окутать — аку́тваць (ахо́тваць) / аку́таць (ахо́тваць); атуля́ць / атулі́ць; заку́тваць / заку́таць
окучивание — абкопваньне
окучивать / окучить — абкопваць / абкапа́ць; (*мотыкой*) капані́чыць / абкапані́чыць
оладья, оладейка — алáдка
олеандр *бот.* (*Nerium oleander L.*) алеа́ндар
Олег — *и. соб.* Але́г
оледене́лый — абледзяне́лы, зледзяне́лы
оленево́дство — гадоўля але́няў
оле́ний — але́невы
оле́нь — але́нь
олень се́верный — *зоол.* (*Rangifer*) рага́ль з. т.
о́лива — алі́ва
оливковый — алі́вавы
олига́рх — алігáрх
олига́рхия — алігáрхія
Олимп — *геогр.* Алімп
олимпиа́да — *ист.* алімпія́да
олимпиец — алімпіец
олимпи́йский — алімпійскі
олифа — пакост
олицетворе́ние — увасабле́ньне л. т.
олицетворённый — увасоблены
олицетворя́ть / олицетвори́ть — увасабля́ць / увасобіць
олово — цы́на
оловя́нный — цыновы, цы́навы
олух — ёлуп (ёлап), ёлапень, стату́й
Ольга — *и. соб.* Вольга
ольха́ — *бот.* (*Alnus L.*) вольха, альха́, альшы́на
ольхови́на — але́шына
ольховый — альховы
ольховый лес — але́шнік, альшэ́ўнік
ольховая трясина — алёс
омар — *зоол.* (*Homarus*) амáр

О

омачивать / омочить — абмочваць / абмачы́ць; умочваць / умачы́ць
омела — *бот.* (*Viscum album L.*) амяла́, вяха́
омерзевший, омерзелый — абры́длы
омерзение — брыдота, гідота
омерзеть — абры́дзець, абры́днуць, агі́дзець, апры́крыць
омерзительно — агі́дна, гі́дка, гідлі́ва, бры́дка, пага́на
омерзительность — агі́днасьць, гі́дкасьць, бры́дкасьць
омерзительный — агі́дны, гі́дкі, гідлі́вы, бры́дкі
омертвелость — амярцьве́ласьць, адубе́ласьць
омертвелый, омертвевший — амярцьве́лы, зьмярцьве́лы, струпяне́лы, адубе́лы, апруцяне́лы
омертвение — амярцьве́ньне, зьмярцьве́ньне, адубе́ньне
омертветь — амярцьве́ць, зьмярцьве́ць, струпяне́ць, адубе́ць, апруцяне́ць
омёт — торпа, скі́рта
омнибус — амнібу́с
омнибусный, омнибусовый — амнібу́сны, амнібу́савы
омовение — абмыва́ньне
омолаживать / омолодить — адмалоджваць / адмаладзі́ць
омолачивать / омолотить — абмалочваць / абмалаці́ць
омоложение — адмаладжэньне
омоложенный — адмалоджаны
омоним — аднайме́ньнік л. т.
омонимия — аднайме́ннасьць л. т.
омонимный — аднайме́нны
омофор — амафор, наплёчнік
омочать / омочить — мача́ць / абмачы́ць
омочение — абмачэньне
омрачать / омрачить — зацямня́ць / зацямні́ць; зацьмява́ць / зацьмі́ць; атума́ньваць / атума́ніць; марочыць, замарочваць / замарочыць; засьляпля́ць / засьляпі́ць; ачмуча́ць / ачмуці́ць
омрачение — за́цьма, зацьме́ньне, марока, засьляпе́ньне, ачмучэньне
омрачённый — зацямнёны, атума́нены, замарочаны, засьляплёны, ачму́чаны
омут — вір
омывать — *см.* **обмывать**
он — ён (*ж.* яна́, *ср.* яно)
она — *см.* **он**
онагр — *зоол.* (*Equus asinus onager*) ана́гар
онанизм — ананізм, самаблу́дзтва
онанист — ананісты, самаблу́днік, рукаблу́днік
Онега — *р.* Ане́га
Онежское озеро — Ане́скае возера
онемевший, онемелый — аняме́лы
онеметь — аняме́ць
оникс — *мин.* анікс
оно — *см.* **он**
ономедни — нады́сь, анады́сь
онуча — ану́ча; (*суконная*) суконка
оный — той, не́йкі
опавший, опалый — апа́лы, спа́лы, пале́глы
опадание, опадение — апада́ньне, апа́д, спад
опадение листьев — лістапа́д
опадать / опасть — апада́ць / апа́сьці; спада́ць / спа́сьці; абсыпа́цца / абсы́пацца; паляга́ць / пале́гчы
опадки — па́далкі (*я́блыкі*)
опаздывание — пазьне́ньне
опаздывать / опоздать — спозьніваццa / спазьні́цца
опаивание — апойваньне
опаивать / опоить — апойваць / апаі́ць
опал — *мин.* апа́л
опала — няла́ска
попасть в опалу — стра́ціць ла́ску
опалённый — апа́лены (абпа́лены), абсма́лены, апе́чаны
опалиться — апалі́цца (абпалі́цца), абсмалі́цца, апячы́ся
опалость — апа́ласьць
опалывать / ополоть — аполваць / апалоць
опалый — *см.* **опавший**
опальный — хто ўпаў у няла́ску, хто стра́ціў ла́ску
опалять / опалить — апа́льваць (абпа́льваць) / апалі́ць (абпалі́ць); абсма́льваць / абсмалі́ць
опамятоваться — апа́мятацца, апрытомнець, ачуня́ць; ачу́хацца, схамяну́цца; праглуздацца
опара — апа́ра; рошчына
опаривать / опарить — апа́рваць / апа́рыць
опарник, опарыш — дзяжа́ (*хлебная*)
опаршивелый — спаршыве́лы, шалудзі́вы
опаршиветь — спаршы́вець, сшалудзі́вець
опасаться — непакоіцца; бая́цца, палохацца, сьцерагчы́ся
опасение, опаска — непакой, баязьнь (боязьнь), сьцеражлі́васьць, асьцярога

с опаской — асьцярожна
опасливо — сьцеражлі́ва
опасливость — сьцеражлі́васьць
опасливый — сьцеражлі́вы
опасно — небясьпе́чна
опасность — небясьпе́ка
опасный — небясьпе́чны
опахало — маха́ла, вахля́р
опахивание — (*поля*) абворванье
опахивать / опахать — (*поле*) абворваць / абара́ць, паабворваць
опахивать / опахнуть — абма́хваць / абмахну́ць; абтропваць / абтрапа́ць (*пыл*)
опека — апе́ка
быть в опеке — апекава́цца
опекать — апекава́ць
опекун — апяку́н
опекунский — апяку́нскі
опекунство — апяку́нства, апе́ка
опекунша — апяку́нка
опеленать — спаві́ць, павіць
опёнковый — апе́нькавы
опёнок — *бот.* (*Agaricus melleus L.*) апе́нька; апе́нькі *мн.*
опера — о́пэра
оператор — апэра́тар
операционный — апэрацы́йны
операция — апэра́цыя
опережать / опередить — выпераджа́ць / вы́перадзіць
оперение — апярэньне
оперетка — апэрэ́тка
опереточный — апэрэ́тачны
опереться — *см.* **опираться**
оперившийся — убра́ны ў пе́р'е, пакры́ты пе́р'ем
неоперившийся птенец — галапу́пак
оперировать — апэрава́ць, рабіць апэра́цыю, дзе́яць
оперный — о́пэрны
оперяться / опериться — апяра́цца / апяры́цца; убіра́цца / убра́цца ў пе́р'е, пакры́цца пе́р'ем
опечаленный — засмучоны, замаркочаны
опечаливать / опечалить — засмуча́ць / засмуці́ць; маркоціць / замаркоціць
опечалиться — засмуці́цца, засмутква́цца, засумава́ць, зажуры́цца, замаркоціцца
опечатка — друка́рская памы́лка, памы́лка дру́ку, хі́ба дру́ку
опечатывать / опечатать — запяча́тваць / запяча́таць
опешивать / опешить — утароплівацца / утаропіцца; бянтэжыцца / зьбянтэжыцца; зьбіва́цца / зьбі́цца з панталы́ку
опивать / опить — апіва́ць (абпіва́ць) / абапі́ць
опивки — сьпі́ткі, недапі́ткі
опий, опиум — опіум
опилки — апі́лкі, *собир.* пілаві́ньне
опираться / опереться — апіра́цца (абпіра́цца) / абапе́рціся; абляга́цца / аблегчыся
описание — апіса́ньне
описанный — апі́саны
описатель — апіса́льнік
описательница — апіса́льніца
описательный — апіса́льны, апісо́ўны
описаться — схібіць у пісьме́ (*пі́шучы*), зрабіць пі́шучы памы́лку; апіса́цца
описка — хі́ба (памы́лка) пісьма́; апі́ска
описывание — апі́сваньне
описывать / описать — апі́сваць / апіса́ць
опись — сьпіс, попіс
опись вещей — рэчасьпіс
опиться — абапі́цца, упіцца
оплавлять / оплавить — ачышча́ць / ачы́сьціць, топячы (*што*)
оплакивать / оплакать — апла́кваць / апла́каць
опламенеть — заня́цца полымем
опластование — спластава́ньне
опластовать — спластава́ць, скла́сьці пласта́мі
оплата — апла́та, вы́плата, вы́плат *м*
оплатный — апла́тны, вы́платны
оплачивать / оплатить — апла́чваць / аплаці́ць
оплёванный — аплёваны (абплёваны), аплява́ны (абплява́ны)
оплёвывать / оплевать — аплёўваць (абплёўваць) / аплява́ць (абплява́ць)
оплесневеть — *см.* **заплесневеть**
оплетание — аплята́ньне
оплетать / оплести — аплята́ць / аплясьці; *перен.* абду́рваць / абдурыць
оплеуха, оплеушина — аплява́ха, поўха, поўх, плюха
оплечье — апле́чча
оплешиветь — аблысе́ць, вы́лысець, зрабіцца лы́сым (пляшы́вым)
оплодотворение — запладне́ньне
оплодотворённый — заплоднены
оплодотворять / оплодотворить — запладня́ць / запладні́ць
оплот — заслона, зату́ла, абарона

О

оплошать — схібіць, пахібіць, памылíцца, абмахнýцца; (*при выстреле*) спудлавáць
оплошно — хíбна
оплошность — хíба, пахíба, хíбнасьць
оплошный — хíбны, пахíбны, памы́льны
оплывать / оплыть — аплывáць / апльць; тапíцца (*пра сьвéчку*)
оповещать / оповестить — (*о чём*) апавяшчáць / апавясьцíць; абвяшчáць / абвясьцíць; паведамлáць / павéдаміць
оповещение — апавяшчэньне, абвяшчэньне, абвéстка, паведамлéньне
опоганивать / опоганить — спагáньваць / спагáніць; запагáньваць / запагáніць; паскýдзіць / спаскýдзіць
опоек — апойка
опоенный — апоены
опоздалый, опоздавший — спозьнены
опоздание — спазьнéньне
опоздать — *см.* **опаздывать**
опознавать / опознать — распазнавáць / распазнáць
опознаться — памылíцца (*пры спатканьні*)
опозоренный — абняслáўлены, згáнены, ашальмованы, збэшчаны
опозорить — абняслáвіць, згáніць, згáньбіць, ашальмавáць, збэсьціць
опоить — *см.* **опаивать**
опой — апой
ополаскивать / ополоснуть — апалоскваць / апаласкáць, апаласнýць
ополдни — апоўдні, апоўдзень
оползать / оползти — апаўзáць / апаўзьцí
оползень — апоўзак
ополночь — апоўначы
ополоуметь — звар'яцéць, з розуму зыйсьцí, з глуздоў зьбíцца
ополудни — *см.* **ополдни**
ополчаться / ополчиться — узбройвацца / узброіцца, нарыхтавáцца да бітвы́
ополченец — рáтнік, ваяўнік, ваяка
ополчение — узбраéньне; рáтніцтва
ополячение — апаля́чаньне
ополяченный — апаля́чаны, спольшчаны
ополячивать / ополячить — апаля́чваць / апаля́чыць, спольшчыць, спалянізавáць
опомёлок — дзяркáч
опомелье — памялíшча
опомниться — *см.* **опамятоваться**
опона — папона, апона, гýнька
опор: во весь опор — учвáл, наўскачкí
опора — падпора, падстáва, апора; затýла, абарона
точка опоры — апорны пункт
опоражнивание, опорожнение — апаражнéньне
опоражнивать / опорожнить — апаражня́ць / апаражні́ць; спаражня́ць / спаражні́ць
опорный — падпорны, падстáўны, апорны
опорок — атопак, стопак, абносак
опороситься — апарасíцца
опороченный — згáньбены, згáнены, абняслáўлены
опорочивать / опорочить — гáньбіць / згáньбіць; гáніць / згáніць; абняслáвіць
опорошить — абцярушы́ць
опостылевший — абры́длы, пасты́лы, спасты́лены
опостылеть — абры́дзець, абры́днуць, апасты́лець
опохмеляться / опохмелиться — пахмяля́цца / пахмялíцца
опочивальня — спачывáльня, спáльня, бакоўка
опочивать / опочить — спачывáць / спачы́ць; адпачывáць / адпачы́ць
опошлеть, опошлиться — аплюгáвець, аплюгáвіцца; зрабíцца нікчэмным (бры́дкім, гíдкім)
опояска — падпярáзка; (*из лент*) бандзéля
опоясывание, опоясание — падпярáзваньне, падперазáньне
опоясывать / опоясать — падпярáзваць / падперазáць
оппозиционер — апазыцыянéр
оппозиционный — апазыцы́йны
оппозиция — апазы́цыя
оппозиция Светила с Луной — *астр.* процістаянье Сьвяцíла з Мéсяцам г.-к. т.
оппонент — апанэнт, супярэчнік л. т., процімóўца
оппонентка — апанэнтка, супярэчніца
оппонировать — супярэчыць
оправа — апрáва, асáдка
оправдание — апраўдáньне
оправдательный — апраўдáльны
оправдывать / оправдать — апрáўдваць / апраўдáць; абязьвіня́ць / абязьвініць; усправядлíвіць
оправдываться / оправдаться — апрáўдвацца / апраўдáцца, усправядлíвіцца; (*о словах*) спрáўджвацца / спрáўдзіцца

оправление — апраўле́ньне, аса́джваньне, упара́дкаваньне
оправлять / оправить — апраўля́ць / апра́віць; аса́джваць / асадзі́ць; папраўля́ць / папра́віць; упара́дкаваць
оправляться — *перен.* хадзі́ць да ве́тру
оправляться / оправиться — папраўля́цца / папра́віцца, вы́хвараць, ачуня́ць (пасьля́ хваробы); аса́джвацца
опрашивание — апы́тваньне
опрашивать / опросить — апы́тваць / апыта́ць
определение — азначэ́ньне, вызначэ́ньне; (*судебное*) прысу́д, вы́рак, пастано́ва
определённо — азна́чана, пэ́ўна
определённость — азна́чанасьць, пэ́ўнасьць
определённый — азна́чаны, пэ́ўны; вы́значаны
определитель — вызна́чнік м. т., азна́чнік
определительный, определяемый — азнача́льны
определять / определить — азнача́ць / азна́чыць (*мяжу́*); вызнача́ць / вы́значыць; прызнача́ць / прызна́чыць (*на паса́ду*); прысуджа́ць / прысудзі́ць; выпрака́ць / вы́ракчы
определиться на должность — даста́ць паса́ду
опреснок — перапе́чка
опричник — *ист.* апры́чнік
опричь — апроч, апрача́
опробковение — (*оболочки*) скаркаве́ньне б. т.
опробковеть — скаркаве́ць
опровергать / опровергнуть — абвяргаць / абве́ргнуць; зьняпра́ўджваць / зьняпра́ўдзіць; даводзіць / дае́сьці няпра́ўду (*чаго*); запярэчваць / запярэчыць
опровержение — абвяржэ́ньне, зьняпра́ўджаньне, адгавор
опроверженный, опровергнутый — абве́ржаны, зьняпра́ўджаны
опрокидывание — зава́льваньне, перакі́льваньне, абарочваньне
опрокидывать / опрокинуть — валя́ць, зава́льваць / завалі́ць, павалі́ць; перакі́даць / перакі́нуць
опрокидываться / опрокинуться — перакуля́цца / перакулі́цца; абарочвацца / абярну́цца
опрокинутый — зава́лены, абе́рнуты, перакі́лены, абу́раны
опрометчиво — неразва́жна, неразва́жліва, ра́птам, безгалова, пары́ўча, неаба́чліва
опрометчивость — неразва́жнасьць, неразва́жлівасьць; безгаловасьць, неаба́члівасьць, пары́ўчасьць
опрометчивый — неразва́жны, неразва́жлівы, безгаловы, неаба́члівы, пары́ўчы
опрометью — стры́мгалаў (стрымгалоў), кулём, ку́мільгам, ра́птам
опрос — апыта́ньне
опросить — *см.* **опрашивать**
опросный — апыта́льны
опроститься — апросьціцца, зрабі́цца простым чалаве́кам
опростоволоситься *перен.* схі́біць, здурава́ць
опросчик — апыта́льнік
опротестовать — апратэстава́ць, запярэчыць
опротивевший — апры́кры, зьнялюбе́лы, абры́длы, спасты́лены
опротиветь — апры́краць, зьнялюбе́ць, абры́дзець, абры́дзіць
опрыскивание — апы́рскваньне (абпы́рскваньне)
опрыскивать / опрыскать, опрыснуть — апы́рскваць (абпы́рскваць) / апы́рскаць (абпы́рскаць), апырснуць (абпы́рснуць)
опрятливо, опрятно — аха́йна, чы́ста
опрятливость, опрятность — аха́йнасьць
опрятливый, опрятный — аха́йны, чы́сты
опрятная — чысьцёха
оптик — оптыка
оптика — оптыка
оптимизм — аптымі́зм, сьветлагля́дзтва л. т.
оптимист — аптымі́сты, сьветлагля́днік л. т.
оптимистический — аптымі́сты́чны, сьветлагля́дны л. т.
оптимум — оптымум
оптический — апты́чны
оптовщик — гуртаўні́к, гуртаві́к
оптовый — гуртавы́
оптовая торговля — гуртавы́ га́ндаль
оптом — гу́ртам, агу́лам
опубликование — апублікава́ньне, агалашэ́ньне
опубликовывать / опубликовать — апублікоўваць / апублікава́ць; агалаша́ць / агаласі́ць; абвяшча́ць / абвясьці́ць
опускание — апуска́ньне, зьніжэ́ньне, заняпа́д
опускать / опустить — апуска́ць, апушча́ць / апусьці́ць; зьніжа́ць / зьні́зіць; тра́ціць / стра́ціць; запада́ць, занепада́ць

О

опускаться / опуститься — апуска́цца / апусьці́цца; зьніжа́цца / зьні́зіцца; занепада́ць / заняпа́сьці; (*о доме*) асяда́ць / асе́сьці
опустевший, опустелый — спусьце́лы, спустошаны
опустение — спусьце́ньне, пустэча
опустеть — спусьце́ць
опустошать / опустошить — пустошыць, спусташа́ць / спустошыць; апусташа́ць / апусташы́ць
опустошение — спусташэньне, апусташэньне, зьнішчэньне
опустошенный — спустошаны, апустошаны, вынішчаны
опустошитель — спусташа́льнік, зьнішча́льнік
опустошительный — спусташа́льны, спустошлівы, зьнішча́льны
опутывание — пу́таньне, апу́тваньне
опутывать / опутать — пу́таць, апу́тваць / апу́таць; *перен.* аплу́тваць / аплу́таць; абшу́кваць (ашу́кваць) / абшука́ць (ашука́ць)
  опутать проволокой — абдратава́ць
опухание — апуха́ньне
опухать / опухнуть — апуха́ць / апу́хнуць, апу́хці; набруза́ць / набру́знуць
опухлость — апу́хласьць
опухлый — апу́хлы
опухоль — вопух, пухлі́на
опушать / опушить — аблямоўваць / аблямава́ць ху́трам
опушка — (*платья*) аблямоўка; (*леса*) за́варат, узьле́сьсе, узьле́сак, край ле́су
опущение — апушчэньне, памы́лка, пахі́ба, недагля́д
опущенный — (*взор*) пану́раны
опыление — запылкава́ньне б. т., апылкава́ньне
опылять / опылить — запылкоўваць / запылкава́ць; апылкоўваць / апылкава́ць
опыт — дасьвядчэньне, дасьве́дчаньне, досьлед, спроба, пра́ктыка
опытно — з дасьвядчэньнем, досьледам, у пра́ктыцы, практы́чна
опытность — дасьве́дчанасьць, спрактыкава́насьць
опытный — **1.** (*метод*) дасьвядча́льны, дасьле́дчы, спробавы; **2.** (*человек*) дасьве́дчаны, спрактыкава́ны
  опытная школа — дасьле́дчая (практыкава́льная) школа
  опытное поле — дасьле́дчае поле

опьяневший, опьянелый — ап’яне́лы, захмяле́лы
опьянение — ап’яне́ньне
опьянеть — ап’яне́ць, захмяле́ць, упі́цца
опьяняющий — п’яню́чы, хме́льны
опять — зноў, ізноў, другі́м ра́зам
орава — тлум, мноства, згра́я, плойма
оракул — ара́кул, вяшчу́н, прарака́льнік
орангутанг — *заол.* (*Phithecus satyrus*) арангута́нг
оранжевый — ара́нжавы, памеранцовы
оранжерея — сьпе́кта Шп.
орание — гарла́ньне
оратор — прамовец, красамовец, ара́тар
оратория — араторыя, прамова
ораторский — ара́тарскі, красамоўны
  ораторский дар — красамоўнасьць
ораторство — красамоўства
орать — гарла́ць, галасі́ць, дзе́рці горла
орбита — акру́жына м. т., арбі́та
орбитальный — акру́жны, арбіта́льны
орга́н — (*в костёле*) арга́ны *мн.*
о́рган — орган
  орган печати — часопіс, орган дру́ку
  органы внешних ощущений — органы знадворных адчува́ньняў
организатор — арганіза́тар
организаторша — арганіза́тарка
организация — арганіза́цыя
организм — арганізм
организованно — арганізава́на, у пара́дку
организованность — арганізава́насьць, упара́дкаванасьць
организованный — арганізава́ны, упара́дкаваны
организовывать / организовать — арганізоўваць / арганізава́ць; нала́джваць / нала́дзіць; упара́дкаваць
органист — арганісты
органический — аргані́чны
  органическое вещество — аргані́чная матэрыя
органный — арга́нны
оргия — оргія, распу́сная гульня́
орда — арда́
орден — **1.** (*знак*) о́рдэн, знак; **2.** (*общество*) о́рдэн; (*монашеский*) закон
  орден Красного Знамени — о́рдэн Чырвонага Сьця́гу
орденский — о́рдэнскі

ордер — о́рдэр, зага́д, квіто́к
ординарец — *воен.* ардына́рац, дару́чнік
ординарный — ардына́рны, звыча́йны
ордината — *мат.* ардына́та, зале́жніца
орёл — *зоол.* (*Aquila*) арол
ореол — аўрэо́ля л. т., злотабліск л. т., залаты́ бліск
орех — арэх
орех с двойным ядром — спары́ш
орех созревший, вылущившийся — лузгане́ц
орех со свищем — сьвісту́н
орех водяной — *бот.* (*Trapa natans L.*) вадзяны́ арэх, плыву́чы арэх б. т.
орех грецкий — *бот.* (*Juglans regia L.*) грэцкі (валоскі) арэх
орех земляной — *бот.* (*Equisetum pratense Ehrh.*) хвошч лугавы́ б. т.
орех кокосовый — *бот.* (*Cocos nucifera L.*) какосавы арэх
ореховидный — арахава́ты
ореховый — арэхавы, ляшчы́навы
ореховый наплыв — *лес.* арэхавая на́расьць лс. т.
орешек — арэшак
орешки — (*галлы, цецидии*) бародаўкі, я́блычкі лс. т.
орешина — арэшына, ляшчы́на
орешинка — *бот.* (*Corylus avelana L.*) арэшынка, ляшчы́на лесава́я лс. т.
орешник — арэшнік, ляскоўнік
оржавевший, оржавелый — зайржа́ве́лы
оржаветь — зайржа́ве́ць
оржаной — жы́тні
оржаное поле — жы́тнішча
оригинал — **1.** (*рукопись*) арыгіна́л, першаўзор, уласнапіс, аўтэнтык; **2.** (*человек*) дзіва́к, нязвы́чны, чудасе́й
оригинальничать — дзіва́чыць
оригинально — арыгіна́льна, самабы́тна, дзіва́чна
оригинальность — арыгіна́льнасьць, самабы́тнасьць, дзіва́чнасьць
оригинальный — арыгіна́льны, самабы́тны, дзіва́чны
ориент — *см.* **восток**
ориенталист — усходаве́д
ориентация — арыента́цыя, кіру́нак (*на што*)
ориентироваться — (*на что*) арыентава́цца, накіро́ўвацца (*на што*); (*в чём*) арыентава́цца, разьбіра́цца (*у чым*)
Орион — (*созвездие*) Касцы́
оркестр — арке́стар
оркестровать — аркестрава́ць
оркестровка — аркестро́ўка
оркестровый — арке́стравы
оркиш — *бот.* (*Triricum tomococcum L.*) воркіш
орлёнок — арляня́
орлиный — арлі́ны
орлица — арлі́ца
орличник — *бот.* (*Pteris aquilina L.*) па́параць
орлянка — (*игра*) арля́нка
орнамент — арна́мэнт, укра́са, аздоба
орнаментальный — арнамэнта́льны
орнаментика — арнамэнтыка
оробевший, оробелый — спалоханы
оробеть — спалохацца
орология — горазна́ўства г.-к. т., горае́даньне
оросительный — абвадня́льны
орошать / оросить — абвадня́ць / абвадні́ць; арашаць / арасі́ць; акрапля́ць / акрапі́ць
орошение — абвадне́ньне
ортодокс — прававе́р
ортопедический — артапэды́чны
ортопедия — артапэдыя
орштейн — *мин.* рудзя́к г.-м. т.
орудеть — зрудзе́ць
орудие — **1.** прыла́да, начы́ньне, снасьць; **2.** гарма́та
орудийный — гарма́тны
орудовать — ару́даваць, дзе́яць
оружейник — збраёўнік; збраяр Пр. в. сл.
оружейный — збраёўны
оружейная мастерская, оружейный завод — збраёўня, збройня
оруженосец — зброяно́сец
оружие — зброя
холодное оружие — вострая зброя
оружие огнестрельное — агнястрэльная зброя
с оружием в руках — збройна
оружный — збройны
орфографический — правапісны, артаграфі́чны
орфография — пра́вапіс, артагра́фія
Орша — *г.* Ворша
оршанский — аршанскі
Оршанский округ — Аршаншчына, Аршанская акру́га
оса — аса́

О

осы — *собир.* асвá
осада — аблога
осадка — (*здания*) асядáньне, западáньне
осадки — вопадзі, апáдкі
осадный — аблогавы, абложны
осадное положение — абложны стан
осадок — вопадзь; мутá, фуз
осадочный — апáдкавы, фýзавы
осадочные породы — *мин.* апáдкавыя (пластовыя) пароды г.-м. т.
осаждать / осадить — аблягáць / аблéгчы; абсядáць / абсéсьці
осаживание — асáджваньне, спынéньне
осаживать / осадить — асáджваць / асадзíць; спыняць / спынíць (*каня́*); *прям.* адступáць / адступíць; падавáцца / падáцца назáд
осанисто — самавíта, павáжна
осанистость — самавítасьць, павáжнасьць
осанистый — самавíты, павáжны
осанка — постаць, пастáва, фігýра
осатанеть — асатанéць (ашатанéць)
осваиваться / освоиться — асвойвацца / асвоіцца; асвойтвацца / асвойтацца; прызвычáйвацца / прызвычáіцца (*да чаго*)
осведомление — давéдваньне, дапэўнéньне
осведомлённость — вéданьне, дасьвéдчанасьць
осведомлённый — знáўца, дасьвéдчаны
осведомляться / осведомиться — давéдвацца / давéдацца (*аб чым*); дазнавáцца / дазнáцца (*аб кім*); дапэўнівацца / дапэўніцца
освежать / освежить — асьвяжáць / асьвяжы́ць; ахаладжáць / ахаладзíць; правéтрываць / правéтрыць (*пакой*)
освежающий — ахаладжáльны
осветительный — налéжачы да асьвятлéньня
осветить — *см.* **освещать**
осветление — асьвятлéньне
осветлить — асьвятлíць
освещать / осветить — асьвятляць / асьвятлíць
освещение — асьвятлéньне
освидетельствование — агляд, асьвядчэньне
освидетельствованный — аглéджаны; асьвéдчаны; (*несколько раз*) аглядáны
освидетельствовать — аглядзéць, асьвéдчыць
освирепеть — разьлютавáцца, разьюшыцца
освистывать / освистать — абсьвíстваць / абсьвістáць
освободитель — вызвалíцель
освободительница — вызвалíцелька
освободительный — вызвалéнчы, вызвольны
освобождать / освободить — (*из неволи*) вызваля́ць / вы́звaліць; выбаўля́ць / вы́бавіць; (*от должности*) аслабаня́ць / аслабаніць
освободить из опасности — вы́ратаваць
освободить от обязанностей — звольніць
освободить помещение — апаражніць
освобождаться / освободиться — (*из неволи*) вызваля́цца / вы́звaліцца; выбаўля́цца / вы́бавіцца; (*от должности*) аслабаня́цца / аслабаніцца
освободиться из опасности — вы́ратавацца
освободиться от пут — апрастáцца, вы́прастацца
освобождение — вы́звал, вызвалéньне; выбаўлéньне; спаражнéньне
освобождённый — вы́звалены, вы́баўлены
освящать / освятить — сьвяціць, асьвячáць / асьвяціць
освящение — асьвячэньне
освящение воды — вадохрышча
освящённый — асьвéчаны
освящённая вода — сьвятáя вадá
осевой — восевы, асявы́
оседание — асядáньне
оседать / осесть — асядáць / асéсьці
осёдланный — асéданы, акульбáчаны
оседлать — асядлáць, акульбáчыць; (*ногами*) ашлáпіць
оседлость — асéласьць
оседлый — асéлы
осекаться / осечься — асякáцца / асéкчыся
осёл — асёл
оселок — брусок, брус, тачы́ла
осеменение — абсявáньне
осеменять / осеменить — абсявáць / абсéяць
осенение — ахінáньне, абцянéньне; (*крестом*) хрышчэньне, жагнáньне
осенний — асéньні, восеньскі
осенняя плата — асянíна
осень — восень
осенью — увосень
осенью родившийся — асяньчýк
осенять / осенить — ахінáць / ахінýць; (*крестом*) хрысьціць / перахрысьціць; жагнáць / пажагнáць
осеребрить — пасерабры́ць
осерчать — *см.* **рассердиться**
осесть — *см.* **оседать**

осётр — *зоол.* (*Acipenser sturio*) асяцёр
осетрина — асятры́на
осетровый — асятровы
осечка — асе́чка
осечься — *см.* **осекаться**
осиленный — асі́лены, пераможаны, здо́ужаны
осиливать / осилить — асі́льваць / асі́ліць; перамага́ць / перамагчы́, здо́ужаць
осина — *бот.* (*Populus tremula L.*) асі́на
осинник — асі́ньнік
осиновик — *бот.* (*Boletus luteus*) падасі́навік, асавя́к
осиновый — асі́навы, асовы
осиный — асі́ны
Осип — *и. соб. см.* **Иосиф**
осипать / осипнуть — асіпа́ць / асі́пнуць, асі́пці
осиплость — асі́пка
осиплый, осипший — асі́плы
осиротелый, осиротевший — асірацэ́лы, асірочаны
осиротеть — асірацэ́ць, асіраці́цца
осиротить — асіраці́ць
оскабливание — аскробваньне, аскобліваньне
оскабливать / оскоблить — аскробваць / аскраба́ць; аскобліваць / аскабліць
оскаливать / оскалить — (*зубы*) шчэрыць, вышчара́ць / вы́шчарыць; выскаля́ць / вы́скаліць
оскандалить / оскандалиться — асароміць / асароміцца скандальна
осквернённый — апага́нены, спага́нены, апаскуджаны, спаскуджаны
осквернитель — пага́нін
осквернять / осквернить — пага́ніць, апага́ньваць / апага́ніць, спага́ніць; паскуджаць, апаскуджваць / апаскуджаць, спаскуджаць; гнюсіць / абгнюсіць; га́ніць / зга́ніць; зьняважыць
осклабляться / осклабиться — ухмыля́цца / ухмыльну́цца, ашчэрыцца
осколок — аскепак, трэска, адломак; (*от камня*) ска́лка
осколочный — аскепкавы, ска́лкавы
оскользать / оскользнуть — выкоўзвацца / вы́каўзнуцца
оскомина — аскома
набить оскомину — нааскоміць
оскопитель — лягча́й, канава́л
оскопление — лягча́ньне, спакладаньне
оскоплённый — вы́легчаны, спакладаны
оскоплять / оскопить — лягча́ць / вы́легчаць; спакладаць / спакла́сьці; вы́валашыць
оскорбитель — абра́зьнік, ура́зьнік, зьневажа́льнік
оскорбительно — абра́зьліва, ура́зьліва, зьневажа́льна
оскорбительность — абра́зьлівасьць, ура́зьлівасьць, зьневажа́льнасьць
оскорбительный — абра́зьлівы, ура́зьлівы, зьневажа́льны, тклівы
оскорбление — абра́за, ура́за, зьнява́га, зьневажэньне
оскорблённый — ура́жаны, абра́жаны, зьнява́жаны
оскорблять / оскорбить — абража́ць / абра́зіць; ража́ць / ура́зіць; зьневажа́ць / зьнява́жыць
оскорняжить — абкушне́рыць
оскоромить / оскоромиться — аскароміць / аскароміцца, паскароміцца
оскорузлеть — закара́вець
оскотинеть, оскотиниться — збыдле́ць
оскрёбки — паскробкі, вы́скрабкі
оскрёбок — аскробак, паскробак, вы́скрабак
оскрёбывать / оскребать, оскресть — аскробваць / аскраба́ць, аскрэбці; падскробваць / падскрэбці
оскудевать / оскудеть — убожаць / зубожаць; гале́ць / згале́ць; зьмяншацца / зьме́ншыцца
оскуделый, оскудевший — зубожалы, згале́лы, зьме́ншаны
оскудение — зубожаньне, згале́ньне, заняпа́д, зьмяншэньне
ослабевать / ослабеть, ослабнуть — слабе́ць, сла́бнуць / асла́бнуць; занепада́ць / заняпа́сьці; тра́ціць / стра́ціць сі́лы; занядужаць
ослабевший, ослабелый — асла́блы
ослабление — асла́ба, паслабле́ньне; занядужаньне, попуск
ослабленный — асла́блены; сла́бкі
смолеватый, смолевой, смолистый — смалі́сты, смолены, смаляны́

смолистое полено — смаля́к

смолёвка — *бот.* (*Silene vulgaris Gareke*) ляскату́ха б. т.

смоление — смале́ньне

Смоленск — *г.* Смале́нск

смоленский — смале́нскі

Смоленская губерния — Смале́ншчына

смолильный — смаля́рны

смолильщик — смаля́р

смолистый — *см.* **смолеватый**

смолить / смолиться — смалі́ць / смалі́цца

смолка — (*Viscaria vulgaris Rohl.*) смолка

смолкание — змаўка́ньне

смолкать / смолкнуть — змаўка́ць / змоўкнуць

смолкший — змоўклы

смоловар, смолокур — смаля́р

смоловарня, смолокурня — смаля́рня

смолоду — змоладу, зза́маладу

смолоносный — смаланосны

смолотить — змалаці́ць

смолоть — змалоць

смолоть чушь — счаўпсьці́

смолчать — *см.* **смалчивать**

смоль — смоль

смольный — смольны, смаляны́

смолянка — *бот. см.* **смолёвка**

смоляной — смаляны́
сморкание — смарка́ньне
сморкать / сморкаться — смарка́ць / смарка́цца
сморкун — смарка́ч
смородина — *бот.* (*Ribes L.*) смуродзіны, парэчкі
смородина красная — *бот.* (*R. rubrum L.*) парэчкі чырвоныя
смородина чёрная — *бот.* (*R. nigrum L.*) парэчкі чорныя б. т.
смородинный — смуродзінавы, парэчкавы
смородинные растения — *бот.* (*Grossulanaceae*) агрэставыя б. т.
смородинная настойка — парачкоўка
сморчковый — смаржовы
сморчок — (*гриб*) сморж
сморщенный — зморшчаны
сморщивание — зморшчваньне; (*бровей*) насу́пліваньне
сморщивать/сморщить — зморшчваць / зморшчыць; (*брови*) су́піць / насу́піць
смотание, смотка — змата́ньне
смотать — *см.* **сматывать**
смотр — агля́д, агле́дзіны
смотрение — глядзе́ньне пс.-л. т., ба́чаньне; догляд, дагля́д, дагляда́ньне, дагле́дзіны
смотренный — агляда́ны
смотреть — глядзе́ць (*на што*), ба́чыць (*што*); (*пристально в даль*) це́міць, це́міцца, зі́ркаць; (*за кем, чем*) дагляда́ць (*каго, што*), наглядаць, назіра́ць, дазіра́ць (*што*); (*производить смотр*) агляда́ць
смотреть за домом — дагляда́ць ха́ты
смотреть (на кого) как на отца — уважа́ць (*каго*) за ба́цьку
смотреть сквозь пальцы — (*на что*) патура́ць (*каму́ ў чым*), глядзе́ць праз па́льцы
смотреть в оба — пільнава́цца, сьцерагчы́ся, высьцерага́цца
смотреть с изумлением — дзіві́цца (*на што*)
смотреть косо — (*на кого*) крыві́ць вочы, касаву́рыцца
на него нечего смотреть — з ім нямá чаго ліч**ы**́цца
смотря по... — гле́дзячы на..., уважа́ючы на...
не смотря на то, что — ня гле́дзячы на тое, што..., не зважаючы (уважа́ючы) на тое, што...
того и смотри, что он обманет — так і пільну́йся, што ён абшука́е (ашука́е)
смотреться — глядзе́цца, дзіві́цца (*на сябе́*)
смотрины — (*невесты*) су́гляды
смотритель — дазорац, дазорца, назорац (назорца), нагля́днік, дагля́дчык, дагляда́ч
смотрительница — нагля́дніца, дагля́дчыца, дагляда́чка, дазіра́чка
смотрительный — дагля́дны, нагля́дны
смотрительский — нагля́дчы
смочить — *см.* **смачивать**
смочь — змагчы́, здолець
смошенничать — змахлява́ць, збанкрутава́ць, зжу́ліць
смрад — смурод, сморад, тха
смрадно — смуродна, сьмярдзю́ча
смрадность — смуроднасьць, сьмярдзю́часьць
смрадный — смуродны, сьмярдзю́чы, пры́тхлы, тухля́вы
смугловатый — смугля́вы, чарня́вы
смуглолицая — смугля́нка
смуглолицый — смугля́к
смуглость — сму́гласьць
смуглый — сму́глы
смудрить — змудрава́ць, схітрава́ць, змайстрава́ць
смута — непакой, бунтані́на, замяша́ньне, калатне́ча, калатня́, змýста
смутитель — змýсьнік, баламу́т, калатні́к, бунтаўні́к
смутительница — змýсьніца, баламу́тка, бунтаўні́ца
смутить — *см.* **смущать**
смутки — плёткі, намовы
смутно — **1.** непакойна, бунтаўлі́ва; **2.** цьмя́на, цёмна, му́тна, няя́сна, нявыра́зна, неазна́чана
смутность — **1.** непакойнасьць, бунтаўлі́васьць; **2.** цьмя́насьць, му́тнасьць, няя́снасьць, нявыра́знасьць
смутный — **1.** непакойны, бунтаўлі́вы, бунтоўны, трывожны; **2.** цьмя́ны, цёмны, му́тны, няя́сны, нявыра́зны, неазна́чаны
смутное время — ліхале́цьце, ліха́я гадзі́на, безгалоўе
смутьян — *см.* **смутитель**
смутьянка — *см.* **смутительница**
смутьянничать — баламу́ціць, бунтава́ць, змушча́ць, падбухторваць

С

смушки — смýшак
смущать / смутить — **1.** баламýціць / збаламýціць, скаламýціць; бунтава́ць / узбунтава́ць; змушча́ць / змусьці́ць; **2.** турбава́ць / стурбава́ць; трывожыць / устрывожыць; бянтэжыць / зьбянтэжыць; сароміць / засароміць
смущаться / смутиться — мяша́цца / замяша́цца; бянтэжыцца / зьбянтэжыцца; сароміцца / засароміцца
смущение — замяша́ньне, трывога, непакой, калатне́ча, засарамле́ньне
смущённый — **1.** збаламýчаны, скаламýчаны, узбунтава́ны; змушчоны; **2.** замяша́ны, устрывожаны, устурбава́ны; зьбянтэжаны, засаромлены
смывальный — змыва́льны
смывание — змыва́ньне
смывать / смыть — змыва́ць / змыць
смык — смык
смыкание — **1.** злучэньне, змыка́ньне; **2.** зьвяда́ньне, прыплю́скваньне (*вачэй*)
смыкать / сомкнуть — **1.** злуча́ць / злучы́ць; змыка́ць / самкну́ць; **2.** зводзіць / зьве́сьці; прыплю́скваць / прыплю́снуць (*вочы*)
смыкаться / сомкнуться — **1.** злуча́цца / злучы́цца; змыка́цца / самкну́цца; **2.** зводзіцца / зьве́сьціся; прыплю́сквацца / прыплю́снуцца; мжы́цца / самжы́цца
смысл — сэнс, значэньне, змы́сел (*род.* змы́слу), розум, клёк
смысл разделительный — сэнс падзе́льны
смысл собирательный — сэнс зборны пс.-л. т.
в буквальном смысле — літара́льна
в строгом смысле — сьці́сла
здравый смысл — здаровы розум
смыслить — разуме́ць, ця́міць, ке́міць, змы́сьліць
смыть — *см.* **смывать**
смычка — су́вязь, злу́чнасьць, злучэньне, злу́ка; сты́чка
смычок — смычок
смышлёность — ця́мкасьць, ке́мкасьць
смышлёный — ця́мкі, ке́мкі, змы́сны, разу́мны
смягчаемый — зьмякча́льны
смягчать / смягчить — зьмякча́ць / зьмякчы́ць; памякча́ць / памякчы́ць
смягчение — зьмякчэньне
смягчительный — зьмякча́льны
смятение — замяша́ньне, трывога, перапалох (пярэпалах, пярэпалахі, пе́рапалах), мітусе́ньне (мятусе́ньне), гвалт, ва́рхал
смятенный — замяша́ны, патурбава́ны, занепакоены
смять — *см.* **сминать**
снабжатель — даста́ўнік, забесьпяча́льнік
снабжать / снабдить — даста́ўляць / даста́віць (*што*); забесьпяча́ць / забясьпе́чыць (*чым*); заспасабля́ць / заспасо́біць Нс.
снабжение — даста́ва, забесьпячэньне, заспасабе́ньне Нс.
снадобиться — спатрэбіцца
снадобье — зе́льле, прыпра́ва
снаружи — знадворку, звонку, зьве́рху
снаряд — гарма́тны набой, знара́д в. т., начы́ньне, прыла́да
снаряжать / снарядить — узбро́йваць / узброіць; рыхтава́ць / прырыхтава́ць; ла́дзіць / нала́дзіць; спраўля́ць / спра́віць; (*в дорогу*) выпраўля́ць / вы́правіць
снаряжение — узбрае́ньне, прырыхтава́ньне, нала́джваньне, выпраўле́ньне
снасть — снасьць, прыла́да, інстру́мант
сначала — спача́тку, сьпярша́, перш, напе́рад
снашивать / сносить — зношваць / знасі́ць, пазношваць
снег — сьнег
снег первый — пароша
как снег на голову — зьнячэ́ўку, зьняна́цку, неўспадзе́ўкі
снегирь — *зоол.* (*Loxa purrhula*) гіль з. т., сьнягі́р
снедать — гры́зьці
снедь — е́жа, яда́, стра́ва
снежинка — сьняжы́нка
снежистый — сьняжы́сты
снежно — сьне́жна
снежный — сьне́жны, сьнегавы́
снежок — сьняжок
снежки — сьне́жкі
снесение — зьнясе́ньне
снести — *см.* **сносить**
снизойти — *см.* **снисходить**
снизу — зьні́зу, сысподу, здолу
снизывание — зьні́званьне
снизывать / снизать — зьні́зваць / зьніза́ць
снимание — здыма́ньне, зьніма́ньне
снимать / снять — здыма́ць, зьніма́ць / зьняць, пазьніма́ць; скла́дваць / скла́сьці; скіда́ць / скі́нуць
снять кожицу — (*с картофеля*) абабра́ць
снимать кожу — злу́пліваць ску́ру
снимать голову — сьціна́ць галаву́

снимать хлеб — (*с поля*) убіра́ць збожжа
снять пояс — адпераза́ць
снимать квартиру — найма́ць
сниматься / сняться — здыма́цца, зьні́ма́цца / зьня́цца
сняться с места — ру́шыцца, кану́цца
снимка — зды́мка, здыма́ньне, зьні́ма́ньне
снимок — зды́мак, зьні́мак
снискивать / снискать — знаходзіць, знахадзі́ць / знайсьці́; набыва́ць / набы́ць; зажыва́ць / зажы́ць (*сла́вы, чэсьці*)
снискать расположение, милость — увайсьці́ ў ла́ску
снисходительно — ла́скава, лагодна, выба́чна
снисходительность — ла́ска, лагоднасьць, выба́чнасьць, спага́длівасьць
снисходительный — ла́скавы, лагодны, выба́чны, спага́длівы
снисходить / снизойти — рабіць / зрабіць ла́ску; ува́жыць / заўва́жыць (*каму́*); выбача́ць / вы́бачыць; (*сверху вниз*) саступа́ць / саступі́ць
снисхождение — ла́ска, прыхі́льнасьць, выбачэньне; патура́ньне
снить — сьніць
сниться — сьні́цца
снова — зноў, ізноў, нанова
сновалка — асноўні́ца
снование — снава́ньне
сновать — **1.** снава́ць, кла́сьці аснову; **2.** сноўдацца, туля́цца, швэндаць
сновидение — сон, сьне́ньне
сноп — сноп
снопы — *собир.* сноп'е
сноп ржаной, вымолоченный — акалот
нижний конец снопа — гузы́р, гуз
сноп соломы для крыш — куль
снопик, снопок — снапок
снопище — вялі́кі сноп
сноповидный, снопообразный — падобны да снапа́
сноровка — звы́чка, абы́чка, прывыча́ньне
снос — знос, зьнясе́ньне
сносить / снести — знасіць / зьне́сьці, зьнясьці; аднасіць / адне́сьці; вынасіць / вы́несьці; цярпе́ць / сьцярпе́ць (*кры́ўду*); скіда́ць / скі́нуць (*ка́рты*); зрыва́ць / сарва́ць (*пра ве́цер*)
сноситься / снестись — (*с кем*) зносіцца / зьне́сьціся
сноска — зноска, вы́наска
сносливость — выносьлі́васьць, цярплі́васьць
сносливый — выносьлі́вы, цярплі́вы
сносно — зносна, цярпе́ць можна
сносный — зносны
снотворный — снатворны
снотолкование — тлумачэньне сноў
снотолкователь — тлума́ч сноў
сноха — сыновая, нявёстка
сношение — зносіны, стасу́нак
иметь сношения — зносіцца, быць у зносінах
снурок — *см.* **шнурок**
сныть — *бот.* (*Aegopodilim Podagria L.*) сьні́тка б. т.
снятие — зды́ма́ньне
сняток — *зоол.* (*Salmo eperlanus*) сьні́тка
снять — *см.* **снимать**
со — *см.* **с**
соавтор — суа́ўтар
собака — саба́ка *м.*, саба́чка, пес, псюк, ці́ю́ця, ці́ю́цік
собака английская — брыта́н
собака борзая — хорт
собака гончая — ганча́к
собака лягавая — вы́жал
собака дворовая — дварня́к
собака косматая — ку́ндзель
собака летучая — *зоол.* (*Pteropus*) крыла́н з. т.
собаколов — гі́цаль
собачий — саба́чы, саба́цкі, пе́сьсі
собачья голова — *бот. см.* **норичник**
собачина — саба́чына, псі́на
собачиться — саба́чыцца, гры́зьціся, сварыцца, ла́яцца
собачка — саба́чка *м*, пе́сік, ці́ю́цька; (*у ружья*) цы́нгель
собачник — саба́чнік, пся́рнік
собачонка — ці́ю́цька, пе́сік, псюк
собеседник — размоўнік, бясе́днік
собеседница — размоўніца
собеседование — размова, гу́тарка, бясе́да
собеседовательный — размоўны, бясе́дны
собеседовать — размаўля́ць, гу́тарыць, гаманіць, бясе́даваць
собирание — зьбіра́ньне, збор, згуртава́ньне
собиратель — зьбіра́льнік, зьбіра́ч
собирательница — зьбіра́льніца, зьбіра́чка
собирательный — зборны, зьбіра́льны
собирать / собрать — зьбіра́ць / сабра́ць, назьбіра́ць; гуртава́ць / згуртава́ць; склада́ць / скла́сьці
собирать милостыню — жабрава́ць

С

собирать подаяния на святках — калядава́ць, валачобнічаць
собирать грибы, лён — браць (грыбы́, лён)
собираться / собраться — зьбіра́цца / сабра́цца, пазьбіра́цца; схадзі́цца / сыйсьці́ся
собираться — (*к чему*) рыхтава́цца
собраться с мыслями — надду́мацца
собраться с силами — намагчы́ся
соблаговоление — ла́ска
соблаговолить — зрабі́ць ла́ску, ра́чыць
соблазн — спаку́са, спакушэньне, зва́дка, зму́ста, звод
соблазнение — спакушэньне
соблазнённый — спаку́шаны, зьве́дзены, зва́блены, змушчоны
соблазнитель — спаку́сьнік, зводнік
соблазнительница — спаку́сьніца, зводніца, увядзёнка
соблазнительно — спаку́сна, зва́бна, прыва́бна
соблазнительность — спаку́снасьць, зва́бнасьць, прыва́бнасьць
соблазнительный — спаку́сны, спаку́сьлівы, зва́бны, прыва́бны
соблазнять / соблазнить — спакуша́ць / спакусі́ць; зводзіць / зьве́сьці; ва́біць / зва́біць; змушча́ць / змусьці́ць
соблюдать / соблюсти — захоўваць / захава́ць; пільнава́цца / дапільнава́цца (*чаго*); сьцерагчы́; глядзе́ць / даглядзе́ць; выконваць / вы́канаць (*закон, нака́з*)
соблюдать достоинство, приличие — шанава́цца
соблюдённый — захаваны, захава́ны, дапільнава́ны, вы́кананы
соблюдение — захава́ньне, выкананьне, дапільнава́ньне, сьцеражэньне
собой — *см.* **себя**
соболезнование — спачува́ньне, жаль
соболезновательный, соболезнующий — спачува́льны
соболезновать — спачува́ць (*каму́*), выка́заць жаль; шкадава́ць (*аб чым*)
соболий, соболиный — сабалёвы
соболь — *зоол.* (*Mustela zibellina*) саболь з. т., собаль
собор — **1.** збор; **2.** (*православный*) сабор; (*католический*) катэдра
земский собор — зе́мскі збор (сойм)
соборный — зборны, саборны, катэдра́льны
соборовать — рабі́ць апошняе пама́заньне
собою — *см.* **себя**
собрание — збор, сход; сабра́ньне, грамада́, на́таўп
общее собрание — агу́льны сход
общественное собрание — грама́дзкая зборня
учредительное собрание — (*государственное*) устаноўчы сойм; (*общественное*) устаноўчы сход
место, где происходит собрание — зборня
собрат — ся́бар (ся́бра), пабраці́м
собратство — сяброўства, пабраці́мства
собрать — *см.* **собирать**
собственник — ула́сьнік, гаспада́р
собственница — ула́сьніца
собственно — ула́сна
собственноручно — ула́снаю рукою
собственноручный — уласнару́чны
собственность — ула́снасьць, ула́снае дабро
общая собственность — супольная ўла́снасьць
собственный — ула́сны
собственное имя — *грам.* ула́снае імя́
собственными силами — самату́гам
по собственному желанию — самахоць, самохаць, па сваёй волі
собутыльник — кампа́ньнік, тава́рыш па бутэльцы
событие — падзе́я, праява, здарэньне
произошло событие — адбыла́ся (ста́лася, зда́рылася) падзе́я
сова — *зоол.* (*Strix*) сава́
сова белая — *зоол.* (*Nyctea*) беласоўка з. т.
сова ушастая — (*Asio*) вушанка з. т.
сование — сава́ньне (сува́ньне), піха́ньне
совать / сунуть — сава́ць (сува́ць) / су́нуць; піха́ць / піхну́ць, пхну́ць; утыка́ць / уткну́ць; утыркаць / утыркну́ць
совать нос — утыка́ць нос
соваться — (*туда и сюда*) совацца, сава́цца, шту́рха́цца
совершать / совершить — рабі́ць / зрабі́ць; чыні́ць / учыні́ць; даконваць / дакана́ць; выконваць / вы́каваць; канча́ць / скончыць; адпраўля́ць / адпра́віць (*набажэнства*)
совершение — учыне́ньне, выкана́ньне, заканчэньне, спаўне́ньне, спра́ўджаньне, адпра́ва
совершенно — зусі́м, цалком, суздром; дарэшты, дашчэнту, ушчэнт

совершенно ничего — анізва́ньня, а́ні ка́ліва; а́ні парашы́нкі
совершеннолетие — поўныя гады́, поўнале́цьце, дарослась
совершеннолетний — поўных гадоў, поўнале́тні, дарослы
совершенный — **1.** даскана́лы, дасканальны; **2.** цэлы, поўны
совершенный вид глагола — закончанае трыва́ньне дзеяслову
совершенный дурак — дурны́ як пень
совершённый — даканаы, вы́кананы, зроблены, закончаны, споўнены
совершенство — дасканаласць, дасканальнасць, дасканальства
в совершенстве — дасканала
совершенствовать — удасканальваць, даводзіць да дасканаласьці
совершенствоваться — удасканальвацца, даходзіць да дасканаласьці
совершитель — выканавец, выканаўца
совершить — *см.* **совершать**
совершиться — адбы́цца, зрабі́цца, споўніцца, здарыцца, стацца
совестить — сарамі́ць, узрушаць сумле́ньне, стыдзі́ць, совесьціць
совеститься — сарамі́цца, стыдзі́цца
совестно — сорамна, совесна
совестный — сумле́нны, чэсны, цнотны, совесны
совесть — сумле́ньне, совесьць
по совести — сумле́нна, совесна
по чистой совести — ад душы́
совет — **1.** ра́да, пара́да, дара́да; **2.** (*совещание*) нара́да
Совет Народных Комиссаров — Саве́т Народных Камісараў
педагогический совет — школьная ра́да
учёный совет — навуковая ра́да
обращаться за советом — (*к кому*) прасіць сабе́ ра́ды, ра́дзіцца (*з кім*)
отказать в совете — ня даць ра́ды
совет держать — ра́ду ра́дзіць
спрашивать совета — шука́ць сабе́ ра́ды
жить в совете — (*о супругах*) жыць у згодзе (згодна)
тайный совет — патае́мная ра́да, змова
советник — ра́днік, пара́днік, ра́дца, ра́йца
советница — ра́дніца, пара́дніца
советование — ра́еньне, ра́джаньне
советовать — ра́дзіць (*сов.* пара́дзіць), ра́іць (*сов.* пара́іць)
советоваться — ра́дзіцца, ра́іцца (*з кім*)
советский — ра́давы, саве́цкі
советчик — *см.* **советник**
совещание — нара́да, пара́да
совещательный — (*голос*) дара́дчы
совещаться — ра́дзіцца, ра́іцца; рабіць нара́ду
совка: совка капустная — *зоол.* (*Mamestra brassicae L.*) капустажэрка з. т.
совка озимая — (*Agrotis segetum Hulk.*) ночнік азімы з.т.
совка сосновая — (*Panolis piniperda Panz.*) хвояжэ́рка шкодная з. т.
совки — (*Noctuidae*) ночнікі з. т.
совладать, совладеть — (*с кем, с чем*) здолець, перамагчы́, змагчы́, падужаць (*каго*)
совладелец — супольнаўла́сьнік
совладелица — супольнаўла́сьніца
совладение — супольнае ўлада́ньне, суполка
совлекать / совлечь — звалака́ць / звалачы́; сьця́гваць / сьцягну́ць; скі́даць, скіда́ць / скі́нуць
совлечение — звалака́ньне, сьця́гваньне, скіда́ньне
совместимость — сумяшча́льнасьць
совместимый, совместительный — сумяшча́льны
совместитель — сумяшча́льнік, суме́сьнік
совместительство — сумяшча́льнасьць, суме́сьніцтва
совместить — *см.* **совмещать**
совместничать — суме́сьнічаць
совместно — суме́сна, супольна, абапольна, паспал, уку́пе
совместность — суме́снасьць, супольнасьць, абапольнасьць
совместный — суме́сны, супольны, гуртавы́, абапольны
совмещать / совместить — сумяшча́ць / сумясьці́ць; пагаджа́ць / пагадзі́ць
совмещение — сумяшчэньне
совок — шу́флік; (*для веяния*) ве́ялка
совокупление — злучэньне, спалучэньне; спа́рваньне; (*о собаках*) скле́шчваньне
совокупляться / совокупиться — злуча́цца / злучы́цца; спалуча́цца / спалучы́цца; спа́рвацца / спа́рыцца; (*о собаках*) скле́шчвацца / скле́шчыцца
совокупно — злу́чна, уку́пе, супольна, суме́сна, ра́зам
совокупность — злу́чнасьць, супольнасьць

С

совокупность чисел — *мат.* збор лі́каў м. т.
совокупный — злу́чны, супольны, сумéсны
совпадать / совпасть — супада́ць / супа́сьці; прыпада́ць / прыпа́сьці; прыходзіцца / прыйсьці́ся (*да чаго*); зьбяга́цца / зьбе́гчыся
совпадение — супада́ньне, прыпада́ньне, зьбег
совратитель — зводнік, спаку́сьнік, пагарша́льнік, баламу́тнік
совратительница — зводніца, спаку́сьніца, пагарша́льніца, баламу́тка
совратительный — зводны, пагарша́льны, баламу́тны
соврать — збраха́ць, схлусі́ць, зманíць
совращать / совратить — зводзіць / зьвéсьці; спакуша́ць / спакусíць; псава́ць / сапсава́ць; пагарша́ць / пагоршыць; абарача́ць / абярну́ць (*на што*); уця́гваць / уцягну́ць (*у (ува) што*)
совращающий — *см.* **совратитель**
совращение — звод, спаку́са, пагаршэньне, псота
современник — сучáсьнік
современница — сучáсьніца
современность — сучáснасьць
современный — сучáсны
совсем — зусíм, сусíм, саўсíм, суздром, цалком
согбенность — пахíласьць, сагну́тасьць
согбенный — пахíлы, сагну́ты, прыгну́ты
согласие — згода, згоднасьць, лад, лагода
жить в согласии — жыць у згодзе
дать своё согласие — (*на что*) згадзíцца (*на што*)
согласительный — пагаджа́льны
согласить — *см.* **соглашать**
согласно — *предлог* паводле, паводлуг, водле, водлуг (*чаго*); згодна (*з чым*)
согласно — згодна, у згодзе (*жыць*), у ла́дзе
согласность — згоднасьць
согласный — згодны
согласный звук — *грам.* зы́чны (сугалосны) гук, зык
согласование — узгадне́ньне, пагаджэньне
согласованность — узгодненасьць, пагоджанасьць, дапасованасьць
согласованный — узгоднены, пагоджаны, дапасованы
согласовывать — узгадня́ць, пагаджа́ць, згоджваць, дапасо́ўваць
согласовываться — быць згодным (*з чым*), згоджвацца, адпавядáць (*чаму́*), дапасо́вацца (*да чаго*)
соглашатель — згоднік
соглашательница — згодніца
соглашательский — згодніцкі
соглашательство — згодніцтва
соглашать / согласить — згаджа́ць / згадзíць; пагаджа́ць / пагадзíць; ядна́ць / паядна́ць; рабíць / зрабíць згоду (*памíж кім*)
соглашаться / согласиться — гадзíцца, згаджа́цца / згадзíцца; пагаджа́цца / пагадзíцца; паразумява́цца / паразуме́цца; рабíць / зрабíць згоду (*з кім*)
соглашение — згода, угода
соглядатай — выве́днік, сок, шны́пар
соглядатайка — выве́дніца, шны́парка
соглядать — выве́дваць, высочваць, шны́парыць
согнать — *см.* **сгонять**
согнутый — сагну́ты, пахíлы
согнуть — *см.* **сгибать**
согражданин — суграмадзя́нін
сограничный — сумéжны
согревательный — сагрева́льны
согревать / согреть — сагрева́ць / сагрэць; агрева́ць / агрэць; ацэ́пліваць / ацяпліць
согрешать / согрешить — грашы́ць, саграша́ць / саграшы́ць
согрешение — грэх
сода — сода
содействие — дапамога, помач
содействовать, оказать содействие — дапамагчы́, зрабíць дапамогу
соделывать / соделать, содеять — рабíць / зрабíць; выконваць / вы́канаць
содержание — (*книги*) зьмест; *юрид.* утрыма́ньне, кошт
на своём содержании — сваíм коштам
быть на содержании — быць на чыíм кошце
содержанка — **1.** утрыма́нка; **2.** палюбоўніца, бонка, бахýрка
содержатель — утрыма́льнік, гаспада́р (*чаго-нéбудзь*)
содержатель корчмы — рандáр
содержатель книжного магазина — кнігáр
содержательница — утрыма́льніца
содержательница корчмы — рандáрка
содержательно — зьмястоўна, са зьмéстам, каштоўна
содержательность — зьмястоўнасьць
содержательный — зьмястоўны, багáты зьмéстам, каштоўны

содержать — **1.** трыма́ць, утры́мліваць, утрымо́ўваць; **2.** рандава́ць, мець на пасэсіі, дзяржа́ць; **3.** ме́сьціць, зьмяшча́ць

содержаться — зьмяшча́цца (*у чым*)

содержащий — які́ зьмяшча́е

содержимое — зьмест, зьме́сьціва В. Ласт.

содовый — содавы

содом — га́лас, гарме́дар, гва́лт, ва́рхал

Содом — Садом

содомить — галасава́ць, гарме́дарава́ць

содрать — *см.* **сдирать**

содрогание — здрыг, здрыга́ньне

содрогаться / содрогнуться — здрыга́цца / здрыгану́цца; страса́цца, страсану́цца (страсяну́цца)

соединение — зьядна́ньне, злучэ́ньне, спалучэ́ньне, спалу́ка, су́вязь

соединённо — зьядна́на, злу́чана

соединённый — зьядна́ны, паядна́ны, злу́чаны, спалу́чаны

Соединённые Американские Штаты — Злу́чаныя Амэрыка́нскія Шта́ты

соединитель — злуча́льнік, злу́чнік

соединительный — злуча́льны

соединять / соединить — ядна́ць / зьядна́ць, паядна́ць, аб'ядна́ць; луча́ць, злуча́ць / злучы́ць, спалучы́ць; гуртава́ць / згуртава́ць

соединять сводом — скле́пліваць

соединять тисками — скле́шчваць

соединять для драки — (*собак*) зводзіць, скла́чваць

соединяющий — злуча́льны

сожаление — жаль, жалкава́ньне; шкадава́ньне (*аб чым*)

к великому сожалению — на вялі́кі жаль

к величайшему сожалению — на найвялі́кшы жаль

сожалеть — мець жаль (*да каго*), жалкава́ць, шкадава́ць

сожжение — спале́ньне

сожжённый — спа́лены, папа́лены, спопелены

сожигать / сожечь — пале́ць / спале́ць, папале́ць, спопеле́ць (спапяле́ць)

сожитель — **1.** сужыве́ц, сумяшка́нец, сукватэрнік, хаўру́сьнік, ка́шнік; **2.** палюбоўнік

сожительница — **1.** сумяшка́нка, сукватэрніца, хаўру́сьніца, ка́шніца; **2.** палюбоўніца

сожительство — сужы́цьце, сумяшка́ньне

сожительствовать — **1.** жыць (мяшка́ць) суме́сна (супольна, ра́зам, у хаўру́се) (*з кім*); **2.** мець родавыя (цяле́сныя) зносіны

сожитие — сужы́цьце, супольнае (суме́снае) жыцьцё, сужыве́цтва

сожрать — сажра́ць, зжэрці, пажэрці

созвание — скліка́ньне, склік, згука́ньне

созвать — *см.* **созывать**

созвездие — узор'е г.-к. т.

созвучие — суго́ўчнасьць л. т., суго́ўчча

созвучный — суго́ўчны

создавать / создать — тварыць, ствара́ць / стварыць; утвара́ць / утварыць; вытвара́ць / вытварыць; будава́ць / збудава́ць

создание — твор, стварэньне, збудава́ньне

создатель — тварэц, творца, тварыцель, будаўні́к

создательница — стварыцелька, будаўні́ца

созерцание — спаглядзі́ньне, спазіра́ньне, узіра́ньне, ба́чаньне; разду́мваньне

созерцатель — спаглядза́льнік, спаглядза́ч, спазіра́льнік

созерцательница — спаглядза́льніца, спазіра́льніца

созерцательный — спаглядза́льны, спазіра́льны, узіра́льны

созерцать — спаглядза́ць, спазіра́ць, узіра́ць, ба́чыць, раздумля́ць

созидание — будава́ньне, збудава́ньне

созидатель — будаўні́чы, будаўні́к, тварэц

созидательный — будоўны, творчы

созидать / создать — будава́ць / збудава́ць, пабудава́ць; тварыць / стварыць; ста́віць / вы́ставіць (*будынак*)

сознавать / сознать — прызнава́ць / прызна́ць; сузнава́ць / сузна́ць; усьведамля́ць / усьвядо́міць

сознаваться / сознаться — (*в своей вине*) прызнава́цца / прызна́цца; сузнава́цца / сузна́цца; вініцца / павініцца

сознание — **1.** (*как психический процесс*) сьвядомасьць; **2.** (*как состояние*) прытомнасьць; **3.** (*вины*) прызна́ньне, сузна́ньне

быть в сознании — быць прытомным

лишиться сознания — зьняпрытомнець

прийти в сознание — апрытомнець, ачуня́ць

сознательно — сьвядома

сознательность — сьвядомасьць

сознательный — сьвядомы, прытомны

сознать — *см.* **сознавать**

созревание — дасьпява́ньне

созревать / созреть — дасьпява́ць / дасьпе́ць; высьпе́льваць / вы́сьпеліць

С

созревший, созрелый — дасыпе́лы
созыв — склік, склікáньне, згукáньне
созыватель — склікáльнік, склікáч
созывательный — склікáльны
созывать / созвать — склікáць / склíкаць, пасклікáць; згукáць; ззывáць / сазвáць
соизволение — воля, прызвале́ньне, згода
соизволять / соизволить — прызваля́ць / прызволíць; давáць / даць згоду; згаджáцца / згадзíцца
соизгнанник — тавáрыш па выгнáньні
соизмеримость — супольнаме́рнасць м. т.
соизмеримый — супольнаме́рны
соименник — цёзка, аднайме́ньнік
соименница — цёзка, аднайме́ньніца
соименный — аднайме́нны
соискание — запабяráньне, запабе́гі
соискатель — запабяráльнік
соискательница — запабяráльніца
соискательный — запабяráльны
соискать — запабяráць / запабе́гчы; дамагáцца / дамагчы́ся
соитие — *см.* **совокупление**
сойка — *зоол.* (*Garrulus*) сóйка, кароза
сойти — *см.* **сходить**
сок — сок (*род.* соку)
сок берёзовый — бярозавік
сок кленовый — кляновік
соковой — сакавы́
сокол — *зоол.* (*Falco gentilis*) сакóл, сокáл
соколёнок — сакаля́ *ср.*, сакаляня́тка *ср.*
соколий, соколиный — сакáловы, сакалíны
соколий перелёт — *бот.* (*Gentiana cruciata L.*) гары́чка крыжавáя б. т.
соколик — саколік
сокольник — сакольнік; *бот.* (*Hieracium Pilosella L.*) ястрабóк калмáты б. т.
сокольница — *бот. см.* **соколий перелёт**
Сократ — Сакрáт
сократившийся — скарацéлы
сократитель — скарачáльнік
сократительный — скарачáльны
сократический — (*метод*) сакраты́чны
сокращать / сократить — скарачáць / скарацíць, пакарацíць; зьмяншáць / зьмéншыць
сокращение — скарачэньне, пакарачэньне
сокращённо — каротка, скарочана
сокращённый — скарочаны, зьмéншаны
сокровенно — сукры́та, патаéмна, захавáна, сакрэтна
сокровенность — сукры́тасьць, патаéмнасьць, захавáнасьць, сакрэтнасьць
сокровенный — сукры́ты, патаéмны, захавáны, сакрэтны
сокровище — скарб
сокровищница — скáрбніца
сокрутина — (*в нитках*) зáкрутка
сокрушать / сокрушить — **1.** крышы́ць / скрышы́ць; разьбівáць / разьбíць; руйнавáць / зруйнавáць; тру́шчыць / патру́шчыць; ламáць / зламáць; бурыць / разбурыць; **2.** засмучáць / засмуцíць
сокрушаться — (*душою*) скрушáцца, смуцíцца, журы́цца, тужы́ць
сокрушение — крушэньне, разьбівáньне, зруйнавáньне, растру́шчваньне (раздру́шчваньне), разбу́рваньне; (*душевное*) скрушэньне, скру́ха, тугá, журбá, засмучэньне
сокрушённый — скры́шаны, разьбíты, зруйнавáны, разбу́раны; (*душою*) скру́шаны, засмучоны
сокрушительный — скрышáльны, зьнішчáльны, зруйнавáльны
сокрытие — сукры́цьце, скры́ткі, сховы
сокрыть — *см.* **скрывать**
солгать — схлусíць, саўгáць, збрахáць
солдат — салдáт в. т., жаўнéр; (*русской службы*) маскáль *нар.*; (*Красной Армии*) чырвонаармéец
солдатик — салдáцік, жаўнéрык, маскáлік
солдатина — салдацю́га, маскалю́га
солдатка — салдáтка, жаўнéрка, маскáлька, маскоўка
солдатский — салдáцкі, жаўнéрскі, маскáльскі
солдатство — салдáцтва, жаўнéрства
солдатчина — салдáтчына
солевар — салярр, салявáр
солеварение — салярства, салявáрства
солеваренный — салярны, салявáрны
соление — салéньне
солёность — салонасьць
солёный — салоны
солёное сало — саланíна
солецизм — *лит.* салецы́зм, простаслóўе
солея — *церк.* салея́
солидарно — згодна, у згодзе (*з кім*)
солидарность — згоднасьць, паразумéласьць
солидарный — згодны, паразумéлы
быть солидарным — згаджáцца
солидно — павáжна, станоўча
вести себя солидно — павáжна трымáцца

С

солидность — пава́жнасьць
солидный — пава́жны, грунтоўны, умерка-ва́ны
солильщик — салі́льнік
солист — салі́сты
солитер — *зоол.* (*Taenia*) салітэр, тасе́мнік
солить — салі́ць; *перен.* назаля́ць, дадзява́ць
солка — *см.* **соление**
солнечник — *зоол.* (*Heliozoa*) сонцавік з. т.
солнечный — сонечны
на солнечной стороне — на прыпёку
солнце — сонца, слонца
по солнцу — за сонцам
против солнца — су́праць сонца
солнце закатывается — сонца заходзіць
солнце на закате — сонца на за́хадзе
солнцевый — сонцавы
солнцегляд — *бот.* (*Euphorbia helioscopia L.*) малача́й ме́сячны б. т.
солнцепёк — прыпёк
солнцестояние — *астр.* сонцавара́т г.-к. т.
солнышко — сонейка, сонечка
соловей — *зоол.* (*Luscinia philomela*) салаве́й, салаве́йка
птенец соловья — салаве́йчык
соловеть — салаве́ць
соловка, соловушка — салаве́йчык, салаве́йка
солод — солад, бра́га; (*кушанье*) салады́ха
солоделый — саладзе́лы
солодеть — саладзе́ць
солодить — саладзі́ць
солодковатый — саладкава́ты, саладка́вы
солодовня — саладоўня
солодовый — саладовы
солодуха — саладу́ха
солома — салома; (*мелкая*) атора; (*в снопах вымолоченная*) акалот; (*перетёртая*) труха́; (*порезанная на корм*) се́чка
солома овсяная — аўся́нка
солома просяная — прася́нка
солома гречневая — грача́нка
солома гороховая — гарохавіны, гарошыны
соломенник — саломенік
соломенный — саломены
соломина, соломинка — саломіна, саломінка
соломка — саломка
Соломон — *и. соб.* Саламон
Соломонида — *и. соб.* Салоха
соломорез — сячка́р
соломорезка — сячка́рня, сячка́рка
солонина — салонае мя́са
солонка — саля́нка
солоно — салона
солоночка — саля́начка
солончак — саланча́к
солончаковый — саланчаковы
соль — **1.** *муз.* соль; **2.** соль
соль выварочная — соль выва́рная
соль каменная — соль каме́нная
соль поваренная — соль кухе́нная
соль самосадочная — самаса́дка г.-к. т.
солянка — (*кушанье*) саля́нка
соляной — саляны́; солны
сом — *зоол.* (*Silurus glanis*) сом
сомкнуть — *см.* **смыкать**
сомлевший — самле́лы
сомлеть — самле́ць
сомневаться — сумнява́цца, сумні́цца, вага́цца, быць няпэўным, ня мець пэўнасьці
сомнение — сумне́ньне пс.-л. т., сум, няпэўнасьць, вага́ньне
без сомнения — напэўна
возбуждать сомнение — выклі́каць сумне́ньне
сомнительно — няпэўна, сумне́нна
сомнительность — няпэўнасьць, сумне́ннасьць
сомнительный — няпэўны, сумне́нны
сомовина — самовіна
сомовый — самовы
сон — сон, сьне́ньне
непробудный сон — ве́чны сон
сна нет — сон не бярэ
со сна — спрасонку
видеть / увидеть сон — сьніць / прысьні́ць сон
сон сбылся — сон спра́ўдзіўся
сонаследник — сунасьле́днік, судзе́дзіч
сонаследница — сунасьле́дніца, судзе́дзічка
сонаследовать — ра́зам (*з кім*) перайма́ць (атрыма́ць) спа́дчыну
соната — *муз.* сана́та
сонет — *лит.* санэт
сонливец — санлі́вец, санлі́вы, сонька
сонливо — санлі́ва
сонливый — санлі́вы
сонм, сонмище — сход, збор, грамада́, на́таўп
сонник — *см.* **снотолкователь**
сонно — сонна, аспа́ла

С

сонный — сонны, аспа́лы
сон-трава — *бот.* (*Pulsatilla patens Mill.*) сон звыча́йны б. т.
соня — соня, сонька
сообвиняемый — суабвінава́ны
сообитание — сужы́цьце, сумяшка́ньне
сообитать — жыць (мяшка́ць) супольна (*з кім*)
соображать / сообразить — меркава́ць / разьмеркава́ць, памеркава́ць / вы́меркаваць; даходзіць / дайсьці (*розумам*); ця́міць / сьця́міць; ке́міць / ске́міць; куме́каць / раскуме́каць; уга́дваць / угада́ць; кме́ціць / скме́ціць; дамы́сьлівацца / дамы́сьліцца; разважа́ць / разва́жыць, расшалопаць
соображаться — (*с чем*) уважа́ць (*на што*), лічы́цца (*з чым*), стасава́цца, прыстасо́ўвацца (*да чаго*)
соображение — **1.** меркава́ньне, клёк, разва́га; **2.** погляд
принять в соображение — узя́ць на ўва́гу, палічы́ць
без соображения — неразва́жна
по моему соображению — на мой погляд (пагля́д), на маю́ ду́мку, як я ду́маю (мярку́ю)
сообразительность — ця́мкасьць, ця́млівасьць, ке́мкасьць, кме́тлівасьць, уга́длівасьць, дасьці́пнасьць
сообразительный — ця́мкі, ця́млівы, ке́мкі, кме́тлівы, уга́длівы, дасьці́пны, разва́жны
сообразно — (*с чем*) адпаве́дна (*чаму́*), згодна (*з чым*), паводле, водлуг, паводлуг (*чаго*), памяркоўна (*чаму́*), стасоўна (*да чаго*)
сообразность — адпаве́днасьць, згоднасьць
сообразный — адпаве́дны (*чаму́*), згодны (*з чым*), памяркоўны, стасоўны
сообща — супольна, ра́зам, уку́пе, гу́ртам
сообщать / сообщить — **1.** (*что чему*) надава́ць / нада́ць; надзяля́ць / надзя́ліць; **2.** (*что кому*) паведамля́ць / пава́даміць (*каго аб чым*); перадава́ць / перада́ць; пераказваць / пераказа́ць (*на словах*); адпісваць / адпіса́ць (*на пісьме́*)
сообщаться — (*с кем*) зносіцца, мець зносіны, таварышава́ць; спалуча́цца, ядна́цца
сообщение — **1.** (*чего*) паведамле́ньне, абвяшчэньне, абве́стка; **2.** (*с кем*) зносіны
пути сообщения — шля́хі зносін
сообщество — згуртава́ньне б. т., таварыства, кампа́нія, суполка, сябрыня́ (сябры́на)
сообщительность — таварыскасьць, лю́дзкасьць, удзе́льнасьць
сообщительный — таварыскі, лю́дзкі, удзе́льны
сообщник — супольнік, тава́рыш, хаўру́сьнік, удзе́льнік
сообщница — супольніца, тава́ры́шка, хаўру́сьніца, удзе́льніца
сообщничество — супольніцтва, удзе́льніцтва
сооружать / соорудить — будава́ць / збудава́ць, пабудава́ць; выстаўля́ць / вы́ставіць (*будынак*)
сооружение — будыніна; будава́ньне
соответственно — адпаве́дна, згодна
соответственность, соответствие — адпаве́днасьць
соответственный — адпаве́дны, згодны
соответствовать — адпавя́даць, быць адпаве́дным (*чаму́*)
соотечественник — адназе́мец гр. т., зямля́к, суродзіч
соотечественница — зямля́чка, суродзічка
соотечественный — зямля́цкі, родны, адназе́мны
соотносительность — суадноснасьць
соотносительный — суадносны
соотношение — суадносіны, зале́жнасьць м. т., стасу́нак
соотчич — зямля́к, суродзіч
сопелка, сопель — ду́дка, сьвісьцёлка
сопение — сапе́ньне, сопат, сопаньне, сапа́ньне
соперник — су́пар, супраці́ўнік
соперница — су́парка, супраці́ўніца
соперничать — (*с кем*) сьпіра́цца (*з кім*), змага́цца (*з кім*)
соперничество — су́парства
сопеть — сапці́, сопаць, сапа́ць
сопка — *геогр.* сопка
соплеменник — аднапляме́ньнік
соплеменница — аднапляме́ньніца
соплеменный — аднапляме́нны
соплетать — *см.* **сплетать**
сопли — смаркачы́, смаркаві́ньне, соплі (*ед. ч.* сопель)
сопливец — смарка́ч, смарка́ты, сапліве́ц
сопливица — смарка́чка, сапліві́ца
сопливость — смарка́тасьць, сапліва́сьць
сопливый — смарка́ты, сапліві
сопля — *см.* **сопли**
сопляк — смарка́ч, сапля́к
соподчинённый — супадле́глы, падзале́жны
соподчиняться — супадляга́ць
сопоручитель — судару́чнік

сопоставление — параўнава́ньне, супаста́ва
сопоставлять / сопоставить — параўноўваць / параўнава́ць; супастаўля́ць / супаста́віць
соправитель — суўлада́р, сукіраўні́к
соправление — суўлада́ньне, супольнае кірава́ньне
сопрано — *муз.* сапра́на
сопревать / сопреть — прэць, саправа́ць / сапрэць
сопредельно — суме́жна, прыле́гла
сопредельность — суме́жнасьць, прыле́гласьць, спарубе́жнасьць
сопредельный — суме́жны, прыле́глы, спарубе́жны
соприкасание — датыка́ньне, стыка́ньне
соприкасаться / соприкоснуться — (*с чем*) датыка́цца / даткну́цца; датыркацца / датыркну́цца; стыка́цца / саткну́цца; прыляга́ць (*да чаго*), межава́цца (*з чым*)
соприкосновенность — датычнасьць, удзе́л
соприкосновенный — датычны, датыка́льны, стычны; удзе́льны
соприсутствие — супрысу́тнасьць
сопричастие / сопричастность — удзе́льнасьць
сопричастник — удзе́льнік, суўдзе́льнік
сопричастница — удзе́льніца; суўдзе́льніца
сопричастный — удзе́льны
сопричислять — *см.* **причислять**
сопровождать / сопроводить — праваджа́ць, праводзіць; ісьці́ / прайсьці́ сьле́дам (*з кім*); таварышава́ць (*каму́*)
сопровождающий — праважа́ты
сопровождение — праваджэньне, ваджэньне (*з кім*), таварышава́ньне
он явился в сопровождении своего слуги — ён зьявіўся ра́зам з сваім слугою
сопротивительный — супраці́ўны, адпорны
сопротивление — супраціўле́ньне, адпор, спраціве́нства
сопротивляемость — адпорнасьць
сопротивляться / сопротивиться — супраціўля́цца / супраці́віцца; дава́ць / даць адпор; упіна́цца, сьпіра́цца, спрача́цца; стаць су́праць (*каго*); змага́цца (*з кім*)
сопротивник — супраці́ўнік
сопротивница — супраці́ўніца
сопротивно — су́праць, насу́перакі
сопротивный — супраці́ўны
сопрягать / сопрячь — спрага́ць / спрэгчы; луча́ць, злуча́ць / злучы́ць; зьвя́зваць / зьвяза́ць
сопряжение — супражэньне, злу́ка, су́вязь, зьвя́зак
сопун — сапу́н
сопутник — *см.* **спутник**
сопутствовать — ісьці́ ра́зам, таварышава́ць (*каму́*) у дарозе
сопутствующий — насту́пны; спадарожны
сопящий — сапа́ты
сор — сьме́цьце, сьмяцьцё, трус, сур Нс.
сорадоваться — супацяшА́цца, спацяшА́цца
соразмерно — суразьме́рна, спаме́рна, прыроўнена, паме́рна, у ме́ру
соразмерно силам — пасі́льна
соразмерно заслугам — па заслу́зе
соразмерность — суразьме́рнасьць, спаме́рнасьць, прыроўненасьць, паме́рнасьць
соразмерный — суразьме́рны, паме́рны, прыроўнены
соразмерять / соразмерить — суразьмяра́ць / суразьме́рыць; спамяра́ць / спаме́раць; узгадня́ць / узгадні́ць; прыроўніваць / прыраўня́ць
соратник — тава́рыш на вайне́, камра́т
сорванец — вы́рвас, басала́й, ві́сус, шы́бенік (шы́беньнік, шы́бельнік), галі́на, прайдзісьве́т, гі́цаль
сорвание: сорвание печати — *юрид.* зрыў (сарва́ньне) пячА́ткі
сорванный — сарва́ны; адарва́ны
сорвать — *см.* **срывать**
сорвиголова — *см.* **сорванец**
соревнование — спаборні́цтва, выпярэдні́цтва л. т., вы́перадкі, убе́гі, су́парства; (*в бегах*) вы́сьцігі
соревнователь — спаборнік, выпярэднік
член-соревнователь — член-дапамага́льнік
соревновательница — спаборніца, выпярэдніца
соревновать — (*кому с кем*) ісьці́ навы́перадкі; (*чему*) дапамага́ць, спамага́ць
сорение — сьме́чаньне, цярушэньне, сурэньне Нс.
соринка — сьмяці́нка, парашы́нка, цярушы́нка, суры́нка
сорит — *лог.* сары́т (*скарочаны сылягі́зм*)
сорить — сьме́цьціць, насьме́чваць, накі́дваць сьмяцьця́; цярушы́ць, сурЫць Нс.
сорить деньгами — сы́паць грашы́ма, манта́чыць грошы
сорный — засьме́чаны, нячы́сты, бру́дны, су́рны Нс.
сорная яма — сьме́тнік, сьме́тнішча
сорная трава — зе́льле, пустазе́льле б. т.

С

сорок — сорак
сорока — сарока
сорокадневный — саракадзённы
сорокалетие — саракагодзьдзе, саракалéцьце
сорокалетний — саракагадовы, саракалéтні
сорокарублёвый — саракарублёвы
сороковка — саракоўка
сороковой — саракавы́
сороконожка — *зоол.* (*Lithobius forficatus*) станóжка з. т.
сорокопут — *зоол.* (*Lanius*) грычýн з. т., саракýш
сорокоуст — саракавýсты
сорочий — сарочы, сарочын
сорочины — саракавíны
сорочка — кашýля, кашýлька, сарочка, *детск.* лёля
родиться в сорочке — радзíцца шчасьлíвым
сорт — сорт, гатýнак
сортирование — сартава́ньне
сортировать — сартава́ць, разьбіра́ць па сартох (гатýнках)
сортировка — **1.** *см.* **сортирование; 2.** (*сельскохозяйственная машина*) сартыроўка
сортировщик — сартава́льнік
сортировщица — сартава́льніца
сорубежный — сумéжны, парубéжны, пагранíчны
сосальце — *бот.* (*haustoria*) сысок б. т.
сосальщики — *зоол.* (*Trematoda*) сыса́льнікі з. т., сысуны́, смактуны́
сосание — ссáньне, сыса́ньне, смакта́ньне
сосать — ссаць, смакта́ць, цмокаць, сýсьліць
сосватывать / сосватать — сасва́тваць / сасва́таць
сосед — сусéд
соседка — сусéдка
соседний — сусéдні, сумéжны
соседский — сусéдзкі, сусéдаў
соседство — сусéдзтва
соседушко — сусéдка
сосёнка — хваíнка, сасонка
сосец — *бот.* сысок, цы́цачка
сосиска — каўба́ска
соска — сусолка
соскабливание — саскраба́ньне
соскабливать / соскоблить — саскраба́ць / саскрэбці, саскабліць
соскакивание — *см.* **спрыгивание**
соскакивать — *см.* **спрыгивать**
соскальзывать / соскользнуть — сасьлíзваць, сасьлізáць / сасьлізнýць; сасклізáць / сасклізнýць
соскобленный — саскробаны, саскоблены
соскоблить — *см.* **соскабливать**
сосковатый — пупышкава́ты, бародаўчаты
сосковый — сысковы, пýпышкавы
соскочить — *см.* **спрыгнуть**
соскрёбывать — *см.* **соскабливать**
соскучиваться / соскучиться — нýдзіцца / занýдзіцца; маркоціцца / замаркоціцца
сослагательный: сослагательное наклонение — *грам.* умоўны лад
сослание — сасла́ньне
сослать — *см.* **ссылать**
сословие — стан
высшее сословие — найвышэйшы стан
низшее сословие — найніжэйшы стан
сословность — ста́навасьць гр. т.
сослуживец — тава́рыш па слýжбе
сослуживица — тава́рышка па слýжбе
сослужить: сослужить службу — паслужы́ць, прыслужы́ць, зрабíць паслýгу, ста́цца ў прыгодзе
сосна — *бот.* (*Pinus silvestris L.*) хвоя, сасна́
соснина — хваíна, сасьніна
сосновка — *зоол.* (*Fringilla coccothraustes*) сасноўка
сосновый — хваёвы, сасновы
сосновый лес — хвайня́к, бор
соснуть — пераспáць, кры́ху паспáць
сосок — сысок, пýпышка, музок В. Ласт.
сосредоточение, сосредоточивание — згрупава́ньне, сабра́ньне, збор
сосредоточенный — згрупава́ны, сабра́ны
сосредоточивать / сосредоточить — групава́ць / згрупава́ць; грамадзíць, згрумаджáць; гуртава́ць / згуртава́ць; зьбіра́ць / сабра́ць (*капітáл, дýмкі*)
состав — склад, укла́д; *хим.* зьмест; *мед.* зéльле, мешаніна
наличный состав — (*в административном см.*) дзéйны (ная́ўны) склад
составитель — уклада́льнік, склада́льнік, áўтар
составительница — уклада́льніца, склада́льніца, áўтарка
составление — уклада́ньне, склада́ньне, апрацава́ньне
составлять — (*что*) (*являться, давать в результате*) зьяўля́ць, станавíць, быць, дава́ць, вытвара́ць; (*из частей что-л.*) штукава́ць

С

поступок этот не составляет преступления — у гэтым учы́нку нямá злачы́нства

богатство не составляет счастья — у багáцьці нямá шчáсьця

это составляет сто рублей — гэта даé сто рублёў

это для меня ничего не составляет — гэта для мяне́ нічога ня вáрта

составлять / составить — **1.** (*с чего*) састаўля́ць / састáвіць; ссоўваць / ссу́нуць; **2.** (*из чего*) складáць / склáсьці; укладáць / уклáсьці, улажы́ць (*слоўнік*); рабíць / зрабíць (*лякáрства*); штукавáць / саштукавáць

составляющий: составляющие силы — *физ.* складáльныя сíлы

составной — складны́, складáны

состаревшийся, состарившийся — пастарэлы, сапсéлы, згрыбéлы

состаревшийся гриб — пясьля́к

состариться, состариться — пастарэць, састарэць, састарэцца, сапсéць, згрыбéць

состарить — састаравáць В. кр. сл.

состояние — **1.** стан, становішча; **2.** маёмасьць, дабро; (*о скоте*) худоба, стáтак

быть в состоянии — здолець, здýжаць, магчы́

люди разного состояния — лю́дзі рознага стáну

нажить себе состояние — прыдбáць дабро

состояньице — маёнтачак

состоятельность — заможнасьць

состоятельный — (*человек*) заможны, грашавíты

состоять — (*из чего*) складáцца (*з чаго*); (*где*) быць, знаходзіцца

состояться — адбы́цца, стáцца, споўніцца

острагивать /острогать — састрýтваць / састругáць

сострадалец — спачувáльнік, жáласьлíвец

сострадалица — спачувáльніца, жáласьлíвіца

сострадание — спачуваньне, жаль, лíтасьць, міласэрдзе, жалкаваньне

сострадательно — спачувáльна, жáласьлíва, лíтасна, міласэрна, чýла, жалкýючы

сострадательность — жáласьлívасьць, лíтасьць, міласэрнасьць, чýласьць

сострадательный — спачувáльны, спагáдлівы, жáласьлívы (*тон*); лíтасны, міласэрны, чýлы (*чалавéк*)

сострадать — спачуваць, спагадáць, жалкаваць, мець жаль

состраивать / состроить — будавáць / збудавáць; пастáвіць

состригать / состричь — састрыгáць / састры́гчы

состряпывать / состряпать — гатавáць / згатавáць; майстравáць / змайстравáць

соступать / соступить — саступáць / саступíць; (*вбок с дороги*) збочваць / збочыць

состязание — спаборніцтва, сýпарства, выпярэдніцтва; спрэчка

состязатель — сýпар, спаборнік, выпярэднік; спрэчнік

состязательница — сýпарніца, спаборніца, выпярэдніца; спрэчніца

состязательный — сýпарніцкі, спаборніцкі; спрэчны

состязаться — сýпарнічаць, змагáцца; спрачáцца, сьпірáцца

сосуд — судзíна, пасýдзіна, начы́ньне

сосудец — судзíнка

сосудисто-волокнистый — *бот.* судзíнкававалакня́ны Б. т.

сосудистый — судзíнкавы

сосулька — сусóлка, сопель, сýсла; (*ледяная*) лядзéнь, лядзя́к, бірýлька

сосун — сысýн, сýсьлік

сосуществование — існавáньне (*з кім*), суіснавáньне

сосуществовать — існавáць (*з кім*), суіснавáць

сосцевидный — пупышкавáты, цыцкавáты, сыскавáты

сосцы — цы́цкі

сосчитывание — зьлíчваньне, вылíчэньне, вырахавáньне

сосчитывать / сосчитать — лічы́ць, зьлíчваць / зьлічы́ць, вы́лічыць; рахавáць / зрахавáць, вы́рахаваць

сотворение — стварэньне

сотворить — ствары́ць

сотенный — соткавы, сотны

сотерн — (*вино*) сатэрн

сотка — сотка

соткать — вы́ткаць, саткáць

сотник — сотнік

сотня — сотня, сотка

сотоварищ — сутавáрыш, хаўрýсьнік, пры́яцель

сотоварищеский — сутавары́скі, сяброўскі

сотоварищество — сутавары́ства, таварыскасьць, сяброўства; хаўрýс

С

сотовариществовать — сутаварышава́ць, сябрава́ць, калегава́ць
сотрудник — супрацоўнік, папле́чнік
сотрудница — супрацоўніца, папле́чніца
сотрудничать — супрацоўнічаць, працава́ць ра́зам (супольна) (*з кім*)
сотрясатель — страса́льнік, узруша́льнік
сотрясательный — страса́льны, узруша́льны
сотрясать — трэсьці, страса́ць, узруша́ць (*ср.* **колебать**)
сотрясение — страсе́ньне, узру́хі, здрыг
сотский — соцкі
соты — соты
сотый — соты, сотны
соумышленник — супольнік (*злачы́нства*), аднамы́сьнік
соумышленница — супольніца (*злачы́нства*), аднамы́сьніца
соумышлять / соумыслить — разам (супольна) (*з кім*) нава́жвацца / нава́жыцца (*на што*)
соус — падлі́ва, падлі́ўка
соусник — падлі́ўнік
соусный — падлі́ўны
соучаствовать — мець (браць) удзе́л (ра́зам) (*з кім*); быць удзе́льнікам (*у чым*)
соучастие — удзе́л, удзе́льніцтва
соучастник — удзе́льнік, супольнік, дольнік
соучастница — удзе́льніца, супольніца
соучастный — супольны
соученик — школьны тава́рыш, кале́га
софа — кана́па
софизм — сафі́зм
софист — сафі́сты
софистика — сафі́стыка
софистический — сафісты́чны
София, Софья — *и. соб.* Зося
Софроний — *и. соб.* Сапрон
соха — саха́
сохатый — *зоол.* (*Cervus alces*) *см.* **лось**
сохнуть — сохнуць, сохці, чаўрэць, сма́гнуць (*на сонцы*), пятрэць; марне́ць
сохранение — захава́ньне, заховы, сховы, уховы, схованка
сохранно — захава́на, сукры́та, цэла
сохранность — захава́насьць, цэласьць
сохранный — захава́ны, сукры́ты, цэлы
сохранять / сохранить — захоўваць / захава́ць; хава́ць / схава́ць; ухоўваць / ухава́ць; крыць / сукры́ць; сьцерагчы́ / усьцерагчы́
сохрани боже! — крый божа!, барані́ божа!, хай бог бароніць!
соцветие — *бот.* сукве́цьце б. т.
социал-демократический: социал-демократическая партия — сацыял-дэмакраты́чная па́ртыя
социализм — сацыялі́зм
социалист — сацыялі́сты
социалистический — сацыялісты́чны
социалистка — сацыялі́стка
социальный — сацыя́льны
социолог — сацыялёг
социологический — сацыялягі́чны, грамадазна́ўчы
социология — сацыялёгія, грамадазна́ўства
сочевица — сачы́ўка
сочевичник — *бот.* (*Orobus L.*) зьвярэц б. т.
сочельник — (*рождественский*) бага́тая куцьця́; (*крещенский*) галодная куцьця́
сочение — (*сока*) сачэньне
сочетаемый — спалуча́льны
сочетаемые браком — малады́я
сочетание — спалучэньне, злучэньне, зьвя́зак, су́вязь; (*браком*) пабра́ньне
сочетать — спалуча́ць / спалучы́ць; злуча́ць / злучы́ць; зьвяза́ць
сочетать браком — пашлюбава́ць
сочетаться браком — пабра́цца, узя́ць шлюб
сочинение — твор, пра́ца; склада́ньне, уклада́ньне
сочинитель — а́ўтар, пісьме́ньнік, уклада́льнік
сочинительница — а́ўтарка, пісьме́ньніца, уклада́льніца
сочинять / сочинить — тварыць / стварыць; уклада́ць / укла́сьці; склада́ць / скла́сьці; вымышля́ць / вы́мысьліць
сочить — цадзі́ць, тачы́ць
сочиться — сачы́цца, выцяка́ць, вылі́ва́цца, тачы́цца
сочлен — сучле́н
сочленение — сучляне́ньне
сочленовный — сучляно́ўны
сочно — сочна, сакаві́та, сачы́ста
сочность — сакаві́тасьць, сочнасьць
сочный — сакаві́ты, сакавы́, сочны, сачы́сты
сочтённый — зьлі́чаны
сочувственно — спачува́льна, спага́дліва, спага́дна, чу́ла
сочувственный — спачува́льны, спага́длівы, спага́дны

сочувствие — спачува́ньне, спачуцьцё (спачу́цьце), спага́да, спрыя́ньне
сочувствовать — спачува́ць, спагада́ць, спрыя́ць
сочувствующий — спачува́льны, спага́длівы; *сущ.* спачува́льнік
сошествие — сход
сошка — сошка, падпорка
сошник — сашні́к, нарог, лямéш
сощипывать / сощипать — сашчы́пваць / сашчыпа́ць; саскуба́ць / саску́бці (саску́бсьці); адшчы́кваць / адшчы́каць
союз — саю́з, хаўру́с, суполка; *грам.* злу́чнік
союз брачный — шлюб
Союз Советских Социалистических Республик (СССР) — Саю́з Савéцкіх Сацыялісты́чных Рэспу́блік (СССР)
союзник — саю́зьнік, хаўру́сьнік
союзница — саю́зьніца, хаўру́сьніца
союзнический — саю́зьніцкі, хаўру́сьніцкі
союзный — саю́зны, хаўру́сны
соя — *зоол.* (*Corvus glandarius*) сойка
спавший — спа́лы
спадание — спад, спада́ньне
спадать / спасть — спада́ць / спа́сьці; зва́льваццa / звалі́цца; зьмяншáцца / зьмéншыцца
спасть с лица — змарнéць, схуднéць
спадение — спада́ньне, зьмяншэ́ньне
спазм — спа́зма
спазмы — корчы
спаивание — **1.** зьлітава́ньне, зьнітава́ньне; **2.** спойваньне
спаивать / спаять — літава́ць / зьлітава́ць; нітава́ць / зьнітава́ць
спаивать / споить — спойваць / спаіць
спайка — **1.** літ, зьлітава́ньне, зьнітава́ньне; **2.** злу́ка / злу́чнасьць, згода; **3.** *бот.* зьвя́зка, злу́чка б. т.
спайность — луплі́васьць г.-м. т.
спайный — луплі́вы
